Таварыства беларускай школы

# Горад Святога Губерта



Краязнаўчы альманах
Выпуск V

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2011

pawet.net

63.3 (4Беи)
Г73

Рэдкалегія:
Алесь Смалянчук, доктар гіст. навук (Горадня) – рэдактар,
Андрэй Вашкевіч (Горадня), намеснік рэдактара,
Алесь Краўцэвіч, доктар гіст. навук (Горадня),
Андрэй Чарнякевіч, кандыдат гіст. навук (Горадня),
Ян Ежы Мілеўскі, PhD (Беласток),
Рімантас Мікніс, PhD (Вільня)

*У афармленні вокладкі выкарыстаны эскіз ветраніка працы Юрася Мацко (Горадня)*

**Горад святога Губерта** : краязнаўчы альманах. Выпуск V. / Пад рэд.
Г67 А. Смаленчука і А. Вашкевіча. – Мінск : Зміцер Колас, 2011. 116 с. : іл.
ISBN 978-985-6992-09-7

Чарговы выпуск альманаха працягвае тэму «рэканструкцыі» гістарычнай Горадні, якая ператвараецца ў вынішчэнне адметнасці горада. Большасць матэрыялаў прысвечаныя праблеме «аднаўлення» Барысаглебскай (Каложскай) царквы XII ст. Выпуск скадаецца з дакументальных і аналітычных матэрыялаў, фотаздымкаў.

**УДК 947.6<15–20**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-6992-09-7**
© Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2011

pawet.net

Чарговы выпуск альманаха «Горад святога Губерта» цалкам прысвечаны праблемам «рэканструкцыі» гістарычнага цэнтра Горадні. На нашых вачах яна ператвараецца ў адміністратыўную кампанію вынішчэння таго своеасаблівага «духу горада», якім заўсёды ганарыліся яго жыхары, і які вабіў гасцей і турыстаў.

Старадаўняя Горадня з яе Каралеўскімі замкамі, Барысаглебскай (Каложскай) царквой на крутым беразе Нёмана, Фарным (паезуіцкім) касцёлам, помнікамі Гарадніцы і Новага свету – усё яшчэ застаецца ўнікальным горадам для Беларусі. Але сёння мы часцей гаворым пра рэшткі гэтай адметнасці…

І ў гэтых стратах не прыходзіцца вінаваціць «чужаземных захопнікаў» або нейкі прыродны катаклізм. Калі, зразумела, не лічыць такавым менталітэт гарадзенскіх чыноўнікаў і абласканай імі часткі мясцовай «тожэ інтэлігенцыі»...

У мінулым годзе «рэканструктары» падабраліся да Каложы. Не чакаючы вынікаў археалагічных раскопак вакол царквы і даследавання геалагічнага стану самога Каложскага плато, яны ўжо распрацавалі асновы будаўнічага праекту (архітэктар Генадзь Лаўрэцкі). Ізноў, як павялося ў горадзе над Нёманам з часоў старшыні Саўчанкі, сапраўднае абмеркаванне праекту і планаў, фактычна, адсутнічала. Між тым жыхары гораду МАЮЦЬ ПРАВА задаваць пытанні тым, хто бярэ на сябе адказнасць за будучыню Храма.

Лёс Храма – гэта цэлая эпоха беларускай мінуўшчыны, якая ўвабрала ў сябе пачаткі хрысціянства, майстэрства мясцовых дойлідаў, разбурэнні ваенных часоў, перабудовы з слядамі самых розных архітэктурных стыляў… Каложа – гэта сапраўдная энцыклапедыя гісторыі і культуры, якую мы пакуль не здольныя прачытаць. І гэты шанс мы можам страціць назаўсёды…

Але Каложскі храм – гэта не толькі гісторыя, гэта таксама сучаснасць гораду. Узнятая ўладамі праблема «рэканструкцыі» царквы

і стаўленне да яе гарадзенцаў значна больш гаворыць пра горад і яго сённяшніх жыхароў, чым уся статыстыка на афіцыйных сайтах. Нашая згода (нават маўклівая!) на правядзенне працаў, якія пагражаюць Храму, – гэта пагроза храму ў нашай душы, гэта яшчэ адзін вялікі крок нашага вяртання ў страх і духоўнае рабства…

Пра гэта думалася падчас першых грамадскіх слуханняў «Рэканструкцыя Барысаглебскай (Каложскай) царквы: за ці супраць?» (23 верасня 2010 г., арганізатар Таварыства беларускай школы). Слуханні сабралі вядомых у Беларусі спецыялістаў у галіне гісторыі архітэктуры, археалогіі, аховы помнікаў, якія давалі ацэнку праекту Г.Лаўрэцкага, казалі пра праблемы яго рэалізацыі і адказвалі на пытанні зацікаленых гарадзенцаў. На жаль, «адказныя чыноўнікі» і прадстаўнікі Інстытута «Гроднаграмадзянпраект» (дырэктар Уладзімір Дзяшко) сярод удзельнікаў Слуханняў не былі заўважаныя…

Па вынікам Слуханняў можна было б паўтарыць словы Мітрапаліта Літоўскага Іосіфа (1889): «Умели наши предки строить домы Божия, да не умели потомки сохранить их».

Альманах пазнаёміць вас з меркаваннямі экспертаў і дапаможа больш глыбока зразумець не толькі праблему Каложы, але таксама лёс усёй гістарычнай Горадні ў перыяд «рэканструкцыі». У прыватнасці, чытач убачыць фотаздымкі будынкаў, знішчаных пасля 2008 г. Таксама публікуюцца матэрыялы, прысвечаныя рэнавацыі і выкарыстанню вядомых гістарычных мясцовасцяў горада «Новы свет» і «Гараднiца», лёсу вайсковай казармы пачатку XX ст. (ул. Перамогі), стану дрэваў каштоўных гатункаў…

Горадня – наш агульны дом, і нельга дапускаць яго разбурэння!

Грамадская актыўнасць і неабыякавасць гарадзенцаў яшчэ можа спыніць той чыноўны і будаўнічы «беспредел», што адбываецца на нашых вачах. Урэшце, кожны гарадзенец піша гісторыю свайго гораду, у тым ліку і Ты…

*Алесь Смалянчук*

# ХРАМ І ЛЮДЗІ

## Першыя грамадскія слуханні «Рэканструкцыя Каложы: за ці супраць?»

23 верасня 2010 г.

Летам мінулага года ў рэгіянальных сродках масавай інфармацыі раптоўна актуалізавалася праблема рэканструкцыі (рэстаўрацыі, аднаўлення) Каложскай Барысаглебскай царквы XII ст. Гродзенскі аблвыканкам распачаў кампанію «Адновім Каложу разам» (гл. http://region.grodno.by/ru/oblast/dostoprim/kolozza). Пры гэтым, як павялося ў Гродне, ніякіх кансультацый чыноўнікаў з вядомымі спецыялістамі па-за сценамі гродзенскага Інстытута «Грамадзянпраект» і тым больш з прадстаўнікамі грамадскасці не праводзілася. Усё падмянілі сцвярджэннем нібыта 83 % гарадзенцаў падтрымліваюць ідэю рэканструкцыі храма.

Між тым гэтая ідэя патрабуе асэнсавання і абмеркавання. Гэта разумеюць нават многія прыхільнікі аднаўленчых працаў на Каложскай гары. Сярод мастацтвазнаўцаў, археолагаў і архітэктараў пашыраная думка, што мы яшчэ занадта мала ведаем пра Каложу, першапачатковы знешні выгляд храма, стылістыку яго пабудовы і стан Каложскай гары, каб прыймаць рашэнні аб «рэканструкцыі» гэтага каштоўнага помніка, сімвала нашага горада. Многія апасаюцца, што гэтыя рашэнні могуць аказацца фатальнымі для храма.

І гэты страх мае падставы. Дастаткова прыглядзецца да вынікаў той чыноўніцкай «рэканструкцыі» гістарычнага цэнтра нашага горада, якія больш нагадваюць саматужны «еўрарамонт». Разам з будынкамі мінулай эпохі, якія не аднаўляюцца, а руйнуюцца або замяняюцца псеўдагістарычнымі «новаделамі» з газасілікатных блокаў[1], горад страчвае частку сваёй унікальнасці, якая заўсёды адрознівала яго ад іншых гарадоў краіны.

Менавіта таму Таварыства беларускай школы разам з прадстаўнікамі гродзенскай грамадскасці арганізавала Першыя гра-

pawet.net

мадскія слуханні па праблеме «рэканструкцыі» Каложы. Яны прайшлі 23 верасня 2010 г. У Слуханнях прынялі ўдзел больш за 100 жыхароў нашага горада, у т. л. архітэктары і прадпрымальнікі, студэнцкая моладзь і школьнікі, вернікі прыхода Барысаглебскай царквы і настаўнікі ды інш. На жаль, адсутнічалі запрошаныя арганізатарамі прадстаўнікі Гродзенскага аблвыканкаму і Гродзенскай епархіі…

У якасці экспертаў выступілі:

**Вадзім Глінік** – вядомы спецыяліст па рэстаўрацыі, даследчык Каложскай царквы, а зараз навуковы кіраўнік аб'екта «Гістарычны цэнтр г. Полацка»;

**Генадзь Лаўрэцкі** – архітэктар і мастацтвазнаўца, аўтар і навуковы кіраўнік праекта рэканструкцыі Каложскай царквы, кіраўнік Архітэктурна-мастацкай рады Беларускага экзархату;

**Ірына Лаўроўская** – доктар мастацтвазнаўства ў галіне ўрбаністыкі і архітэктуры, даследчыца гісторыі і архітэктуры Брэста;

**Аляксандр Краўцэвіч** – доктар гістарычных навук, удзельнік археалагічных раскопак Каложскай царквы;

**Вячаслаў Чарнатаў** – кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры горадабудаўніцтва архітэктурнага факультэта БНТУ;

**Ігар Трусаў** – гісторык архітэктуры.

На жаль, па розных прычынах не атрымалася прыняць удзел у Слуханнях доктару архітэктуры, прафесару кафедры горадабудаўніцтва БНТУ **Армэну Сардараву**, падтрымка якога вельмі паспрыяла такому прадстаўнічаму складу экспертаў, і кандыдату гістарычных навук, дацэнту кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага універсітэту культуры **Алегу Трусаву**. Яны даслалі свае меркаванні ў пісьмовым выглядзе (гл. Дадатак).

Вёў дыскусію гісторык Андрэй Вашкевіч.

Па вынікам Слуханняў прадстаўнікі групы экспертаў і Арганізацыйнага камітэту з улікам выказаных меркаванняў падрыхтавалі ліст да міністра культуры сп. Паўла Латушкі і начальніка Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры сп. Ігара Чарняўскага (гл. Дадатак).

Увазе чытачоў «Горада святога Губерта» прапануюцца меркаванні экспертаў, якія друкуюцца на падставе аўдыёзапісу, што захоўваецца ў арганізатараў Слуханняў[2].

**Андрэй Вашкевіч:**

Што такое Каложа для нас гарадзенцаў? Гэта не проста другі па старажытнасці храм беларускага дойлідства і не проста помнік архітэктуры… Каложа – гэта своеасаблівы духоўны абсалют нашага горада, гэта сімвал, гэта мера нашых жыццёвых здарэнняў, усяго таго, што з намі адбываецца. Каложа – гэта Гародня…

Ад пачатку цяперашняй фазы рэканструкцыі гістарычнага цэнтра горада, г.зн. з 2005–2006 гг., вядзецца абмеркаванне планаў, звязаных з яе рэканструкцыяй (рэстаўрацыяй). Летам гэтага года справа аднаўлення Каложы выйшла на новы ўзровень. Гарадзенскія ўлады ініцыявалі кампанію «Адновім Каложу разам!» Нават пачаўся збор грошай... Кампанія набыла грамадскае гучанне.

Пры гэтым навуковы і практычны бакі «аднаўлення» Каложы асвятляюцца недастаткова, не ў поўным аб’ёме. У гарадзенцаў дагэтуль не было магчымасці сустрэцца з аўтарам праекта аднаўлення Каложы, а таксама з вядомымі спецыялістамі ў галіне архітэктуры, археалогіі і гісторыі, якія маюць уласны, канкрэтны і абгрунтаваны погляд на справу.

Мэта сённяшняй сустрэчы – даць магчымасць гарадзенцам выслухаць як аўтара праекту, так і экспертаў і задаць пытанні, якія даўно хвалююць жыхароў нашага горада.

**Генадзь Лаўрэцкі:**

Справа Каложы пачалася даўно. Калі храм належаў Музею атэізму і гісторыі рэлігіі, тут грунтоўна працаваў архітэктар Валеры Слюнчанка... Пазней, калі храм аддалі вернікам, у падыходах да рэстаўрацыі многае змянілася.

Я займаюся гэтым помнікам гадоў трыццаць. І вельмі ўдзячны прысутнаму тут Вадзіму Глінніку і нябожчыку Валеры Слюнчанку за тое, што у свой час вельмі грунтоўна пазнаёмілі мяне з Каложай. Методыка маёй працы наступная – спачатку максімальна

захоўваем тое, што засталося ад Каложскага храма. Потым працуем з астатнім, каб у канчатковым варыянце з распрацаваным праектам пагадзіўся б кожны архітэктар[3].



Абмерны малюнак паўночнай сцяны 1850-я гг.



Адноўленая паўднёвая сцяна Каложы паводле праекту Г. Лаўрэцкага.



Г. Лаўрэцкі (© Фота Хрысціны Марчук).

На першым этапе працы над храмам з намі супрацоўнічалі французскія спецыялісты, якія казалі, што будуць дапамагаць нам, паколькі Каложа гэта вельмі значная з'ява ў гісторыі ўсёй Еўропы. Мы адначасна распрацоўвалі два праекты. Яны – з свайго боку, а мы – з свайго. Пасля была сустрэча з імі.. Дарэчы, нам вельмі дапамог Аляксандр Мілінкевіч, які быў выдатным перакладчыкам і наогул дарадцам. Наш праект французам спадабаўся… Адзіная іх заўвага датычыла адбудовы страчанай у XIX ст.часткі храма. Французскія калегі прапанавалі рабіць яе з дрэва...

Наогул было распрацавана каля васьмі варыянтаў рэканструкцыі храма. Напрыклад, варыянт поўнага аднаўлення Каложы з вялікім цагляным барабанам зверху і сцяной з плінфы з боку Нёмана знайшоў вельмі цёплы прыём у асяроддзі нашай праваслаўнай царквы. Але я выступіў супраць, бо быў упэўнены, што так рабіць нельга. Гэта азначала б нейкую ўяўную рэстаўрацыю царквы… Да таго ж гэта было небяспечна для захавання аўтэнтычных частак.

Адразу ж была выказаная прапанова аднаўляць паводле абмерных малюнкаў пачатку 1850-х гг., без барабана. Аднак на паўночным і паўднёвым баках мы бачым вельмі шмат розных стылістычных напластаванняў. Гэта і готыка, і барока, а ў інтэр'еры царквы збольшага зберагліся канструкцыі XII ст. І таму, калі аднаўляць храм, арыентуючыся на XIX ст., так як на абмерных малюнках, то мы павінны скласці сцяну з плінфы, потым зрабіць у ёй ўстаўкі з цэглы вялікага памеру, як мы сёння бачым на паўночным фасадзе, і толькі потым прабіваць вокны. Зразумела, што пры гэтым нельга казаць пра нейкую «дакументальную» рэстаўрацыю. Атрымалася, што ні варыянт аднаўлення на XII ст., ні варыянт аднаўлення на XIX ст. не падыходзілі.

Мы вырашылі разбіць увесь працэс на два пласты. Першы пласт – рэстаўрацыя датычна ацалелай сцяны. Гэта у поўнай меры будзе навуковая метадычная рэстаўрацыя – расчыстка, узмацненне і… ўсё. Што тычыцца астатняга – гэта рэканструкцыя.

Вядома, што калі няма ніякіх дакументальных звестак, то рэстаўратару нельга арыентавацца ні на задуму аўтара, ні на нейкія прамежкавыя этапы яе рэалізацыі. Да нас дайшло каля 20 помнікаў

гэтага перыяду, ад большасці якіх засталіся толькі археалагічныя рэшткі. Захаваліся толькі два храмы – Спасаўская царква ў Полацку і Каложа. Калі б помнікаў таго часу захавалася болей, то можна было б рабіць больш-менш праўдападобнае, аналагічнае і падаваць помнік як нейкую аўтэнтычнасць…

Каложа – гэта сэрца Беларусі, яе сімвал. Гэтая царква жывая, у ёй праводзяцца набажэнствы. І таму мы прапанавалі зрабіць наступную рэканструкцыю. Новая частка, па нашай задуме, як бы футляр для старой, аўтэнтычнай часткі. Хочацца, каб гэты «новодел» гарманічна ўпісаўся ў храм. Але з іншага боку нельга дапускаць падман наведвальніка. Ён павінен адрозніваць «новодел» ад аўтэнтычнай часткі. Пры гэтым мы імкнемся, каб царква, гаворачы царкоўнай мовай, адчувалася «нераздельно и неслиянно». Заўважу напрыканцы, што канструктыўная стабільнасць храма – гэта самы важны момант у нашым праекце.

Што датычыць будаўнічых матэрыялаў, то яны ўжо замоўленыя ў Ваўкавыску. Маем нават іх узоры...

**Аляксандр Краўцэвіч**:

Хачу расказаць пра гэты помнік, бо ўдзельнічаў у археалагічных раскопках на тэрыторыі Барысаглебскай царквы, і акрамя таго ў свой час быў шчыльна звязаны з сістэмай рэстаўрацыі архітэктурных помнікаў Беларусі. Мы аб’ездзілі ўсю Беларусь і даследавалі падобныя помнікі менавіта дзеля таго, каб даць інфармацыю архітэктарам-рэстаўратарам. Да таго ж мне даводзілася назіраць, як гэтыя праекты рэстаўрацыі рэалізоўваліся ў Беларусі...

Сёння, калі будзе прынятае рашэнне пра «рэканструкцыю-рэстаўрацыю» храма, то няма патрэбы ў правядзенні спецыяльнага археалагічнага даследавання. Яно ўжо праведзенае. Асновы слупоў храма адкрытыя. У 1981 г. даследаваліся ўсе чатыры слупы, а ў 1983–1984 гг. даследаванні працягваліся. Раскапаныя апсіды… Яшчэ з часоў Юзафа Ядкоўскага вядома, як выглядае сцяна храма на ўсёй глыбіні. Патрэбныя толькі даследаванні сучаснага стану падмуркаў і асновы слупоў. Неабходна яшчэ раз паглядзець іх месцазнаходжанне. Без гэтага не абысціся…

Што рабіць Каложай? Я цалкам згодны, што да гэтага помніка трэба ставіцца вельмі далікатна, вельмі ўважліва. Нельга забываць, што такіх помнікаў у нас толькі два – Спасаўская царква ў Полацку і Барысаглебская ў Гародні. І вось тут у мяне ўзнікаюць вялікія сумненні ў мэтазгоднасці другой часткі канцэпцыі, прапанаванай аўтарам, а менавіта рэканструкцыі. Не выклікае сумненняў першая частка – рэстаўрацыя, а дакладней, кансервацыя таго, што ёсць. Прычыны майго сумнення, нават страху адносна задуманай рэканструкцыі дзве – навуковага і тэхнічнага плану.

Па-першае, ніхто не ведае, як выглядала завяршэнне царквы. Тое, што маем на малюнках, гэта толькі фрагменты сценаў. Што б не прыдумалі, як бы ні дапасоўвалі, як бы не ўзгаднялі з французскімі ці іншымі спецыялістамі ўсё роўна гэта будзе абсалютная фантазія. Кожны адукаваны чалавек гэта будзе ведаць. Гарадзенская архітэктурная школа, яскравым шэдэўрам якой з'яўляецца Барысаглебская царква, унікальная. Яна не мае аналагаў ва Усходняй Еўропе. Каложа – арыгінальны помнік. На гэтым сыходзяцца ўсе даследчыкі. І гэта толькі ўскладняе задачу.

Па-другое, 15 гадоў я ездзіў па аб'ектах, бачыў, як рэалізоўваюцца неблагія праекты. У 1970–1980-я гг. у нас сфарміраваліся прафесійна падрыхтаваныя кадры архітэктараў-рэстаўратараў. Зараз гэтыя структуры знішчаныя, спецыялістаў сабраць немагчыма. Рэстаўрацыйнымі праектамі сёння займаецца «Грамадзянпраект», а будаўнічымі работамі які-небудзь будаўнічы трэст. **Беларуская рэстаўрацыя, звычайна, палягае на тым, каб разбурыць і збудаваць макет з сілікатнай цэглы**. Безліч таму прыкладаў. Між тым яшчэ ў савецкія часы ў Літве выпускалася вялікапамерная або малапамерная цэгла спецыяльна для рэстаўрацыі. У нас яе не было ніколі. У 1990-я гг. я на свае вочы назіраў рэстаўрацыю Дабравешчанскай царквы ў Віцебску. Калоны там рабілі з сучаснай чырвонай цэглы з дзіркамі, краі аббівалі малаткамі. І з гэтых абрубкаў выкладалі калону, якую потым затынкоўвалі, каб трохі выраўняць. Гэта і ёсць «рэстаўрацыя па-беларуску». Яшчэ адзін яскравы прыклад – «рэстаўрацыя» Лідскага замка. У вежы замест лесвіцы XIV ст. стаіць лесвіца панельнага савецкага дома. Другую

замкавую вежу збудавалі за два тыдні. Спяшаліся паспець да свята дажынкаў.

Я вельмі апасаюся, што калі на парэштκі аўтэнтычных сценаў Каложы пакладуць цяжкія завяршэнні, то сцены могуць не вытрымаць. Царква асунецца, і тады не вытрымае бераг. А потым будаўнікі і чыноўнікі толькі рукамі развядуць і скажуць, што ніхто не вінаваты.

Мне здаецца, галоўная наша задача – не нашкодзіць, захаваць тое, што ёсць, найперш аўтэнтычны помнік. Гэтыя фрагменты сценаў, якія засталіся, робяць уражанне на кожнага турыста, на кожнага чалавека. Калі цяжка на душу, мы ідзем да Каложы. Гэты храм мае сваю аўру...

Урэшце можна ў Калажанскім парку збудаваць макет царквы паводле прапанаванага праекту з сучасных будаўнічых матэрыялаў, вытворчасць якіх наладжаная ў Беларусі. Саму Каложу варта толькі адрэстаўраваць і закансерваваць... Нельга рабіць рэканструкцыю помніка, калі мы не ведаем, як ён выглядаў. **Перакананы, што сёння галоўны прынцып у адносінах да Каложы – не нашкодзіць.** А тое, што нашая г. зв. рэстаўрацыя можа моцна нашкодзіць, у мяне няма сумніву.

**Ігар Трусаў:**

Я очень благодарен Геннадию Лаврецкому за то, что он искренне поделился своими наработками, объяснил, чего он хочет…

Но есть то, что мне не нравится. У нас перепутана методика реставрационных работ и консервации. Мы начинаем говорить о строительном проекте, когда ещё даже не завершены геологические и археологические исследования, а также работы по консервации.

Припоминаю, что в своё время я имел отношение к реализации проекта по укреплению берега возле Каложи. Тогда же говорили, что укрепление берега ничего не дало. Было решено продолжать геологические исследования…

Археологи Института истории Академии наук исследовали примерно 1/3 двора Борисоглебской церкви, а его нужно исследовать полностью. Я очень рад, что археолог Александр Медведев под-

твердил готовность начать раскопки в следующем году. Это очень важно для проведения консервации…

Также необходимо продумать возможные проблемы, связанные с состоянием оригинальной сцены XII в. Почему-то никто не поднимает вопрос о ее «физическом» состоянии. Но существуют ведь современные технологии… Необходимы гарантии, что эта стена на 99 % будет стоять, когда на неё начнут что-то устанавливать… Об этом нужно информировать общественность. А у нас всё пошло наперекос… «Гражданпроект» почему-то делает строительный проект и игнорирует этап консервации?!

И ещё одно следует учесть… В бюджете не очень много денег. Их, практически, нет. Из-за этого и началась дискуссия… Нет денег на оплату строительного проекта полностью, и их стали собирать с гродненцев. Но этот способ не решит проблемы! Финансирования не будет по крайне мере ещё полтора года. Это тоже аргумент в пользу соблюдения методики подобных работ. Следует начать с археологии, потом провести геологические исследования. Мы должны иметь гарантии, что ничего страшного с храмом не случится. Только после этого следует вернуться к предложенному проекту и обсудить его снова уже в детальном варианте, который подготовит «Гражданпроект» (если до этого дойдёт в условиях отсутствия финансирования).

**В первую очередь мы должны сохранить то, что осталось. Не навредить!**

**Вячаслаў Чарнатаў:**

Хачу адзначыць, што апошнім часам вельмі шмат прапануецца такога роду навацый, як з Каложай. А чаму б, напрыклад, Венеры Мілоскай не дарабіць рукі? Але ж ніхто ўсур'ёз такую прапанову не ўспрыме…

Гледзячы на эскізы праекта Генадзя Лаўрэцкага, разумею, што аўтар зрабіў каласальную працу. Але хачу сказаць, што Каложа нешта ўвесь час страчвае і на захаванне таго, што мы маем трэба звяртаць куды больш увагі, чым на аднаўленне страчанай сцяны.

Калі я прыязджаў раней, у дзяцінстве, як мне здаецца, было знач-

на больш крыжоў на сцяне. Зразумела, што аб'ект мусіць вельмі добра ахоўвацца...

Таксама трэба правесці хімічны аналіз і дабівацца вытворчасці блізкай да аўтэнтычнасці маёлікі і плінфы. Толькі такі матэрыял павінен быць выкарыстаны… Я б гэта аднёс да першасных працаў. Што тычыцца далейшай рэстаўрацыі, тут патрэбныя вялізныя даследаванні.

Апроч таго ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук мне казалі, што нягледзячы на ўмацаванне берага, грунт усё ж такі спаўзае. І наогул узровень нашай рэстаўрацыі… Усе ведаюць, што, калі пані Альжбета Радзівіл прыехала ў Нясвіж, ёй ледзь дрэнна не стала ад той рэстаўрацыі, якую ўбачыла. А калі вы прыедзеце ў Мір, то вам сапраўды стане дрэнна…

**У дадзеным выпадку не трэба спяшацца.**

І яшчэ хачу заўважыць, што каля гэтага ўнікальнага помніка цалкам адсутнічае сэрвіс, хоць, нягледзячы на гэта людзі ідуць да Каложы…

**Ірына Лаўроўская:**

…Калісьці ў свае школьныя гады я займалася спортам, вельмі актыўна, нават гуляла ў валейбол за зборную Беларусі. Дык вось у валейболе ёсць такі падманны прыём: адной рукой робіш замах, а другой – б'еш. У гэтым праекце, мне падаецца, ёсць таксама падман. Калі я прачытала інфармацыю на сайце Гарадзенскага аблвыканакаму, падрыхтаваную галоўным архітэктарам Інстытута «Грамадзянпраект» А. Б. Тараненка і галоўным архітэктарам праекту Н. С. Емельяненка, то, як урбаніст, звярнула ўвагу на наступны пункт:

«Институтом ведется поиск вариантов места для размещения приходского комплекса. Есть разрешение Министерства культуры Республики Беларусь на его строительство. Новый приходской комплекс включит в себя небольшую домовую церковь; крестильную, классы воскресной школы, киоск, библиотеку, мастерские, гараж, техпомещения. Решение этих вопросов позволит институту подойти к параллельному созданию строительного проекта реставрации

храма и приходского комплекса» (http://region.grodno.by/ru/oblast/dostoprim/kolozza).

Вось так, гаворачы пра шараговае па-сутнасці будаўніцтва прыходскага комплексу, падбіраюцца да нашай святыні, да Каложы. У сувязі з гэтым я сабе паставіла такое пытанне: **па якому праву людзі, якія з'яўляюцца ідэолагамі гэтага праекта, прыўлашчылі сабе нашу з вамі гісторыка-архітэктурную каштоўнасць?** Дарэчы, і не толькі нашу з вамі, а спадчыну нашых унукаў і праўнукаў.

Паводле Веніцыянскай хартыі да гісторыка-культурнай спадчыны трэба ставіцца з вялізарнай павагай, каб не дазволіць тым, хто прымае пэўныя законы, знішчыць тое, што нам не належала і не будзе належыць. Мы тут ненадоўга. І калі б гаворка ішла пра прамысловы, гаспадарчы ці які заўгодна іншы будынак, то я б, напэўна, не дазволіла сабе згадаць словы Фамы Аквінскага, які казаў пра маральнае права людзей нешта рабіць.

У гэтым праекце вельмі важным аспектам нашых размоў, ідэй і планаў мусіць быць якраз маральнае права. Мне як чалавеку, хрысціяніну, архітэктару, нарэшце, як жыхару Заходняй Беларусі падаецца, што мы не маем маральнага права знішчаць тое, што нам не належыць, нават, калі будзем кіравацца самымі добрымі намерамі. Вы ведаеце, куды вядзе дарога з найлепшымі намерамі…

**Думаю, што гэты падман, гэтую балючую тэму Каложы нам зараз укідваюць толькі дзеля таго, каб прыўлашчыць кавалак зямлі ў цэнтры Гародні!** І гэта баліць… Я ведаю, чым гэта скончыцца, бо ў нас не дзейнічае ні права, ні закон. Закон аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны не выконваецца! Калі б усе нашыя праекты з ім суадносіліся, то, напэўна, была б лепшая сітуацыя з гістарычнай спадчынай…

Сённяшняя наша сустрэча павінна скончыцца пытаннем да ідэолагаў гэтага праекта, якімі матывамі яны насамрэч кіруюцца? Ведаючы стан нашай рэстаўрацыі і ўзровень выканання заканадаўства ў галіне аховы спадчыны, яны працягваюць настойваць на неабходнасць рэканструяваць Каложу?! І няхай адкажуць нам шчыра, бо размова ідзе пра Храм, пра тое, што з'яўляецца калыскай нашай хрысціянскай веры. Гэта мне падаецца вельмі важным.

**Вадзім Глінік:**

Працуючы 30 гадоў у рэстаўрацыі, я яшчэ больш часу сябрую з аўтарам праекта Генадзем Лаўрэцкім. А нашая дыскусія адносна Каложы цягнецца амаль 20 гадоў. Яна ўсё больш міфалагізуецца і нагадвае спрэчкі Платона з Арыстоцелем, дзе я адыгрываю ролю матэрыяліста Арыстоцеля.

У чым сутнасць праблемы? На маю думку, мы маем у дадзеным выпадку дзве сістэмы вартасцяў, кожная з якіх мае права на існаванне ў сучасным свеце. Адна зыходзіць з таго, што ёсць ідэя храма і месца, дзе стаіць храм. І калі ёсць храм, то там павінна адбывацца набажэнства. Адсюль вынікае неабходнасць цэласнага аднаўлення ці рэстаўрацыі. Людзі, схільныя да такога мыслення, не разумеюць вартасці руінаў як носьбіта гістарычнай інфармацыі. Адсюль пастаяннае падсвядомае імкненне да цэласнасці і завершанасці… З майго ж пункту гледжання, тут ёсць пэўная падмена ідэі храма самім храмам.

Іншая пазіцыя, якую я больш 20 гадоў імкнуся адстойваць, гэта тое, што культурная спадчына ў сучасным свеце з'яўляецца матэрыяльнай. Яна складаецца з пэўных матэрыялаў. Кожны аб'ект створаны з малекул і атамаў – пэўных будаўнічых матэрыялаў, якія аднойчы змяшаліся ва ўнікальным раскладзе...

Культурныя рэсурсы, у адрозненні ад прыродных, належаць да неаднаўляльных. Страчаныя аднойчы, яны не могуць быць адноўленымі. І гэты момант вельмі істотны. Гаворачы пра ўсялякага роду спробы рэканструкцыі, мы павінны разумець, што гэта сучасныя практыкаванні ў архітэктуры і дызайне, але не тое, што было. У развітых грамадствах існуе піетэт перад сапраўднасцю і аўтэнтычнасцю помніка. Адпаведна ўвага прафесіяналаў эвалюцыянавала ад цэласных рэканструкцый (практыка XIX ст.) да сучасных метадаў захавання і кансервацыі таго, што дайшло да нас.

Паводле сучаснай дактрыны рэстаўрацыі, вяртанне да першапачатковага або да нейкага цэласнага выгляду не ёсць галоўная задача. У сучасным свеце гістарычны аб'ект трактуецца як інфармацыйная крыніца, як падстава для фундаментальных даследаванняў на-

шай культурнай гісторыі. І будучы інтэрпрэтаванай, яна часткова траціць гэтую інфарматыўнасць.

Калі гаворка ідзе аб такіх інфарматыўна насычаных крыніцах як Каложская царква, трэба дыскутаваць не аб тым, што побач прыбудаваць… Патрэбная размова пра тое, **якімі тэхналогіямі, з выкарыстаннем якіх найноўшых навуковых даследаванняў і дасягненняў нашай цывілізацыі мы зможам прадоўжыць існаванне Каложскай руіны ў часе!**

Што такое Каложа сёння? Гэта фрагмент колішняй царквы XII ст., пры чым фрагмент невялікі. Ад той першапачатковай царквы захавалася 20–25 % сцен, якія за амаль тысячу гадоў свайго існавання ў гісторыі, увабралі ў сябе розныя гістарычныя падзеі. Гэтыя культурныя сляды і напластаванні даволі значныя… Але прадстаўнікі супрацьлеглай пазіцыі не хочуць іх бачыць. Іх цікавіць толькі нейкі ідэальны храм або мадэль храма XII ст.

Напрыклад, вельмі важны і моцны гатычны пласт матэрыяльных сведчанняў XVI ст.Даследаванні сведчаць, што месца Каложы ў архітэктуры гэтага стагоддзя не менш значнае, чым месца ў гісторыі архітэктуры ранейшай эпохі. Гатызацыя праваслаўнай архітэктуры адбылася не на Полацкай зямлі, відавочна, што першай была Каложская царква. Усе скляпенні, якія сёння захаваліся, гэта XVI ст., фрэскі належаць да таго ж часу, прыблізна трацiна сучаснай Калажанскай руіны – гэта XVI ст. **І калі мы страцім фрагменты гатычнай Каложы, гэта будзе недаравальна!**

Яшчэ адзін вельмі важны пласт належыць гісторыі рэстаўрацыі. З Каложай працавалі лепшыя ў Расійскай імперыі рэстаўратары. Дыскусіі аб тым, як рэстаўраваць Каложу вядуцца з сярэдзіны XIX ст.Хачу адзначыць, што вельмі паслядоўную пазіцыю займалі тагачасныя праваслаўныя святары, якія адмовіліся ад цэласнай рэстаўрацыі, якую нам сёння прапаноўваюць. Каложа таксама звязана з гісторыяй станаўлення рэстаўрацыйнай справы ў міжваеннай Польшчы. У палякаў таксама была ідэя суцэльнага аднаўлення Каложы, пры чым ужо ў гатычным стылі. У віленскіх архівах гэты праект быццам нават захаваўся.

Праектаў рэстаўрацыі Каложы існуе з дзесятак, і усе яны розныя.

Гэта значыць, калі мы паставім задачу цэласнай рэстаўрацыі, мы вымушаны будзем выбраць рэканструкцыю аднаго з аўтараў. Аднак, паводле Венецыянскай хартыі як асноўнай дактрыны рэстаўратара, рэстаўрацыю належыць спыніць там, дзе пачынаецца гіпотэза. У дадзеным выпадку кожны навуковец мае права на сваю гіпотэзу, але якую з гэтых разнастайных варыяцый выбраць для рэальнага будаўніцтва? Кожны з іх гаворыць, што ён мае рацыю. Ці не знішчым мы магчымасць бясконцых інтэрпрэтацый для будучых пакаленняў навукоўцаў?

Каложа – гэта старажытны дакумент, які дайшоў да нашага часу і якому пагражаюць розныя негатыўныя фактары нашай рэчаіснасці. Трэба сканцэнтраваць намаганні не на ідэі абстрактнага цэльнага аднаўлення храма, а над тым, як нейтралізаваць гэтыя пагрозы.

Першая пагроза – гэта апоўзень. Ніхто нам сёння не даў гарантыі, што апоўзень спыніўся. Якое мы маем права нагружаць тысячы тон бетонных канструкцый на пагорак, які знаходзіцца пад пагрозай апоўзня? Пакуль у нас не будзе 100 % упэўненасці ў тым, што апоўзень нам не пагражае, туды нельга пускаць нават цяжкую тэхніку. Я не буду казаць пра якасць будаўнічых работ… 30 гадоў я звязаны з гэтай справай, і добра ведаю стан сучаснага будаўнічага рамяства, ведаю стан нашых трэстаў, і, самае галоўнае, ведаю сістэму арганізацыі будаўнічых работ.

У праектах такога кшталту гэта будуць «дажынкі» дзве тысячы нейкага года. Будзе пастаўленая задача закончыць будаўнічы сезон, напрыклад, да 1 мая. Не будзе спакойнай працы, праверак, не будзе часу, паколькі будзе вызначаная дата заканчэння... І гэта не іронія, паверце. Гэта… Плакаць хочацца ад гэтай рэальнасці. І, калі будзе пастаўлена цяжкая тэхніка і будзе выдаткаваны бюджэт, мы не зможам нічога зрабіць. Можаце з’ездзіць паглядзець на рэстаўрацыю Лідскага замка. Тры дзесяцігоддзя таму, калі мы былі рэстаўратарамі-рамантыкамі, нам не магло прысніцца нават у страшным сне, што кубаметры цэглы кладуцца ў дзень на старажытнейшы помнік невядома кім і невядома з якога матэрыялу без усялякага дагляду. І ўсё гэта толькі таму, што заўтра трэба «лентачку рэзаць». Тое самае будзе і тут, бо на ўсіх аб’ектах адно і тое ж.




Адноўленая сцяна ў разрэзе (фрагмент праекту Г. Лаўрэцкага)

Планаваць захаванне Калажанскай царквы без уліку гэтай рэчаіснасці, на маю думку, нельга. Прывяду яшчэ адзін прыклад. Аўтарам праекту таксама з'яўляўся Генадзь Лаўрэцкі, і ім была выкананая вялікая навукова-даследчая праца. Гэта Дабравешчанская царква ў Віцебску, якая была ўзарвана, здаецца, у 1961 г. з ініцыятывы Пятра Машэрава. Захавалася шмат аўтэнтычных руінаў... Пазней была зроблена акадэмічная кансервацыя, адвезены павярхоўныя воды.

Для спецыяліста дастаткова руінаў, а вось для спажыўца культурнай спадчыны гэтага мала, таму мы вымушаны ісці на фрагментарную рэстаўрацыю, каб зрабіць гэты аб'ект больш зразумелым, каб яго сэнс быў даступны не толькі нам. І пачалося аднаўленне Дабравешчанскай царквы… Была пастаўлена, на маю думку, некарэктная задача, а менавіта аднавіць храм. Але не прадугледзелі, што падмуркі, якія доўга праляжалі ў зямлі без нагрузкі, страцілі сваю здольнасць несці цяжар сцен. А ўжо трэба было здаваць аб'ект! Тады аўтэнтычныя падмуркі былі выкінутыя (!?) З пункту гледжання звычайнага будаўніка зрабілі правільна. Ніякі здаровы на галаву інжынер не падпішацца пад справаздачай аб выкананні працаў на такіх падмурках. Ён разумее, калі паставіць зверху новы аб'ект, то ўсё рухне. Хто будзе ў турме сядзець? Той, хто падпісаў. Таму ён піша: «Знесці». Але ж гэта катастрофа з пункту гледжання захавання арыгінала. Тады значная частка аўтэнтычнага помніка была знішчана, і захаваўся толькі фрагмент.

Я быў там гэтай зімою. Ацяпленне, дыханне людзей, знічы... Змяніўся паветраны рэжым, з'явілася вільгаць, якая выпадае ў якасці расы. А ў нашай краіне вельмі многа дзён, калі тэмпература трымаецца каля 0 па Цэльсію. На працягу сутак ва ўсе гэтыя порыстыя матэрыялы заходзіць вільгаць і замярзае там. Што адбываецца з вадой, якая замярзае? Яна расшыраецца, яна разрывае ўсё. Дык вось аўтэнтычная частка храма была ўся абледзянелая. А чаму такое не павінна адбыцца ў Каложы, калі там паднімуць тэмпературу да запланаваных 12 градусаў вышэй нуля зімой і летам?

Калі гавораць пра аднаўленне, то задача захавання падмяняецца задачай рэканструкцыі. І **мы забываем пра галоўнае – захаваць аўтэнтычнасць.** Галоўным становіцца ўзвядзенне новага будынка...

Калі вернікам не хапае памяшкання, і гэтае месца, сапраўды, важнае для гісторыі праваслаўнай культуры, то давайце пабудуем новы Каложскі манастыр побач. Давайце выкарыстаем нашыя сучасныя веды, зробім усё, як хоча праваслаўная супольнасць, але

не будзем выклікаць сілы, якія могуць прывесці да разбурэння, да страты таго, што сёння яшчэ жывое.

Я не за тое, каб закрыць Каложскую царкву. Мне толькі здаецца, што трэба зменшыць нагрузку па выкарыстанню Каложскай руіны. Нармальна рэгламентаваць спажыванне рэчы, якая з'яўляецца надзвычай каштоўнай. Мне здаецца, што пабудова новай царквы і перанясенні на яе асноўнай нагрузкі, дазволіць захаваць Калажанскую царкву як праваслаўны храм, які будзе адкрывацца на асноўныя святы.

Хачу таксама абараніць Генадзя Лаўрэцкага. Справа ў тым, што праблема не ў ім і не ў тым аўтарскім праекце, які ён робіць паслядоўна і абгрунтавана. Праблема ў тым, што на сённяшні момант нельга пачынаць працы па рэканструкцыі Каложы. Мы не гатовы да гэтага як грамадства. Недастатковыя інфраструктура будаўніцтва, сістэма арганізацыі будаўнічай працы, адукацыя нашых праекціроўшчыкаў, неадпрацаваныя ўзаемасувязі, існуюць пэўныя нестыкоўкі ў заканадаўстве. Усё гэта прывядзе да таго, што левая рука не будзе ведаць, што робіць правая. Будзе тое, што мы назіраем на большасці буйных аб'ектаў. Прычым усё можа ўскладніцца яшчэ і сітуацыяй вельмі жорсткага эканамічнага крызісу наступнага года, калі бюджэт рэзка нырне ўніз, грошы скончацца. І тады праекціроўшчыкам «Грамадзянпраекта» будзе сказана, што трэба каштарыс зменшыць, бо у нас няма грошай, а скончыць трэба, таму замяняйце, калі ласка, французскія і нямецкія матэрыялы на нашыя, «падтрымайце айчыннага вытворцу»...

**Сёння дастаткова весці маніторынг стану храма. Заняцца падрыхтоўкай да кансервацыі, абмеркаваннем праекту. Калі мы ўсе гэтыя праблемы вырашым і дасягнем кансенсусу, тады і можна бузе паступова і планамерна распачаць работы на Каложы.**

# ДАДАТАК

## Меркаванні экспертаў

**Доктар архітэктуры А. Сардараў**

*Фрагмент ліста ад 17.09.2010 г.*

Паважаныя сябры!

Дзякуй за запрашэнне прыняць удзел у круглым стале па Каложы. На жаль, у гэты час я ўжо буду ў адпачынку.

Мая пазіцыя па рэстаўрацыі Барысаглебскай царквы была высветлена яшчэ ў 2008 г. (глядзіце газету «СБ» ад 27 сакавіка 2008 г.).

Яна засталася нязменнай:

**1. Я супраць пабудоў на старых падмурках, супраць ужывання сучасных матэрыялаў.**

**2. Галоўнае пры рэстаўрацыі – гэта перадаць дух часу ў архітэктурным вобразе помніка**.

Каложа, наогул, нейкі Абсалют нашай культуры, да якога трэба дакранацца вельмі асцярожна. Можа лепей за ўсё было б пабудаваць нейкі шкляны саркафаг вакол таго скарбу, які застаўся з стагоддзяў. А новую царкву імя святых Барыса і Глеба магчыма было б пабудаваць праз 100 м ад гэтай святыні.

…

*Дэкан архітэктурнага факультэта БНТУ,*
*доктар архітэктуры,*
*член Навукова-метадычнай Рады па ахове спадчыны.*
*А. С. Сардараў*

*З інтэрв’ю А. С. Сардарава:*

Борисоглебская (Коложская) церковь в Гродно – выдающееся произведение архитектуры. Почему? Во–первых, потому что таких

древних храмов периода раннего христианства на нашей территории осталось всего два: Спасо–Ефросиньевский собор в Полоцке и эта, Коложская церковь. Даже в пределах Древней Руси памятников, приближенно напоминающих Коложу, нет. С этой точки зрения она бесценна. В ее архитектуре прослеживается духовная связь с церквами Греции и южных славян – Сербии, Македонии, Косово. И, наконец, Коложа уникальна с точки зрения декора! Поливные керамические вставки, которые есть у нее на сохранившейся стене, применялись когда-то в византийской церковно–строительной традиции, а также в зодчестве Греции. То, что они существуют на стенах древней церкви в Беларуси, в этом, мы считаем, есть даже некая тайна. Тайна Коложи... Существуют косвенные аналоги подобного декора – в Украине, а также в церквах сербских, македонских – они майоликовые (керамические). Но там другой рисунок – строгий, орнаментальный. Здесь, у нас, это, как народная вышивка, она носит импровизационный характер. Автор неизвестен... Есть только версии...

Трагедия в том, что церковь не сохранилась полностью, а только один из фасадов – северный, а также восточная алтарная часть. Остальное утрачено: войны, обвалы высокого неманского берега сделали свое дело. В XIX веке церковь законсервировали, восстановили стены из дерева. И вот в наше время Коложу решили реставрировать полностью. Стал вопрос: как? И тут начинается конфликт. Конфликт в чем? В том, что предлагается восстановить южный фасад церкви, но совершенно в другом стиле, – и получается нечто гибридное. От научно–обоснованного варианта воссоздания древнего храма пришли к мутанту – на мой взгляд.

Но главная проблема – мы воссоздаем храм современными технологиями! Предлагается сделать стены из газосиликата и железобетонные своды! Здесь хоть пять докторов архитектуры приведи, все скажут – это ненаучно! Потому что меняется образ храма, а значит, одновременно и его духовный смысл.

...Конечно, все обуреваемы искренним желанием воссоздать древний православный храм. Но применение принципа «давай–давай» здесь недопустимо! Напротив, надо трястись над каждым

кирпичиком, который предстоит поменять. Но только не силикат! Тем более, железобетонный свод! С точки зрения эстетики архитектуры получается мутант.

…Я предлагаю честную и чистую консервацию – двускатную крышу с двух сторон перекрыть деревянными конструкциями, как это сделано во многих христианских церквах. При реставрации подобных уникальных произведений архитектуры, согласитесь, должен быть высокий уровень щепетильности. Возможно, общество созреет до понимания, что потратить деньги нужно один раз, но с умом. А **пока лучше легкая консервация, которую можно в будущем разобрать, не нанося ущерба сохранившемуся артефакту.**

*«СБ» ад 27 сакавіка 2008 г.*

**Кандыдат гістарычных навук Алег Трусаў**

### Каложская царква – гэта помнік гісторыка-культурнай спадчыны

Зараз улады Гродзенскай вобласці выйшлі з ініцыятывай правесці грамадскую акцыю «Абаронім Каложу разам». Асабліва мне падабаецца апошняе слова «разам». Гэта значыць правесці грамадскае абмеркаванне і пажадана не толькі ў Гродне, але і ў Мінску, бо Каложа таго вартая.

Я ўважліва прачытаў у газеце «Звязда» (№ 171 ад 2 верасня 2010 г.) артыкул Барыса Пракопчыка «Абаронім Каложу разам! Так, каб не было сорамна перад нашымі продкамі і нашчадкамі» і хачу выказаць наступныя прапановы.

1. Звярнуцца да ўладыкі Філарэта, каб надаць Барысаглебскай (Каложскай) царкве асобны статус «царквы-музея» і такім чынам адрадзіць знішчаную бальшавікамі канцэпцыю «царкоўнаархеалагічных музеяў», якая існавала на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Каложа не павінна быць звычайнай прыхадской царквой. Набажэнствы там могуць праводзіцца толькі па вялікіх святах,

а ў храме можа быць размешчана экспазіцыя па беларускай народнай архітэктуры XI–XII стст. Грошы, атрыманыя ад турыстаў за наведванне музея, могуць часткова пералічвацца ў фонд захавання храма.

2. Перад грамадскім абмеркаваннем спецыялісты-рэстаўратары павінны выканаць некалькі аб'ёмных макетаў розных варыянтаў рэканструкцыі Каложы пачынаючы з прапановы Пятра Пакрышкіна, зробленай у пачатку XX ст. Пры гэтым трэба абвясціць конкурс праектаў, каб у ім маглі ўзяць удзел усе архітэктурна-праектныя арганізацыі Беларусі.

3. Удзельнікі конкурсу павінны прадставіць дакладнае фінансавае абгрунтаванне праекта і падрабязны каштарыс усіх рэстаўрацыйных прац.

4. Удзельнікі абмеркавання могуць папярэдне выехаць у г. Віцебск, каб азнаёміцца з выкананым праектам сп. Генадзем Лаўрэцкім у 1992 годзе на адбудове Віцебскай Дабравешчанскай царквы XII ст. Тады дыскусія будзе больш плённай.

*Трусаў Алег Анатольевіч,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

## Ліст прадстаўнікоў групы экспертаў, арганізатараў і ўдзельнікаў Грамадскіх слуханняў

Міністру культуры Рэспублікі Беларусь
сп. Паўлу Латушку
Начальніку ўпраўлення па ахове
гісторыка-культурнай спадчыны
і рэстаўрацыі Міністэрства культуры
сп. Ігару Чарняўскаму

23 верасня 2010 г. у Гродне адбыліся Першыя адкрытыя грамадскія слуханні па праблеме «Рэканструкцыя Барысаглебскай (Каложскай) царквы: за ці супраць?» Усяго прысутнічала каля 100 чалавек, у тым ліку настаўнікі і вучні школаў гораду, вернікі Барысаглебскага прыходу, выкладчыкі і студэнты вышэйшых навучальных установаў, прадстаўнікі бізнесу, работнікі некаторых прадпрыемстваў (спіс удзельнікаў дадаецца).

Арганізатарам слуханняў выступіла Таварыства беларускай школы. У якасці экспертаў былі запрошаныя навуковы кіраўнік праекта рэстаўрацыі кандыдат архітэктуры **Генадзь Лаўрэцкі**, кандыдат архітэктуры дацэнт **Вячаслаў Чарнатаў**, архітэктар-рэстаўратар, навуковы кіраўнік праекта «Гістарычны цэнтр Полацка» **Вадзім Гліннік**, доктар архітэктуры **Ірына Лаўроўская**, доктар гістарычных навук, археолаг **Аляксандр Краўцэвіч**, гісторык архітэктуры **Ігар Трусаў**. Дэкан факультэта архітэктуры БНТУ прафесар **Армэн Сардараў** не здолеў прысутнічаць, але выклаў сваю пазіцыю пісьмова.

На пачатку слуханняў сп. Г. Лаўрэцкі прадставіў праект рэканструкцыі Барысаглебскай царквы. Падчас абмеркавання праекту экспертамі былі выказаныя сур'ёзныя сумненні ў мэтазгоднасці яго рэалізацыі.

Асаблівая ўвага звярталася на

1. Адсутнасць дакладнай інфармацыі пра аўтэнтычны выгляд царквы ў XII ст., у выніку чаго многія элементы меркаванай рэканструкцыі (купал, закамары на паўднёвай сцяне

ды інш.) народжаныя пераважна фантазіяй аўтара праекта. Выкарыстанне метада аналогіі перакрэслівае самабытнасць і унікальнасць Гарадзенскай архітэктурнай школы.

2. Недапушчальнасць выкарыстання пры рэканструкцыі сучасных будаўнічых матэрыялаў (газасілікатныя блокі, гіпсакартон ды інш.). Усё гэта пагражае старажытнай аўтэнтычнасці і можа знішчыць тое, што іншым разам называюць «духам» помніка. (Пра гэта таксама пісаў прафесар А. Сардараў)

3. Адсутнасць даследаванняў тэхнічнага стану сцяны і двух слупоў XII ст. Пасля рэалізацыі прадстаўленага праекту рэканструкцыі нагрузка на сцяну ў разы павялічыцца, слупы ж стануць нясучым элементам даху, што можа выклікаць іх разбурэнне.

4. Адсутнасць належнай інфармацыі пра геалагічны стан каложскага плато, асабліва з боку р. Нёман. Без такой інфармацыі ніхто не можа гарантаваць, што падчас правядзення будаўнічых працаў не паўторыцца трагедыя 1853 г., калі ў выніку апоўзня царква была напалову разбураная.

5. Адсутнасць у Беларусі падрадчыка, які здолеў бы выканаць працы па рэканструкцыі на адпаведным высокім узроўні. (Прыводзіліся прыклады рэканструкцыі Нясвіжскага і Лідскага замкаў, падчас якіх помнікам архітэктуры і культуры была нанесена непапраўная шкода. Прыгадваўся таксама лёс Дабравешчанскай царквы ў Віцебску (праект Г. Лаўрэцкага), якая ў выніку праведзенай «рэканструкцыі» страчвае рэшткі сваёй аўтэнтычнасці).

Большасць удзельнікаў грамадскіх слуханняў выказала апасенне, што рэалізацыя прадстаўленага праекта можа абярнуцца поўным разбурэннем унікальнага помніка. Многія прысутныя гродзенцы і большасць экспертаў зышліся на думцы, што першачарговай задачай з'яўляецца не рэканструкцыя, а кансервацыя царквы.

Вынікі Грамадскіх слуханняў, прадстаўленыя пазіцыі экспертаў

дазваляюць звярнуцца да вас з просьбай яшчэ раз разглядзець праект рэканструкцыі Каложскай царквы на паседжанні Рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры.

Спадзяемся на вашае разуменне важнасці праблемы рэканструкцыі (рэстаўрацыі) Каложскай царквы і паважнае стаўленне да вынікаў Першых адкрытых грамадскіх слуханняў у Гродне.

Праблема захавання Каложы з'яўляецца агульнанацыянальнай. Прадстаўлены праект павінен прайсці грунтоўную экспертызу (магчыма, з удзелам замежных спецыялістаў і супрацоўнікаў ЮНЭСКА) і рэалізоўвацца пад жорсткім кантролем адпаведных органаў і прадстаўнікоў грамадскасці.

Ад імя арганізатараў, экспертаў і ўдзельнікаў Грамадскіх слуханняў

Доктар гістарычных навук,
Дырэктар Інстытута гістарычных даследаванняў Беларусі (ЕГУ),
Рэдактар навуковага гадавіка «Homo Historicus»
Аляксандр Смалянчук
Доктар гістарычных навук,
Старшыня Беларускага гістарычнага таварыства,
Рэдактар навуковага часопіса «Гістарычны альманах»
Аляксандр Краўцэвіч
Старшыня Гродзенскай філіі ТБШ
Таццяна Канопкіна
Гісторык, краязнаўца, навуковы супрацоўнік УК ГДГАМ
Андрэй Вашкевіч
27.09.2010

## Адказ з Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

*Ліст ад 12.11.2010 г. за подпісам намесніка міністра В. І. Кураша.*

Зварот адносна рэканструкцыі і рэстаўрацыі Барысаглебскай (Каложскай) царквы ў Гродне разгледжаны Міністэрствам культуры сумесна з кіраўніцтвам Гродзенскага аблвыканакама

і яго зацікаўленых структурных падраздзяленняў, кіраўніцтвам і адказнымі прадстаўнікамі УПП «Інстытут «Гроднаграмадзянпраект». У абмеркаванні прынялі ўдзел Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Патрыяршы Экзарх усея Беларусі Філарэт, Епіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Арцёмій.

Па выніках разгляду звароту паведамляем:

1. Пытанні аб правядзенні работ на Каложскай царкве, пачынаючы з 1994 г., неаднаразова разглядаліся на пасяджэннях Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры (далей – Навукова-метадычная рада), зацікаўленай навуковай грамадскасцю.

Пасля шматгадовага збору гістарычных звестак, аналізу графічных рэканструкцый, выкананых у розныя перыяды даследчыкамі царквы, навуковым кіраўніком работ па гісторыка-культурнай каштоўнасці Г. Лаўрэцкім падрыхтавана праектная прапанова, якая была адобрана Навукова-метадычнай радай ад 24.12.2008 г. (пратакол № 149).

Паводле прапанаванага праектнага рашэння прадуглядаецца* аднаўленне страчаных частак царквы (паўднёвая апсіда, паўднёвая сцяна, частка заходняй сцяны) без унясення змен у першапачатковы выгляд існуючага паўночнага фасада. Падставай для аднаўлення страчаных муроў з'яўляюцца малюнкі (акварэлі), выкананыя з натуры ў XIX ст. Матэрыялы захоўваюцца ў Расійскім Дзяржаўным гістарычным архіве (г. Санкт-Пецербург). Ацалелыя часткі царквы XII ст. з муроўкай больш позняга перыяду падлягаюць кансервацыі з мэтай забеспячэння належнага захавання і экспанавання.

2. Па пытанню аб недапушчальнасці выкарыстання сучасных будаўнічых матэрыялаў пры рэканструкцыі і рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры адзначаем наступнае. У міжнароднай практыцы методыкай методыкай выканання рэстаўрацыйных работ на помніках архітэктуры не выключаецца выкарыстанне сучасных матэрыялаў, якія павінны адрозніваццa ад аўтэнтычных. Вядомымі вытворцамі

* Тут і далей захаваная лексіка і стылістыка арыгіналу.

выпускаюцца матэрыялы, якія, зыходзячы з іх характарыстык, выкарыстоўваюцца ў рэстаўрацыі аб'ектаў спадчыны Германіі, Польшчы, Чэхіі і інш., у тым ліку і ў Беларусі. Вопытныя ўзоры цэглы, якая па сваіх памерах адпавядае плінфе, але адрозніваецца ад яе па знешніх прыкметах (колер, характар паверхні) выраблены Красносельскім заводам будматэрыялаў.

Праектнай дакументацыяй не прадугледаецца выкарыстоўванне пры правядзенні работ на Каложскай царкве гіпсакартону, як адзначана ў прадстаўленым звароце. Прымяненне іншых будаўнічых матэрыялаў прымаецца з мэтай памяншэння нагрузкі на схіл Каложскага плато. Фасадную частку сцяны прадугледаецца выканаць з цэглы са знешнім выглядам, адпавядаючым аўтэнтычнай. Пры аддзелачных работах таксама будуць выкарыстоўвацца колатыя валуны і дэкаратыўныя ўстаўкі, якія адпавядаюць маёлікавым пліткам.

3. Даследаванні тэхнічнага стану і разлікі нясучай здольнасці канструкцый сцяны і слупоў XII ст. выкананы спецыялістамі праектнай арганізацыі УПП «Інстытут «Гроднаграмадзянпраект», а таксама ўлічваюць дадзеныя вывучэння грунтоў, якія супадаюць з інфармацыяй, атрыманай пры распрацоўцы праектнай дакументацыі. Прымаемыя рашэнні забяспечваюць надзейную ўстойлівасць канструкцый згодна з адпаведнымі будаўнічымі нормамі.

4. Геалагічныя даследаванні наднёманскага плато праводзіліся неаднаразова: 1904 год, 1935 год, 1993 год. Усе наступныя інжынерна-геалагічныя вышуканні пацвердзілі папярэднія: верхні слой пагорка складзены пяскамі, а ніжні – глiністымі грунтамі да ўзроўня вады ў р. Нёман. З мэтай выключэння пагрозы абрушэння Каложскага пагорка і самой царквы ад паваадкаў на Нёман прыняты шэраг мерапрыемстваў па іх узмацненню.

5. Пацвярджэннем кваліфікацыі выканаўцаў работ з'яўляецца Ліцэнзія на права ажыццяўлення дзейнасці «Праектаванне і ўзвядзенне будынкаў і збудаванняў I і II узроўня адказнасці і правядзенне інжынерных пошукаў для гэтых мэт», якая выдаецца ў парадку вызначаным Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва. За адпаведнасць дзеючым нарматыўным патрабаванням у выкананні работ прыцягнутай падраднай арганізацыі нясе адказнасць заказчык.

На ўмовах субпадраду могуць прымаць удзел іншыя спецыялісты, у тым ліку з суседніх краін, напрыклад, з Польшчы.

У сучасны момант УПП «Інстытут «Гроднаграмадзянпраект» ажыццяўляе распрацоўку будаўнічага праекта па рэканструкцыі і рэстаўрацыі царквы. Праектныя рашэнні будуць прадстаўленыя ў Міністэрства культуры і, пры неабходнасці, на разгляд Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры.

З павагай
Намеснік міністра
*В. І. Кураш*



Храм сёння.

## Остаются вопросы…

Ответ из Министерства культуры на письмо представителей экспертов и жителей Гродно поражает убежденностью его авторов в своей абсолютной правоте. Очевидно желание убедить общественность в том, что дело «восстановления» уникального храма «в надёжных руках». Вот только результаты более чем пяти лет «реконструкции по-гродненски» как раз не позволяют с полным доверием относиться к подобным ответам.

Хочется напомнить, что в сентябре прошлого года известные белорусские специалисты в области археологии, истории архитектуры и реставрации обратили внимание на те сложнейшие задачи, которые предстоит решить, прежде чем браться за реставрацию/реконструкцию Коложи. Эксперты были солидарны в том, что Коложский храм в ближайшей перспективе реставрировать нельзя.

Почему? Во-первых, планируемая реконструкция Коложской церкви угрожает целостности и сохранности стен XII века. В Беларуси реконструкцией исторических зданий занимаются обычные строительные и проектные организации, которые не владеют необходимыми технологиями, не умеют работать без применения большемерной техники, не отвечают за качество работ, и главное, не ощущают ценности сохраняемого объекта. Примеры «реконструкций» Мирского и Несвижского замков, Сынковичской и Юравичской церквей свидетельствуют об этом. А вот более близкий пример: во время «реконструкции» исторического центра Гродно уничтожалась старая столярка, крыши покрывали металлочерепицей, а стены – водоневыводящей штукатуркой, от которой они начинали гнить.

Тотально негативные примеры сформировали у общественности недоверие к «специалистам», которые берутся реконструировать исторические объекты. Никто в Беларуси не может сейчас по старой технологии даже воссоздать плинфу XII века. Стоит вспомнить о знаменитом русском реставраторе церквей Покрышкине, которому царская семья поручила реставрацию Коложи в конце XIX века. Были выделены большие деньги, сделана партии пробной

плинфы. Покрышкин нарисовал несколько эскизов и… отказался продолжать работы, мотивируя тем, что не имеет достаточно сведений о внешнем виде храма в XII веке. Наши современники готовы реконструировать Коложу хоть завтра, хотя их объём знаний о прошлом вряд ли сопоставим со знаниями лучших российских архитекторов рубежа XIX–XX веков.

Во-вторых, реконструкция Коложского храма неприемлема, ибо её проект не соответствует принципам реставрации исторических объектов, принятых во всём мире. По большому счёту, существуют два подхода в проведении реставрации. Первый имеет место, когда памятник восстанавливается в первоначальном виде, это происходит, когда утраты незначительны и информации о памятнике предостаточно. Но даже в этом случае высокохудожественные элементы, утраченные фрагменты фресок, лепнины обозначаются контурами или же вообще остаётся гладкая стенка. Второй подход применяется, когда утраты значительны. Остатки объекта музеефицируются и консервируются, а объём восстанавливается в материалах и технологических решениях резко отличающихся своей современностью. Это делается для того, что бы даже несведущий зритель смог отличить древность от новодела. В случае полного уничтожения памятника (война, землетрясение и т.д.) допускается его полное восстановление, если объект весьма значителен для истории и сохранилась информация, которая позволяет со скрупулезностью из тех же материалов и по тем же технологиям восстановить утраченное. В данном случае памятником будет являться весь ансамбль и информация, сохранённая репликой этого объекта. В качестве примера можно вспомнить старый центр Варшавы, восстановленный после войны, а также четверть главного алтаря Гродненского поиезуитского костёла.

В-третьих, в случае с Коложей восстанавливать утраченную стену храма нецелесообразно, потому что никто не знает, как выглядело верхнее завершение церкви (были ли закомары, подкупольный барабан). Аналоги неприемлемы, ибо стилистика храма уникальна. Кроме того Коложа в нынешнем облике стала символом нашего города.

Есть и другие вопросы:

Можно ли говорить о негативном влиянии весовой нагрузки современной консервационной деревянной конструкции на сохранность и целостность стен XII века?

Выполняет ли консервационная деревянная конструкция свои функции по термо- и гидроизоляции здания? Нужен ли ремонт крыши, окон и т. д.?

Угрожает ли оползень стенам храма? Какова ситуация с геологией Коложского холма? Существует ли необходимость выявления и заполнения карстовых пустот, модернизации системы ливнёвых сливов, дополнительного укрепления откоса и набережной?

Существуют ли расчёты о возможном влиянии строительных работ и дополнительной нагрузке отстраиваемой конструкции на состоянии откоса и стен?

Как на сохранность древнего кирпича, изразцов и сцепливающего раствора влияет эрозия? Как на эту же сохранность может повлиять временное вскрытие крыши? Не следует ли уже сейчас покрыть стены специальным защитным составом или защитить древнюю кладку «стеклянной» витриной?

Как вообще выглядела топография поселения на Коложской горе? Где находились колокольня, монастырский корпус, другие строения?

Ни на один из этих вопросов ответов пока нет, однако уже начата разработка строительного проекта (фактически, окончательного варианта строительства) Коложского храма. Наиболее правдоподобное объяснение этой ситуации следующее: проектировщикам нужны деньги. И эти деньги может принести разработка проекта реконструкции Коложи.

Здесь хочется так же задать вопрос о том, был ли конкурс на работы с Коложским храмом? Почему именно «Гражданпроект» разрабатывает строительный проект «обновлённой» Коложи? По закону должен проводиться конкурс, в котором имеют право участвовать все желающие, даже иностранные граждане.

Наши предложения просты:

1. Провести масштабные археологические и геологоразведочные

работы на Коложе (не обязательно внутри храма, копать надо снаружи).

2. Следить за состоянием Коложской горы. Провести экспертизу состояния сохранившейся части храма и мониторинг перспективных угроз (последствия строительства ГЭС, близлежащих городских магистралей и т.д.). О всех результатах в ПОЛНОМ объёме должна информироваться общественность.

3. Рассмотреть проект возрождения Борисоглебского монастыря и строительства монастырского храма, что позволит максимально полно реализовать чаяния верующих без ущерба для храма.

4. Разработать с учётом интересов церкви комплексную стратегию развития туристической инфраструктуры вокруг Коложи.

5. Только в том случае, если будут учтены все предыдущие предложения, считаем возможным восстановление южной стены из лёгкого и прочного материала, который подчёркивал бы ценность и особенность оригинала.

*Андрей Вашкевич*
*Игорь Лапеха*
*Андрей Чернякевич*

## Заўвагі

[1] У прыватнасці, такім быў лёс былога флігеля віцэ-адміністратара Гродзенскага каралеўскага староства другой паловы XVIII ст. Флігель быў разабраны, а на яго падмурках была збудаваная царква (вул. Горкага).

[2] Расшыфроўку аўдыёзапісу Слуханняў рабіла Інга Сакута. Рэдагаванне вусных выступаў экспертаў рабілі А. Смалянчук і А. Вашкевіч.

[3] Фрагменты праекту Генадзя Лаўрэцкага размешчаныя на сайце Гродзенскага аблвыканкаму (http://region.grodno.by/ru/oblast/dostoprim/kolozza/eskiz_projekta

## Загадкі гарадзенскіх фрэсак.
## Насценны жывапіс Барысаглебскай (Калажанскай) царквы

*Вадзім Глiннiк (Мiнск),*
*Марыя Цэйтлiна (Мiнск)*

*Светлай памяцi Валеры Слюнчанкi прысвячаецца*

Адзін з найстаражытнейшых на Беларусі мураваных храмаў – Барысаглебская (Калажанская) царква ў Горадні – мае надзвычай трагічную будаўнічую гісторыю*. Страты, якія зазнаў помнік за восем стагоддзяў свайго існавання пры выключных мастацкіх вартасцях ацалелых частак, стварылі гісторыка-архітэктурную галаваломку і далі падставы сучасным даследчыкам вызначыць Каложу як «самы загадкавы храм эпохі Старажытнай Русі». Пэўна, што тая ж загадкавасць цалкам уласціва і калажанскаму насценнаму жывапісу, пра які з літаратуры XIX ст. вядома толькі, што ён быў, але да нядаўняга часу ніхто з гісторыкаў мастацтва яго не бачыў.

Калажанская царква багатая на гістарыяграфію. Першыя рэфлексіі над яе архітэктураю належаць айцу Ігнату Кульчынскаму і паходзяць з другой трэціны XVIII ст. Ужо на гэтай стадыі вывучэння Каложы была ўсвядомлена яе гістарычная вартасць («вартасць старадаўнасці», паводле Алёіза Рыгля), засведчаная ў тэкстах XVIII ст.: «старадаўняя», «па-старасвецку мураваная», «вельмі старасвецкая». У тагачасных тэкстах нават дамуроўкі XVI–XVII стст. інтэрпрэтуюцца ўжо не як вынік утылітарна неабходных рамонтаў, але як «знакі і довады» пэўных гістарычных падзеяў. Рана ўсведамляецца архаічнасць структуры плана царквы, а таксама тыпалагічная старажытнасць муроўкі яе першапачатковых частак[1].

Ва ўмовах інкарпарацыі беларускіх земляў Рэчы Паспалітай у склад Расійскай імперыі і звязанага са стратаю дзяржаўнага

* Артыкул быў апублікаваны ў часопісе “Мастацтва” (1995, № 8). Перадрук са згоды аўтараў. Падрыхтоўка да перадруку А.Вашкевіча і А.Смаленчука..

суверэнітэту скажэння інтэлектуальнага жыцця краю цікавасць да Каложы набывае адметна ідэалагічны характар. Старажытны храм пачынае ўважацца за доказ правамернасці расійскае прысутнасці ў «Северо-Западном крае», дзеля чаго цікавасць даследчыкаў засяроджваецца на першапачатковым этапе гісторыі помніка; Каложа трактуецца як «образец древнейшего русского церковностроительного искусства», як «древнейший памятник православия в крае», «редчайший памятник древнего русского зодчества» і г. д.[2] Зусім натуральна, што даваенныя польскія даследчыкі «раўнуюць вагі» і трактуюць Каложу «як адзін з найкаштоўнейшых помнікаў раннесярэднявечнага касцёльнага будаўніцтва з цэглы на ўсходніх землях Рэчы Паспалітай»[3].

Што да савецкіх навукоўцаў, дык, наследуючы расійскую імперскую гістарыяграфічную традыцыю, яны цікавяцца Каложай ці не выключна як архітэктурным помнікам эпохі Старажытнай Русі. Засяроджаныя на праблеме высвятлення першапачатковага аблічча храма, яны амаль што не зважаюць на сляды яго бытавання ў часе і не бяруць пад увагу пазнейшыя этапы будаўнічае гісторыі. Трэба заўважыць, што інерцыя тае традыцыі дасюль замінае ўсведамленню гістарычнае вартасці культурных напластаванняў Каложы.

Ідэалагічная зададзенасць савецкага мастацтвазнаўства часам прыводзіць да метадалагічных непаслядоўнасцяў і «нацяжак». Гэтак у савецкіх даследаваннях звесткі пра калажанскі насценны жывапіс, якія паходзяць з XIX ст., *a priori* разглядаюцца ў мастацкім кантэксце XII ст. Пры гэтым нават не дапускаецца думка пра мажліва пазнейшае паходжанне размалёвак.[4] Варта нагадаць, што вынікі паваеннага архітэктурна-археалагічнага вывучэння Каложы не пацвердзілі заснаванай на ўскосных сведчаннях гіпотэзы пра наяўнасць у храме фрэскавага жывапісу XII стагоддзя, і далі падставы П. А. Рапапорту ў нядаўна выдадзенай працы «Древнерусская архитектура» выказаць думку, што тагачасныя інтэр'еры гарадзенскіх храмаў не мелі роспісу[5].

Тым не менш рэшткі нейкіх размалёвак яшчэ ў XIX ст. былі бачныя на сценах алтарнае часткі царквы, а ў 1985 г., у часе

рэстаўрацыйных работ, архітэктарам Валерам Слюнчанкам у нішы колішняга нартэксу былі раскрыты невядомыя дагэтуль фрагменты фрэсак. На вялікі жаль, заўчасная смерць не дазволіла аўтару адкрыцця апублікаваць знаходку і ўвесці яе ў навуковы ўжытак. Схіляючыся перад светлай памяццю нашага калегі і сябра, мы хацелі, у меру нашых магчымасцяў, завяршыць распачатую ім работу і ў гэтым артыкуле падсумаваць усё, што вядома сёння пра калажанскі насценны жывапіс.

Паводле даных археалогіі, змураваная ў Горадні на схіле XII ст. Барысаглебская (Калажанская) царква неўзабаве абурылася і прастаяла ў руінах да канца XV ст.[6] Найстаражытнейшыя дакументальныя крыніцы, якія паходзяць з пачатку XVI ст., сведчаць, што «церковь во Городне мурованая за местом, недалеко од Городна, светых мученик Бориса и Глеба от колькодесят лет опустевши стояла и опала и хвалы Божое в ней (н)е было», што святыня «сдавна опустела и пуста была»[7].

Напрыканцы XV ст. абок разбуранай царквы быў заснаваны манастыр, а каля 1500 г. руіна была рэканструявана паводле фундацыі Міхаіла Богуш-Багувітынавіча. У выніку аднойлены храм набыў познегатычныя рысы, якія часткова захаваў да нашага часу. У 1738 г. калажанскі ігумен айцец Ігнат Кульчынскі, чалавек добра абазнаны ў манастырскім архіве, напісаў пра парадак тае рэканструкцыі, што фундатар «наўперад муры паламаныя рэстаўраваў і дахам пакрыў, потым у сярэдзіне дом Божы харaством (splendorami) належным аздобіў»[8].

Цягам наступнага часу Калажанская царква істотна змяняла сваё аблічча праз ваенныя разбурэнні, рамонты і перабудовы, пакуль у сярэдзіне XIX ст. у выніку берагавога апоўзня будынак часткова не абрынуўся ў Нёман. Да нашага часу дайшоў невялічкі фрагмент колішняга храма, на першапачатковую аснову якога напластаваныя сляды будаўнічае актыўнасці пазнейшых эпохаў.

Бадай, усё, што вядома было пра насценны жывапіс Каложы да адкрыцця Слюнчанкам фрэскавых фрагментаў, – гэта звесткі пра страчаныя размалёўкі алтарнае часткі царквы, занатаваныя Грозновым. Аўтар першага навуковага апісання Каложы Грозноў стаўся

апошнім цікаўным, хто на свае вочы бачыў рэшткі гэтых размалёвак перад іх знішчэннем, і ўсе, хто пісаў потым пра калажанскі насценны жывапіс, мусілі спасылацца на яго нататкі. Так, у 1864 г. Гразноў назіраў «у правай алтарнай частцы сілуэты Сьвят. Тройцы і ўсярэдзіне крыж карсунскай формы, а зверху слупоў паміж алтарных выгбаў (арак) фрэскі з выявамі месяца і сонца», а ў 1870 г. – «у алтары два анёлы»[9]. Месца апошняга фрагмента пазначана на апублікаваным даследчыкам абмерным малюнку разрэзу царквы. Апісаныя Гразновым фрагменты жывапісу цэнтральнае апсіды былі збітыя падчас рэканструкцыі калажанскіх руінаў у 1873 г. Размалёўкі паўднёвай апсіды («правай алтарнай часткі», паводле Гразнова) былі, відаць, страчаныя ў 1889 г. (калі праз апоўзень частка будынка абрынулася ў Нёман). Нашыя спадзяванні адшукаць рэшткі размалёвак на месцы былі марнымі. Пэўна, жывапіс алтарнае часткі страчаны цалкам.

Пры гэткай нішчымноце на звесткі пра страчанае варта звярнуцца і да мастацкае літаратуры, дзе ёсць згадкі, што ў XIX ст., да рамонту руінаў царквы, «на алтарным скляпенні сям-там месцамі захаваліся яшчэ рэшткі фрэскавага роспісу: слаба віднеўся абрыс галавы нейкага святога дый распісны каёмчаты карніз»[10].

Час стварэння страчаных размалёвак алтарнае часткі дакументальна не пацверджаны, але познегатычныя скляпенні цэнтральнае апсіды, на якіх часткова знаходзіўся згаданы жывапіс, ацалелі і датуюцца мяжою XV і XVI стст.[11] Натуральна, што алтарныя размалёўкі не маглі з’явіцца раней. Удакладніць верхнюю мяжу датавання дазваляюць звесткі з інвентарнага апісання царквы 1795 г., паводле якіх «над вялікім алтаром пасля шведскага спусташэння ацалелі скляпенні, памаляваныя ў аблокі, а спаміж вокнамі над хорам законным Апосталы, Дактары, Прарокі і Св. Тройца нязграбным жывапісам выяўлены»[12]. Пададзеныя звесткі дазваляюць удакладніць дату стварэння алтарных размалёвак, але могуць быць прачытаныя па-рознаму.

Прачытанне 1. Познегатычныя скляпенні былі размаляваныя да «шведскага спусташэння», то ж бо да 1705 г. Значыць: размалёўка можа быць прадатавана XVI–XVII стст. Адметная характарыстыка

алтарнага жывапісу як «нязграбнага», з погляду аўтара інвентара 1795 г., дадаткова сведчыць пра яго архаічнасць, прыналежнасць да папярэдніх гісторыка-культурных эпохаў.

Прачытанне 2. Ацалелыя пасля «шведскага спусташэння» познегатычныя скляпенні былі «памаляваныя ў аблокі» паміж 1705 і 1795 гг. Пры гэтым нагадаем, што пра размалёўку няма ані згадкі ў вельмі дакладным апісанні царквы, зробленым Кульчынскім у 1738 г. Цяжка сказаць, пра што сведчыць гэты факт. Або Кульчынскі з нейкай прычыны не звярнуў увагі на алтарны жывапіс, або размалёўка «ў аблокі» была зроблена пазней, недзе паміж 1738 і 1795 гадамі.

Паводле Ядкоўскага, перад 1889 г. студэнтамі Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў былі зняты акварэльныя копіі з некаторых жывапісных фрагментаў алтара (княжыч, сонца ды інш.), якія яшчэ да вайны захоўваліся ў архіве былога Імператарскага Археалагічнага таварыства ў Маскве. Вароніну, які даследаваў Каложу адразу па вайне, не выпала адшукаць копіі, але калі раптам яны знойдуцца, можна спадзявацца, што аналіз іканаграфічных схемаў, выбару сюжэтаў і асаблівасцяў формы размалёвак дасць» рады ў праблеме датавання насценнага жывапісу алтарнае часткі храма. Разам з тым не трэба забывацца і пра меркаванне Ядкоўскага, які на свае вочы бачыў копіі фрэсак, што ў алтары маглі захавацца жывапісныя напластаванні рознага часу[13].

Што да мажлівае наяўнасці насценнага жывапісу ў іншых частках храма, дык пасля таго, як у 1853 г. палова царквы абрынулася ў Нёман, рэшткі меркаваных размалёвак маглі захавацца адно што на ацалелых сценах цяперашняга наасу. Пры гэтым на іх першапачатковых частках роспісу быць не магло, бо іхняя паверхня спрэс наладаваная адтулінамі галаснікоў і непрыдатная для роспісу. Такім чынам, адзіным месцам, дзе мог знаходзіцца шуканы жывапіс, былі нішы наасу і нартэксу, што меркаваў яшчэ Варонін[14].

Сапраўды, натурныя доследы Слюнчанкі пацвердзілі слушнасць такіх развагаў. Па выдаленні тынку на паўночнай сцяне нартэксу раскрылася замуроўка XVIII ст. з буйнапамернае цэглы, з устаўкамі буйных булыжных камянёў і керамічных непаліваных,

з рэльефным дэкорам плітак, якімі была намошчана падлога Каложы на пачатку XVI ст. Пасля таго, як замуроўка была разабраная, раскрыліся рэшткі дзвюх нішаў з добрачытэльнымі абрысамі. На абмазцы адной з нішаў ацалелі фрагменты роспісу з выявамі двух святых. Абмазка з арнаментальнымі размалёўкамі і слядамі двух клеймаў часткова зьберагласяі на бакавінах нішы. У астатніх нішах царквы рэштак фарбавых слаёў не выяўлена, але кепская захаванасць іх абмазкі не дазваляе цвердзіць напэўна, што яны ніколі не былі распісаны. Раскрытая пара (адзіная з усяго пояса нішаў наасу) заставалася замураванаю ад XVIII ст. і, можа, таму захавала фарбавыя слаі[15].



Выгляд нішы з рэшткамі фрэсак
пасля рэстаўрацыі брыгадай
пад кіраўніцвам В. Лукашэвіча.



На жаль, ацалелыя фрагменты выяўленага сценапісу па раскрыцці былі задужа дэструктаваныя: цалкам страчаны выявы адзення, апаў фарбавы слой аблiччаў і фонаў. Памеры стратаў жывапісу зрабілі малапрыдатнымі традыцыйныя для мастацтвазнаўства метады фармальнага аналізу роспісу, таму мы засяродзілі сваю ўвагу на яго тэхналагічных характарыстыках.

Майстар калажанскае фрэскі карыстаўся тэхнічнымі прыёмамі, пашыранымі ў арэале візантыйскага жывапісу. Гэта дазваляе меркаваць часавы прамежак яе стварэння XII–XVI стст., бо жывапісныя тэхнікі гэткага кшталту пазней на Беларусі не ўжываліся. Паміж ляўкасам і слоем фарбы нанесены роўны шчыльны слой вельмі светлае жоўтае вохры. У колернай гаме фрэскі дамінуюць карычнева-чырвоныя адценні з улучэннем чырвоных, жоўтых і крыху чорна-сінявых фарбаў. Іншыя адценні ўтвораны сумесямі асноўных пігментаў між сабою і з вапнавымі бялiламі ды чорнымі фарбамі. Ці не ўсе фарбавальнікі паводле складу з'яўляюцца прыроднымі пігментамі групы вохраў? Характэрна, што носьбітам сіняе фарбы ў фрэсцы выступае індыга. Наяўнасць гэтага пігменту дазваляе ўдакладніць меркаванае датаванне XV–XVI стагоддзямі, бо сіняе індыга пачало выкарыстоўвацца ў жывапісе ўсходніх славянаў толькі з XV ст.Дагэтуль выкарыстоўваўся лазурыт, зрэдку – азурыт. Паколькі з гістарычных крыніцаў вядома, што да пачатку XVI ст. Каложа існавала ў руінах, на нашу думку, лагічным будзе датаваць адкрыты фрэскавы фрагмент XVI ст.

Супраць ранейшага паходжання роспісу сведчыць таксама тэхніка *fresco-a-secco* (зацёртыя на вапнавых бялілах фарбы, нанесеныя на папярэдне ўвільготнены тынк XII ст.), якая ва ўсходнеславянскіх помніках XII–XШ стст. не сустракаецца. Да таго ж грунт размалёўкі складаецца з вапны з дамешкамі раслінных валокнаў і мізэрнае колькасці цэмянкі (тоўчанае керамікі). Такі склад грунту прынцыпова розніцца ад жывапісных грунтоў даследаваных старажытнарускіх помнікаў XII–XIII стст. (Кіеў, Полацак, Смаленск, Наваградак, Чарнігаў, Ноўгарад, Пскоў, Старая Ладага), у якіх колькасць дамешанае цэмянкі непараўнальна большая. Шэраг жывапісных помнікаў з мастацкіх цэнтраў Паўночна-Усходняе Русі (Уладзімір, Суздаль) розніцца ад астатніх старажытнарускіх помнікаў тым, што іх грунты замешваліся не на цэмянцы, а на тоўчаным вапняку Такім чынам, вынікі тэхналагічных доследаў дазваляюць лічыць XVI ст. як найбольш верагодную дату ўзнікнення фрэскі нішы нартэксу. У сваю чаргу, гэта прымушае згадаць факт існавання ў першай палове XVI ст.пры Барысаглебскім

(Калажанскім) манастыры жывапіснае школы і імёны яе творцаў – айца Ёну і Апанаса Антановіча[16]. Вельмі спакусліва, хоць і зарана, звязаць аўтарства фрэскі з іх імёнамі.

Аднак не выключана паходжанне калажанскае размалёўкі з тагачасных мастацкіх цэнтраў Сербіі. Цалкам магчыма, што Слюнчанкам былі адкрыты рэшткі так званае фрэскі-іконы, характэрнай для сербскае мастацкае школы XIV – XV стст. і зусім невядомай на Русі[17]. У сувязі з гэтым трэба прыгадаць, што ў сярэдзіне XVI ст. у Гарадзенскім павеце, у Супрасльскім манастыры, працаваў мастак «сербін Нектарый». А таксама – звярнуць увагу на стылёвае падабенства арнаментаў на бакавінах калажанскае нішы тым, што на выгбах і ветразях Дабравешчанскай царквы ў Супраслі. Дзеля ўдакладнення даты адкрытай Слюнчанкам фрэскі плённым мог бы быць параўнальны аналіз жывапісных тэхнік Каложы і Супрасльскага Дабравешчання, а таксама паўднёва-славянскіх помнікаў гэтага перыяду, найперш Сербіі.

Вельмі спакусліва праінтэрпрэтаваць выяву двух святых з калажанскае фрэскі праз іканаграфію святых Барыса і Глеба. Прысутнасць абраза князёў-пакутнікаў у храме, асвечаным у іх гонар, падаецца цалкам мажлівай. Такая інтэрпрэтацыя пацвердзіла б датаванне фрэскі XVI ст., бо паводле гістарычных крыніцаў храм быў асвечаны ў імя святых менавіта на мяжы XV–XVI стст. Дарэчы, трэба падкрэсліць, што невядома, як даўней называлася царква, на занядбаных руінах якой яна была адноўлена каля 1500 г. Зрэшты, падобны прыклад маем у Наваградку, дзе на пачатку XVI ст. на руіне царквы XII ст. паўстаў познеготычны сабор, таксама, дарэчы, асвечаны пасля перабудовы як Барысаглебскі[18].

Заўважым, што актуалізацыя культу Барыса і Глеба на беларускіх землях Вялікага княства Літоўскага каля 1500 г. патрабуе пільнай увагі і вытлумачэння з боку гісторыкаў культуры.

На заканчэнне дададзім, што калажанская фрэска была пазней адноўленая тэмпернымі фарбамі. Аднаўленне мелася адбыцца не раней XVII ст., бо за разбельнік ў запісах скарыстаны алавяныя бялілы, якія ў сценапісе да гэтага часу не ўжываліся.

Такім чынам, праведзенае даследаванне не развязвае ўсіх

праблемаў насценнага жывапісу Барысаглебскай царквы, але пазначае накірунак далейшых пошукаў. Верагодна, мы ўжо ніколі не даведаемся пра мажлівы сценапіс страчаных частак храма, не зможам рэканструяваць сістэму размалёвак гатычнай Каложы цалкам. І святыня наўрад ці страціць калі рэпутацыю самага загадкавага помніка Старажытнай Русі. У Беларусі, дададзім мы, паводле вынікаў сваіх доследаў.

## Заўвагі

[1] Jodkowski J. Świątynia warowna na Kołoży w Grodnie w świetle badań archiwalnych i archeologicznych dokonanych w 1935 / J. Jodkowski. // Prace i sprawozdania Muzeum w Grodnie. Nr 1. Grodno, 1936. S. 14-31.

[2] Корчинский Н. Древная Копожская церковь во имя святых князей Бориса и Глеба в г. Гродно. Гродно, 1908. С. 3-4.

[3] Jodkowski J. Świątynia warowna na Kołoży... S. 3.

[4] Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Мн., 1928. С. 130; Церашчатава В. В. Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI-XVIII стст. Мн., 1986. С. 52; Гісторыя беларускага мастацтва. Т. І. Мн., 1987. С. 85.

[5] Раппопорт П. А. Древнерусская архитектура. СПб., 1993. С. 93.

[6] Воронин Н. Н. Древнее Гродно. М., 1954. С. 78-79.

[7] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-западной Руси... Т. IX. Вильно, 1870. С. 419.

[8] Тамсама. С. 417.

[9] Грязнов В. Коложская Борисо-Глебская церковь в Гродне // Труды Виленского отделения московского предварительного комитета по устройству IX археологического съезда. Вильна, 1893. С. 370.

[10] Крестовский В. Две силы. С. 223-234; Иосиф. Гродненский церковно-православный календарь. Воронеж, 1899. Ч. I. С. 494. Цытуецца паводле Н. Н. Вароніна. Древнее Гродно.

[11] Слюнченко В. Памятник архитектуры XI века – Борисоглебская (Коложская) церковь в городе Гродно. Комплексные научные изыскания. Мн., 1988 // Архіў Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытута. Аб'ект № 37-70, інв. № 62.

[12] Аддзел рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта. F 4, Рук 2290, арк. I.

[13] Jodkowski J. Świątynia warowna na Kołoży... S. 21.

[14] Воронин Н.Н. Древнее Гродно... С. 99.

[15] Слюнченко В. Памятник архитектуры XII века...

[16] Jodkowski J. Opat Jonasz i Astanazy Antonowicz – malarze grodzieńscy za Zygmunta I / J. Jodkowski. // Muzeum w Grodnie. Grodno: Muzeum Państwowy, 1925. S. 38.

17 Лазарев В. Н. История византийской живописи. М., 1986. С. 178.

18 Каргер М. Г. Раскопки церкви Бориса и Глеба в Новогрудке // Кратк. Сообщ. Ин-та археологии.1977. Вып. 150. С. 79-85.

## Судьба Борисоглебской (Коложской) церкви в описаниях Михаила Кояловича и Епископа Иосифа

(вторая половина XIX в.)

*Дискуссии вокруг реконструкции/реставрации Коложи, не оставила равнодушным почти никого. Собственно, в этом на сегодняшний день и заключается главный её положительный момент – привлечь гродненцев к проблеме сохранения памятников прошлого. Но, дело в том, что сама проблема с восстановлением Коложского храма имеет свою, более долгую историю. Важно учесть те ошибки, которые уже однажды привели к роковым последствиям…*

*Ниже мы приводим отрывки из статьи известного историка М. Кояловича и книги Митрополита Литовского Иосифа. Надеемся, вдумчивый читатель найдет в этих текстах пищу для размышления…*

### М. Коялович. Гродно: Из путевых наблюдений во время поездки по Западной России // Церковный Вестник. 1887, № 10

…Когда я приехал в Гродно, то первый мой выезд из гостиницы был в тамошнюю древнейшую русскую местность… Это так называемая Коложа, где у самого края обрыва при впадении Городничанки в Неман, против бывшего Витовтова замка, расположенного на другом таком же обрыве, стоят развалины Борисо-Глебской церкви.

Какое величие древности и какое запустение в настоящее время! Осталась только половина стен церкви… Архитектурный рисунок трёх алтарных апсид, …рисунок оставшихся в церкви колонн, и выполнение этого рисунка поражают таким совершенством, что этому могли бы позавидовать и многие нынешние архитекторы и мастера, и это тем резче бросается в глаза, если посмотреть на верхние части стен, где видна уже новейшая кладка.

…Мы не будем здесь входить в длинный разбор достоверной истории этого храма… Мы остановимся только на нескольких пунктах этой истории, требующих некоторых поправок и весьма важных дополнений…

Первое, документальное известие о существовании Борисо-Глебской церкви и без всякого упоминания о разрушении …относится к 1480 году. …Тогда было значительное расстояние между церковью и Неманом, которое и теперь видно, если смотреть на старое русло этой реки. Но в трёх документах 1506 года уже много раз говорится, что эта церковь «опустела и опала»; «от давных часов (времён) опустошивши (опустевши) стояла»; «от колькодесят лет опустевши стояла и хвалы Божое (богослужения) в ней не было».

К этому то периоду времени… и приурочено предание, что войска Иоанна III разрушили верх Борисо-Глебской церкви, засыпали её землёй и, поставив там пушки, громили городскую крепость, находившуюся на известном уже нам другом обрыве.

…Так ли всё это было или иначе, теперь нельзя решить. …Много приложили старания, и тоже не раз, к запустению этой древности и местные русские и раньше и после вторичного моковского запустошения, не только светские ктиторы Коложанского моностыря, православные и не православные, но и духовные власти, и униатские от митрополитов до коложанских игуменов, и даже православные во времена воссоединения западно-русских униатов, когда и Борисо-Глебская церковь, кое-как подправленная (в 1836 году), возвратилась в православие…

Небрежение православных и униатов старых времён описано в монастырской хронике Кульчинского до 1740 года… Мы здесь кратко опишем небрежение новых времён, до сих пор неизвестное в печати… Здесь нам придётся излагать некоторые изумительные факты, в которых опять сошлись и восточная и западная Россия, но ещё на большую пагубу Борисо-Глебской древности.

Около 1839 года и долго спустя после, Борисо-Глебская монастырская церковь была единственная в Гродно церковь, в которой могло совершаться православное богослужение надлежащим об-

разом собственными силами. В городе был женский монастырь, но не имел священника; была ещё тюремная церковь, но то же без священника. В обе эти церкви нужно было посылать из Борисо-Глебского монастыря не только монахов для совершения службы, но и послушников для чтения и пения… Это представляло крайнее затруднение, которое ещё увеличивалось от того, что очень трудно было путешествовать в город из монастыря. Прямо через овраг Городничанки редко можно было пробираться, а в обход, через мост было очень далеко. В монастыре стала более и более утверждаться мысль, что лучше совсем перебраться в город…

Понятно, что при таком положении дел и при таких взглядах, не было надлежащей заботливости об охране Борисо-Глебской церкви от разрушительных стихий, а стихии эти сильно работали.

Неман в весеннее время сильнее и сильнее поворачивал от старого своего русла поближе к коложанскому берегу, подмывал и обваливал его с южной стороны церкви, а Городничанка помогала ему на юго-восточной стороне. К вящей беде ещё и сам монастырь помогал этой разрушительной работе. С его двора снеговая вода тоже направлялась в Неман близ западной стороны церкви. Уже в 1840 году обозначилась трещины в стенах церкви, на которые, однако, не вдруг обращено было внимание. И только в начале февраля 1842 года архимандрит Игнатий, известный, заметим, великою ревностью к церковности, доносил, что церковь находится в опасном положении, которое постоянно увеличивается, и просил о перемещении братии... Местная власть на эту просьбу не согласилась, и дело стало затягиваться.

Но на коложанскую древность обратил внимание император Николай I, отличавшийся, как известно, поразительной чуткостью к старине. Поднялось дело. Св. Синод отпустил на охранение Борисо-Глебской церкви от Немана 1,026 рублей. Министерство путей сообщения между тем потребовало смету на укрепления берега, каковая и была составлена к концу 1844 года на сумму 8,067 рублей и 7 копеек. Но пока дело это тянулось, Неман и Городничанка работали с прежней силой и в следующем 1845 году последовал обвал берега у самой церкви, которая и была тогда же закрыта и всё дело

об ней по решению Св. Синода от 30 ноября 1846 года «рассмотрением отложено впредь до получения окончательных распоряжений…»

Отсрочка продолжалась долго; подошло время крымской войны, и тогда как бы за одно с русскими сердцами дрогнули и древние стены Коложанской Борисо-Глебской церкви. С 1 на 2 апреля 1853 года половина этой церкви рухнула в Неман.

…Естественно возникает вопрос: какое впечатление произвело это печальное событие, вызвало ли в ком скорбь и помышления об охране, по крайней мере, того, что осталось? В деле, из которого мы берём эти сведения, нет никакого следа, что это печальное событие вызвало скорбь, а помышления были вызваны, но совсем иного рода.

В Литовской консистории возник вопрос: стоит ли жертвовать столь большую сумму (8067 рублей) на столь сомнительное дело, как охрана Борисо-Глебских развалин от дальнейшего разрушения, и на восстановление их… В этом же деле есть документ – …акт осмотра развалин епархиальным архитектором, который указывал, что «всякие исправления» Борисо-Глебских развалин «напрасны», и предложил вместо того следующее: «Если бы предположили вместо старой построить новую церковь возле монастыря на безопасном месте, то пологая церковь такой же величины и конструкции, …если дозволено будет для стен употребить камня и не выводить куполы, то за сумму, какая нужна на укрепление берега, почти возможно воздвигнуть новый храм».

Если бы этот проект был принят, то кто знает, не пошли ли бы на новую церковь, ради дешевизны, и камни из оставшихся развалин древней Борисо-Глебской церкви.

Но на этот раз явилась неожиданная для епархиального архитектора защита развалин и протест против его предприятий. Монастырь, переселившийся на новое, более удобное место в самый город, не желал не только возвращения на старое место, но и постройки там новой церкви.

Этот взгляд на вещи со всею ясностью высказал в новом донесении преосвященный Игнатий от 19 ноября 1856 года. После сооб-

ражений, что ассигнованной суммы на укрепление берега Немана и восстановление Борисо-Глебской церкви мало, преосвященный говорит: «…По мнению моему здание это и не заслуживает уже требующихся денежных издержек …и ныне не предстоит надобности открывать оное…»

Но это ещё очень скромное признание неважности Борисо-Глебских развалин. …В упомянутой бумаге тогдашнего епархиального архитектора проскочило невежественное выражение, которое, однако, пошло в ход и в 1857 году вошло в представление митрополита Иосифа в Св. Синод, где говорилось, что Борисо-Глебская церковь «не отличается никакими ни архитектурными, ни артистическими особенностями».

Но когда это писалось, уже поднялось иное дело, – дело о восстановлении подобающей чести гродненской древности, и опять, как в сороковых годах, русский царь выступил на защиту этой чести. На отчёте гродненского губернатора за 1855 год …Александр II написал о Борисо-Глебских развалинах: «В каком положении это дело?» – и пошли запросы, справки, сметы… В 1863 году Литовская консистория опять представила было Св. Синоду, что восстановить церковь будет трудно и в ней нет нужды, а нужно вызвать ценителей древности, предложить им сберечь от разрушения эту церковь. Но такое мнение уже не могло иметь силы. Св. Синод предписал начинать работы согласно заявлению гродненского купца-строителя Сидоровского… и в том же году, 7 ноября, был Высочайше утверждён проект возобновления Борисо-Глебской церкви, а в следующем году Сидоровский начал работы по укреплению берега.

Что вышло бы из этих работ – восстановление ли разрушенной древности или окончательная их гибель, неизвестно, потому что коложанские развалины вызвали новое необычайное движение на их защиту, обещавшее возвратить им подобающую честь и славу и кончившееся печальным положением их.

…Поступил начальником северо-западного края генерал Кауфман, – известный инженер и ещё более известный продолжатель и ревнитель народных строительных русских дел в западной России графа Муравьёва. Гродненский тогдашний губернатор, тоже

pawet.net

«строго-русский человек», И. Н. Скворцов, обратил его внимание на коложанские развалины. Генерал Кауфман понял важное значение этого представления. Двинут был в Гродно чуть не все девятый инженерный округ. Наехавшие инженеры раскритиковали в пух и прах работы Сидоровского и добрались до сути дела, с которой и теперь прежде всего нужно начинать – показали, что нужно сперва укрепить правый берег при впадении Городничанки в Неман; работы Сидоровского были остановлены, и пошли разные соображения, планы, как и что следует делать надлежащим образом.

...Инженеры разъехались... И дело по восстановлению коложанских развалин оказалось в таком положении: купец Сидоровский разорился; церковно-строительный комитет, передавая свои дела гражданской власти, заявил, что у него не осталось ни гроша.

Заговорил и Неман. Точно рассердившись за бессильные попытки и бесплодные мечтания смирить его могучие волны, он снёс всё, что было сделано Сидоровским, и привёл всё в прежнее положение, как было до времени всяких широких мероприятий и петербургских и местных инженеров...

*Падрыхтоўка да друку Андрэя Чарнякевіча*



Каложская царква на малюнку М. Андрыёлі ( 1895 г. )

## [Иосиф, епископ]. Коложская в г. Гродне церковь с бывшим при ней Борисо-Глебским монастырем в подробном изложении положения ея прежнего и за последнее время с фототипическим изображением Коложской иконы Богородицы и 5 видов епископа Иосифа. Воронеж, 1899

[Разрушение церкви. 1853 г.]

…В ночь с 1 на 2 апреля этого рокового для Коложи 1853 г. Вся южная стена храма на протяжении 5 сажень и часть западной стены фронтовой на протяжении сажени со всем их фундаментом рухнули в сильные воды Немана и ими увлеченные бурливо разнесены течением. Стены увлекли за собой потолок церкви с поперечными его балками на всем пространстве между обрушившеюся стеною и продольною со стороны реки балкою, поддерживавшею все прочие поперечные потолковые балки. Удержалась как-то на стропильных связях над всем этим разрушением крыша, но и она ежеминутно грозила падением.

Так монастырь лишился своего храма – заветного, замечательного, старинного храма и иноки его должны были теперь только спешить спасать церковные принадлежности из прямого опасения нового обвала…

Эту прегрустную катастрофу, которая была не непредвиденна, не неподготовлена настоятель монастыря преосвященный Игнатий так изображает в своем о ней официальном донесении от 3 апреля 1853 г. Литовскому митрополиту Иосифу: «В минувшую осень, а больше еще в феврале месяце настоящего года, вследствие бывшей в то время продолжительной сырой погоды обрыв горы уже при самом фундаменте Коложской церкви сделался еще большим и увеличившиеся от того трещины в стенах ея южной от стороны реки и западной, угрожали неминуемым этих стен падением, которое и действительно последовало ночью с 1 на 2 число сего апреля.

Начиная от западного угла церкви, южная стена ея на протяжении 5 сажень, т.е. до правого клироса и часть западной фронтовой

стены от сказанного угла в ширину больше 1 сажени со всем фундаментом и находившеюся под ним песчаною землёй, совершенно обрушилась в реку, увлекши за собой и досчатый потолок с поперечными балками на всем пространстве между обрушившеюся стеною и продольною со стороны реки балкою, поддерживающею все прочие поперечные потолковые балки. Гонтовую крышу над сделанным проломом церковных стен удерживают еще на месте довольно крепкие стропильные связи, но и она не может остаться без повреждения в случае дальнейшего обрушения стен по сделавшимся уже трещинам.

Вследствие прописанного падения большей части продольной стены церкви и образовавшегося в оной большого отверстия, находившиеся на ней иконостас, киоты с образами, шкафы, вся ризница и утварь не могли уже оставаться наперед (впредь) на том же месте и потому они для предохранения от неизбежной порчи вынесены из церкви и размещены по возможности в монастырских строениях».

…При этом епископ Игнатий Железовский присоединял, за № 125 от 3 апреля, что «если бы предполагалось на место упавшей стены и фундамента воздвигать в настоящем положении Коложской церкви новые, то для сего необходимо нужно возводить фундамент от подошвы горы, следовательно, гораздо глубже самой вышины церковных стен. В случае же необходимости вколачивания свай для фундамента, производящееся при сем сотрясение может работающих подвергнуть опасности жизни от обрыва верхних слоев земли и самого даже церковного здания».

[Сохранение Коложских руин. 1896 г.]

…Уже летом 1892 г. Возбуждено было обращение к Строительному отделению местного Губернского правления с просьбой дать свое мнение, как бы можно было охранить от дальнейшего разрушения дождем и снегом уцелевшие Коложские стены. Кроме научно-археологического выставлялся при этом и мотив религиозно-церковный. Уцелевшие стены Коложского храма не утратили для православных гродненцев священного значения . тем боле, что…

в устроенной на месте бывшего алтаря часовне в летнее время изредка совершалось Богослужение с акафистом. Еще усерднее… народ стал посещать это Богослужение с тех пор, когда с весны этого 1892 г. Оно стало совершаться регулярно каждый воскресный день и притом служением архиерейским с пением архиерейского хора и «чтениями» там при этом.

Когда [о]сознана была неотложная потребность в устройстве для остатков Коложского храма особого прикрытия, естественно было возникнуть и мысли устроить это прикрытие так, чтобы и Коложскую часовню вместе с тем опять обратить в алтарь православного храма. Обращаясь в Строительное отделение с означенною просьбой, прошено при составлении проекта прикрытия обратить свое внимание и на эту сторону дела. Строительное отделение поручило одному из своих архитекторов заняться составлением проекта.

Между тем путем обмена мыслями со сведущими и заинтересованными делом людьми у инициатора сам собой выработался план этой нужной постройки. Этот план признал осуществимым известный в крае строитель церквей и разных общественных зданий, сведущий и опытный в строительном деле Арсений Моисеевич Пимонов. Составленный им проект постройки представлялся, при простоте сооружения, удобно осуществимым на деле по могущим найтись на месте домашним для сего средствам…

«Опыты дают повод думать, писал 16 августа 1894 г. Один ученый, почтенный опытный археолог по поводу преднамечаемого такового способа производства охраны Коложских остатков домашними и частными средствами предпринимавшим это почтенное дело в ответ на обращение к нему, как бы удобо-достижимее достигнуть выполнения предприятия, опыты дают повод думать, что если за реставрацию памятника возьмутся ученые архитекторы и поведут ее по всем правилам и требованиям художественной археологии, то дело может принять грандиозные размеры и, пожалуй, не будет доведено до конца. Лучше сделать немного, но сохранить памятник. Во всяком разе познакомить бы с проектом сооружения охраны какого-либо сведущего архитектора, который мог бы сказать, что проект не только не нанесет ущерба памятнику, но наоборот

поможет его сохранению. Заручившись этим удостоверением техника, обратиться бы в Императорскую археологическую комиссию с просьбой о разрешении выполнить проект, при разъяснении, что имеется в виду охрана памятника, хотя бы временная (однако настойчиво необходимая) и что целесообразность проекта с точки зрения технической удостоверяется прилагаемым свидетельством техника-архитектора, на местные средства».

По таковому доброму совету компетентного в делах подобного рода лица, согласно его указанию, составленный проект рассмотрен был Гродненским архитектором П. В. Романовым и, одобренный им, вскоре препровожден был в сию Императорскую Археологическую комиссию с просьбой о разрешении произведения охраны по приложенному чертежу на местные средства. Комиссия с выражением «искреннейшей признательности за столь внимательное отношение к памятникам отечественной старины», от 17 декабря того же 1894 года за № 1843, уведомила, что с ея стороны препятствий к сооружению проектируемой на Коложе постройки не встречается. Комиссия только «напоминает, что эту постройку следует производить без малейшей порчи древних стен». Кроме того, она прибавляла, что «желательно было бы принять какие-либо меры и против осыпания стен в реку»…

Самая постройка на Коложе произведена весной 1896 года, исключительно на одне местные средства. Необходимый для нея строительный материал доставила, с разрешения Епархиального начальства, лесная Дубницкая дача Борисо-Глебского монастыря, находящаяся в 14 верстах от Гродны, досками, балками столбами… заблаговременно из нея извлеченными. Приспособительно к потребности изготовленными и в предыдущее лето и зиму надежно для дела иссушенными. Денежные же средства на самое производство строительных работ получены главным образом из образовавшихся за последние годы по Гродненскому архиерейскому дому с его церковью и по Борисо-Глебскому монастырю сбережений – церковных и экономических. Производство работы обязательно принято тем же Арсением Моис. Пимоновым, строившим в то время в Гродно собор, гимназию, тюремную церковь, монопольные

сооружения… имеющимися у него русскими православными рабочими – мастерами дела, под руководством и наблюдением архитектора Романова, которому принадлежал подписанный им проект сооружения с рисунком его.

2 мая, в день перенесения св. мощей святых благоверных Бориса и Глеба, сообщалось местной печатью, архиерейским богослужением совершено было на Коложе освящение строительных материалов и работ восстанавливаемой, или вернее охраняемой древней нашей святыне – Коложского церкви. Положено пристроить вместо обвалившихся в 1853 г. Каменных стен, две легкие деревянные стены, покрыть все здание деревянной же крышей и восстановить таком образом церковь…

Охранная сего храма работа дана такая: «С южной, половины западной и небольшой части восточной стороны устроены легкие деревянные стены, состоящие из брусчатых стоек и раскосов, обшитых снаружи досками*. Для придания большей устойчивости южной деревянной стенке сделаны контрфорсы из брусьев. Вся церковь по вновь сделанным стропилам покрыта гонтовой крышей; над крышей устроена главка с чугунным, ажурным, позолоченным 8-конечным крестом, такой же формы, которую она имела до обвала церкви. С западной стороны сделаны входные двери с притвором. Подшитый досками потолок устроен на деревянных балках, концы которых связаны железными хомутами со старой кирпичной и новой деревянной стенами. Таким образом, требования Археологической комиссии выполнены точно. Само собой разумеется, что ни штукатурки, ни покраски уцелевших каменных

---

* В 1895 г. 23 мая, осматривавший Коложские развалины один археолог-художник – Д. М. С. отзывался о встреченных в алтарной части двух трещинках, при окне к юго-востоку, что это от тяжести наложенного вверху над древнею кладкой нового кирпича в последующее разное время: каменная или какая-либо кирпичная при сохранившихся от давнего времени стенах пристройка с надстройкою может также тяготеющее влиять на них и способствовать расслоению, а то прямо разрушению или обрушению, смотря по тяжести наслаиваемого при них, с ними и на них груза – деревянная же, как легкая, безопасна, надежна и удобна, не единственно ли и возможна, не единственно ли допустима..

стен не произведено. Устройство иконостаса также сделано без какого-либо нарушения древних стен.

Такое «восстановление» древней церкви встречено большим сочувствием гродненской православной паствы: утешительно для нея, что опять на Коложской горе является алтарь Богу, где он пребывал более 700 лет…

С возведением недостававших стен, с устройством крыши и пр. стало, с другой стороны, ясно, как прекрасен и величествен был этот храм. Если когда-либо суждено произойти полной реставрации этого древнего Коложского храма, – устройство теперешней его охраны даёт полную гарантию того, что до той поры стены его не рассыплются и не разрушатся сами собой под влиянием атмосферных осадков».

«С Божьей помощью, – отмечалось в то время об этом сооружении местной печатью, – на месте обрушившихся в 1853 году Коложских храмовых стен ныне возведены новые деревянные, и таким образом образовалось новое храмовое здание, с притвором к нему и куполом той формы, какая прежде была здесь. 15 июня на куполе установлен золоченный, ажурный красивого рисунка восьмиконечный крест, имеющий 3¼ аршины в высоту и около 7 пудов веса. Освящение креста совершено архиерейским богослужением в присутствии собравшихся богомольцев их числа православных жителей этой местности, с благоговением явившихся помолиться Бону при этом священнодействии, которое было совершено уже в самом храме.

С возведением недостававших зданию стен, с настилкою потолка и проч. выяснилось, как действительно прекрасен был этот храм во время его первого устройства и благосостояния, чего, при самом наряженном воображении невозможно было усмотреть, когда он представлял из себя руину. Теперь только можно было видеть, как он был замечательно строен, строго соразмерен в целом и частях, как замечательно пропорциональны его площадь, высота и ширина; теперь только можно убедиться, как эта гармония целого и частей своей выдержанностью, законченностью и красотой невольно влияет на душу богомольца, возвышая ея и вызывая чувство бла-

735731 говения. Масса голосников – эта особенность наших древних храмов, даёт превосходный резонанс чтению и пению. Обращаясь к внешности здания, нельзя не заметить, сколько красоты и божественного смысла придавали этому храму цветные изразцовые кресты и звезды, прекраснейших форм и рисунка, которыми облицованы стены при самом сооружении храма. Невольно напрашивается мысль: умели наши предки строить домы Божия, да не умели потомки сохранить их.

*Падрыхтоўка да друку Алеся Смаленчука*

# «РЭКАНСТРУКЦЫЯ» СУПРАЦЬ ГІСТОРЫІ

## Страчаная Горадня,
## або хроніка «рэканструкцыі» 2008-2011 гг.

З моманту выхаду ў свет чацвёртага выпуску альманаха «Горад Святога Губерта» (2008) у нашым горадзе намаганнямі «рэканструктараў» стала менш яшчэ на цэлы тузін старых будынкаў. Некаторыя з іх згарэлі, аднак большасць была знішчана па прычыне «бесперспектыўнасці».

Сярод будынкаў, якія мы страцілі – гродзенская электрастанцыя (пабудова 1912–1923 гг.), былая пякарня Любэга ва вул. 17 верасня, цэлы квартал па вул. Падольнай... Цяпер гэтыя будынкі можна ўбачыць толькі на здымках.

«Рэканструкцыя» гістарычнага цэнтра ізноў набірае абароты...

### Ілюстрацыі



Дом па вул. Дзяржынскага, 14.



Электрастанцыя па вул. Будзённага.



Дом 1914 года пабудовы (даліна ракі Гараднічанкі).



Дом пачатку XX ст. на Завершчызне.



Дом па вул. 17 верасня, 8.





Дзверы ў доме па вул. Батанічнай, 3 Дзверы пасля «рэканструкцыі»



Дом па вул. Будзённага, 50



Дом па вул. Падольнай, 34



Дом па вул. Падольнай, 38



Дом па вул. Гарнавых, 29



Вызначаны пад знос дом па вул. Урыцкага, 12

*Падрыхтоўка да друку А. Вашкевіча.*
*Фотаздымкі Я. Лялевіча.*

# Гродзенскі «Новы свет»: перспектывы рэнавацыі і выкарыстання

*Андрэй Вашкевіч (Гродна),*
*Ігар Лапеха (Гродна)*

*Напрыканцы 2009 года гродзенскія гісторыкі звярнуліся ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з праектам унясення гродзенскага Новага свету ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны краіны і перспектыўнага развіцця гэтага раёна. Праект стаў вынікам трохгадовай працы па вывучэнні гэтага ўнікальнага абшару нашага горада. Адказ, атрыманы з Міністэрства культуры, звёўся да таго, што Навукова-метадычная рада па пытанню аб уключэнні абшару Новага Свету ў спіс спадчыны пройдзе тады, калі са сваімі прапановамі выступяць Гарвыканкам і «Гроднаграмадзянпраект», якія з красавіка 2007 года дапрацоўваюць свой варыянт «рэканструкцыі» Новага свету.*

*Мы абавязкова ў бліжэйшы час актуалізуем справу ўключэння Новага свету ў межы ахоўваемага гістарычнага цэнтра Гродна, а пакуль прапануем чытачам гэты праект у скарочаным выглядзе (без характарыстык паасобных будынкаў, якім прапануецца надаць статус каштоўнасцей).*

## Уступ

Раён горада Гродна пад назвай Новы свет з'явіўся ў другой палове XIX ст.як частка горада, якая паступова ўзнікала на былых уладаннях князёў Друцкіх-Любецкіх.

24 чэрвеня 1875 года прадмесце Новы свет было афіцыйна ўключана ў межы горада.

У межах Новага свету будавалі свае дамы дастаткова заможныя гараджане, таму драўляная забудова канца XIX – пачатку XX ст. мела вялікую колькасць дэкарацыйных аздабленняў (асабліва варта адзначыць будынкі ў стылі так званага «рускага мадэрну»).

Шмат цікавых будынкаў (асабліва ў стылі канструктывізму)

з'явілася ў Новым свеце цягам 1920–1930-х гг., калі тут будаваліся польскія чыноўнікі і афіцэры а таксама эмігранты з былой Расійскай імперыі.

Гродзенскі Новы свет – найбольш аргінальная частка гістарычнага цэнтра горада першай трэці ХХ стагоддзя, якая захавала непаўторны дух гарадской ускраіны і валодае вялікімі ўнутранымі рэзервамі для развіцця турызму і малога бізнэса, рэстаўрацыі і рэнавацыі.

Аднак да сённяшняга дня большая частка Новага свету не ўваходзіць у межы гістарычнага цэнтра Гродна, а найбольш каштоўная яго частка (вуліцы Міцкевіча – Горкага – 17 верасня – Астроўскага – Рэйманта) запланавана гарадскімі ўладамі да поўнага зносу.

## Новы свет як гісторыка-архітэктурная каштоўнасць. Магчымыя накірункі рэнавацыі і захавання

Новы свет у Гродне за сто гадоў свайго існавання істотна не змяніўся, і як частка ўжо гістарычнага цэнтра ў вельмі прывабным месцы горада будзіць прагу на набыццё прыбытку новаму капіталізму.

Аднак у параўнанні з пачаткам ХХ стагоддзя для лёсу Новага свету змянілася тры рэчы:

– раён цяпер мае значна большую колькасць насельніцтва, са значна меншымі фінансавымі мажлівасцямі, чым першыя яго гаспадары, з іншымі эстэтычнымі і побытавымі патрабаваннямі і родам заняткаў.

– першыя гаспадары раёна не патрабавалі гаражоў і стаянак для транспарт , мелі развітую інраструктуру ў межах раёна (крамы, майстэрні, корчмы).

– многімі жыхарамі горада Новы свет успрымаецца як раскоша, якую не заслугоўваюць сучасныя жыхары раёна (агароды ў цэнтры горада, двор на малую колькасць людзей, нестандартнасць планіроўкі і інш.).

Станоўчае тое, што грамадскасць усведамляе мастацкую і гістарычную каштоўнасць Новага свету і пачынае задумвацца аб захаванні і ўстойлівым развіцці гэтага раёна.

Адзіна правільным рашэннем цяпер лічыцца прыцягванне інвестара з толькі адной умовай: перасяліць цяперашніх жыхароў раёна і пасля, фактычна, дашчэнту знесці ўвесь раён.

Ніхто не задумваецца, што ўнікальны ансамбль Новага свету можа быць для інвестара больш прывабным, чым проста пустэча ў цэнтры горада.

Фактычна ж і перад грамадскасцю і перад дзяржавай павінна ставіцца іншая задача, а менавіта, **дзе знайсці сродкі на захаванне не толькі асобных архітэктурных аб'ектаў, не толькі ансамбля уцэлым, але духа пачатку XX ст.?**

Існуюць тры асноўныя шляхі захавання гродзенскага Новага Свету:

**Першы шлях.**

Усё робіцца коштам дзяржавы. Новы свет пераўтвараецца у Прадмесце-музей, свайго роду «Гродзенскі скансэн». З сродкаў камунальнага бюджэту будзе адбывацца рэстаўрацыя будынкаў. Жыхароў абавяжуць выконваць пэўныя патрабаванні, звязаныя з захаваннем і цэласным успрыняццем ансамбля. Улады будуць імкнуцца атрымаць пэўны прыбытак на развіццё раёну ад галерэяў, майстэрняў, сувенірных крамаў, кавярняў ды інш.

**Другі шлях.**

Змяненне складу насельніцтва на значна больш багатае. Гэта працаёмкі і складаны шлях, бо патрабуе індывідуальнай працы з кожным старым і будучым жыхаром Новага свету, пастаяннага пошуку балансу паміж укладаннем прыватных сродкаў у паляпшэнне якасці жыцця ў раёне і захаваннем гістарычных краявідаў.

**Трэці шлях.**

Сродкі на рэстаўрацыю і захаванне з'яўляюцца за кошт новага будаўніцтва на вольных месцах раёна і кампрамісу паміж гэтымі ўстаўкамі» і гістарычным ландшафтам.

Гэты шлях бадай што найлепшы. Давайце абмяркуем варыянт з ўшчыльненнем забудовы, і пастараемся знайсці кампраміс, які б адпавядаў патрабаванням формулы: шчыльнасць засялення = камфорт, і патрабаванням захавання аўтэнтычнасці краявідаў.

Што робяць звычайна? Звычайна забудоўваюцца прамежкі паміж сядзібнымі дамамі па чырвонай лініі вуліцы,ператвараючы асобныя будынкі ў адзін шматпад'езны традыцыйны савецкі жылы дом. Пры гэтым непасрэдна каля ўваходу для аўтамабіляў пракладваецца дарога з месцамі паркоўкі. Вуліцам таксама пакідаецца транспартная функцыя (гэта зусім дзіўна, бо заезд у двор доўгага шматпад'езнага дома усё роўна існуе толькі з аднаго боку, а густая сетка раней пракладзеных вуліц натуральна губляе транспартныя функцыі). Пасярод вялікага агульнага двара, праўда, арганізуецца рэкрэацыйная зона, да якой можна дабрацца толькі праз аўтамабільную зону. Лінейнасць арганізацыі двара на выездзе абавязкова прывядзе да дэмантажу асобных будынкаў. Ранейшая практыка паказвае, што падобны варыянт развіцця падзей найбольш рэальны і… самы страшны для Новага свету і падобных гістарычных кварталаў.

Існуе больш прадуманы падыход да камфортнай арганізацыі пражывання. Па-першае, трэба рашуча адасобіць транспартна-гаспадарчую зону ад рэкрэацыйна-жылой тэрыторыі. Стаянку аўтамабіляў і гаспадарчы двор рацыянальней усяго арганізаваць пасярод квартала (далей ад старых жылых дамоў). Праўда, у новай жылой забудовы, якая паўстане пры ўшчыльненні, будзе адна планіровачная асаблівасць: будынкі будуць пазбаўлены вокнаў на гаспадарчы двор, з-за таго яны будуць вузкія, з тэхнічнымі памяшканнямі на адзін бок. Па-другое, трэба пазбавіць вулічныя праезды транспартных функцый. Пад'езд аўтамабіляў можна арганізаваць толькі з аднаго з чатырох бакоў квартала. Гістарычныя будынкі сваімі параднымі фасадамі выходзяць якраз на вуліцу, дзе трэба арганізаваць пешаходна-зялёную прастору. Па-трэцяе, не трэба баяцца нелінейнай, камернай арганізацыі двара. Двары-калодзежы прывабна выглядаюць у будынках аднаго–двух паверхаў (да таго ж гэта у традыцыі гістарычных кварталаў Гродна).

Цяпер з матэматычных мадэляў, давайце пяройдзем непасрэдна да Новага свету.

Раён досыць разнастайны: мае неаднародную забудову як па каштоўнасці так і па капітальным стане. Ён таксама шчыльна

ўпісаны ў транзітную транспартную сетку горада[1]. Для планавання рэканструкцыі Новага свету можна прымяніць усе тры шляхі падыходаў да развіцця раёна сядзібнай забудовы. Варта разглядаць кожны квартал паасобку.

## Прапановы па пакватальнаму аднаўленню Новага свету

***Квартал вул. Бялінскага – Міцкевіча – 17 верасня***

**Гродзенскі скансен – музей горада.**

Гэты квартал з усіх у Новым свеце захаваў максімальную канцэнтрацыю лепшых узораў драўлянай сядзібнай забудовы пачатку XX ст. Менавіта яго трэба пераўтварыць у музейны і культурны цэнтр. Якраз у гэта павінны быць укладзены дзяржаўныя сродкі, у тым ліку з продажу участкаў інвестарам у Новым свеце. Найперш, праз забарону руху транспарту па вуліцах Бялінскага і 17 верасня ад вул. Ватуціна да вул. Пушкіна і ад вул. Рэйманта да вул. Астроўскага ўтвараецца натуральны пешаходны экскурсійны маршрут, які эстэтычна задавальняе наведвальніка і заахвочвае яго карыстацца з паслугаў культурных установаў, якія могуць тут быць размешчаны[2].

---

[1] Вуліца Астроўскага ўваходзіць у малое транспартнае кола вакол гістарычнага цэнтра (чатырохпалосная, без выездаў і стаянак, нават пешаходныя пераходы сінхранізаваны са светлафорамі на вул. Горкага і Дзяржынскага). Радыяльныя магістралі: завулак Віленскі – вул. Горкага і вул. Дзяржынскага на межах раёну таксама досыць добра адасабляюць Новы свет. Даезд і выезд у раён на радыяльныя накірункі забяспечваюць толькі дзве вуліцы: з поўначы – вул. Даватара, а з поўдня – вул. Міцкевіча.

[2] Напрыклад, Музей прыватных калекцый, Музей гарадскога побыту пачатку XX ст. у дамах па вул. 17 верасня №№ 13, 15, 17, 19 (можна іх будзе злучыць пераходамі), Музей прыроды і мемарыяльная экспазіцыя, прысвечаная заснавальніку гродзенскага Музея прыроды Станіславу Жыўне, які жыў доме № 9 па вул. Бялінскага, Музей палітычных рухаў і падзей міжваеннага перыяду і мемарыяльная экспазіцыя Сяргея Прытыцкага па вул. 17 верасня № 10а і інш. Кавярні, майстэрні і крамы з сувенірамі народных майстроў, кнігарні, музычныя салоны, галерэі – такую канцэнтрацыю турыстычнага прадукту ў Гродне ў аўтэнтычным гістарычным асяроддзі можна дасягнуць толькі у двух месцах: на Залатарскай (сучаснай вул. Урыцкага) і ў Новым свеце.

З усіх месцаў Новага свету квартал вул. Бялінскага – Міцкевіча – 17 верасня трохкутны і мае найменш вольнага месца пад агародамі. Але і тут можна ўшчыльніць забудову. Лепш гэта зрабіць праз перанос у гродзенскі скансен узораў драўлянага дойлідства з месцаў, дзе ім паграджае знос. Так пры пашырэнні вуліцы Будзёнага дамы № 5, № 17 варта захаваць шляхам пераноса ў адзначаны квартал (Будзёнага № 3 – на вул. Рэйманта). Дамы № 2, № 4 па вул. Чырвонаармейскай без ансамбля ў санітарнай зоне чыгункі і каля аўтавакзала і бензазапраўкі таксама павінны пераехаць у Новы свет.

Мажліва знойдуцца таксама іншыя вартыя захавання ўзоры драўлянай архітэктуры, якія размесцяцца тут.




Схема тэрыторыі і помнікаў Новага свету,
якія прапануецца далучыць да гістарычнай зоны Гродна

***Квартал вул. 17 верасня – Бялінскага – Міцкевіча – зав. Віленскі***

**Квартал элітнага жытла з інфраструктурай і скверам.**

Квартал, які з трох бакоў (вул. Горкага, Міцкевіча, Бялінскага) павінен захаваць каштоўную ансамблевую фасадную забудову, а вось забудову па вул. 17 верасня можна цалкам мадэрнізаваць. Квартал можа мець пад'езды транспарта толькі з боку вул. Міцкевіча і 17 верасня, з захаду – сквер без транспарту па вул Горкага, з усходу – пешаходная вул. Бялінскага.

У разглядаемым квартале могуць таксама размесціцца два утульныя дворыкі на розных узроўнях схілу з адкрыццём перспектывы на старажытны цэнтр, што станоўча паўплывае на прывабнасць, а таксама кошты новапабудаванага жытла. Пад'езд для будаўніцтва з боку вул. 17 верасня адкрыты, камунікацыі для старых будынкаў знаходзяцца па перыметру квартала.

***Квартал вул. Міцкевіча – 17 верасня – Дзяржынскага – мяжа СШ №10 і Пагранічнага атрада – Горкага.***

**Офісны раён з рэкрэацыйнай зонай.**

Ансамбль паўднёвай часткі вуліцы Міцкевіча парушаны пасля вайны. Таксама разбітая кампазіцыя вуліцы Дзяржынскага ў межах гэтага квартала. Складаны рэльеф, які стромка спускаецца да ручая, спрыяе выстройванню парадных фасадаў не па чырвоных лініях праезджых вул. Міцкевіча і Дзяржынскага, а ў бок маляўнічага зялёнага яра. Будаўніцтва стыльнага пешаходнага мосціка праз Юрыздзіку не толькі забяспечыць тут пешаходныя маршруты, але і вельмі ўпрыгожыць рэкрэацыйную зону ўздоўж малой рачулкі. Даліна Юрыздыкі, бясспрэчна, патрабуе добраўпарадкавання (ачыстка рэчышча, прагулачныя сцежкі, альтанкі з лавамі для адпачынку), але векавыя дрэвы яшчэ шмат дзесяцігоддзяў могуць складаць аснову рэкрэацыйнай прывабнасці гэтага аб'екта.

З архітэктурных аб'ектаў пад ахову ад разбурэння падпадаюць толькі мастацка каштоўныя дамы па вул. Міцкевіча № 13а, № 9, № 7, па вул. Горкага № 5, № 3, па вул. Дзяржынскага № 10 і ансамблевыя па вул. Дзяржынскага № 12, № 14, № 20а, № 22а, № 28, № 30.

На месцы іншых пабудоў і пустых пляцоўках цалкам мажліва будаўніцтва новых архітэктурна вартасных аб'ектаў грамадскага прызначэння. Варта звярнуць увагу на рэарганізацыю пад'ездаў і парковачных месцаў для новых праектаў на гэтай тэрыторыі. Новыя гаспадары абавязаны мінімізаваць месцы гасцявых стаянак, схаваць на цокальныя паверхі паркоўку сваіх і службовых аўтамабіляў і не забываць, што будынкі павінны быць не вышэй за тры паверхі і мець адразу некалькі парадных фасадаў.

***Квартал вул. Астроўскага – Ватуціна – 17 верасня – Горкага***

**Турыстычная зона «Залатая Горка».**

Гэта адзінае месца ў Новым свеце, дзе яшчэ адкрываецца панарама на дамінанты гістарычнага цэнтра. Краявід не засланяюць будынкі бальніцы і упраўлення сельскай гаспадаркі. Квартал амаль цалкам страціў свой даваенны ансамбль. Варта захаваць толькі паўднёвы бок раёна – забудову па вул. 17 верасня, аднавіўшы кутні дом па Горкага № 29.

Квартал патрабуе поўнай змены гаспадароў і прызначэння: перасялення прыватнага жытла, пераводу кардыялагічнай паліклінікі на іншае месца. Старую і стылізаваную забудову па вул. 17 верасня і Ватуціна варта напоўніць крамамі, кавярнямі, галерэямі. Трэба адрэстаўраваць пад гасцінічную частку рэкрэацыйнага комплексу канструктывісцкі будынак адной з паліклінік са стылізацыяй пад інтэр'еры 1930-х гг. (натуральна, трэба вярнуць яго плоскі дах).

З боку вул. Горкага адкрыецца новы комплекс будынкаў рэкрэацыйна-турыстычнага цэнтра: мінібасейн, працэдурны і трэнажорны залы ў былой паліклініцы МУС, панарамны рэстаран у глыбіні квартала на ўзгорку над старой забудовай 17 верасня. Гэта усё функцыі першага паверха. Вышэй размесцяцца гасцінічныя нумары. Адзінае абмежаванне – забудова не вышэй трох узроўняў. У глыбіні квартала размесціцца невялікі ўтульны дворык, які не варта займаць паркоўкай. Яна павінна быць падземнай з заездам з боку вул. Ватуціна паміж дзвюма цяперашнімі паліклінікамі.

*Квартал Астроўскага – Рэйманта – 17 Верасня – Ватуціна*

**Квартал старога раёна асабнякоў з ушчыльненнем забудовы і перапланіроўкай сістэмы пад’ездаў.**

Гэты квартал з трох бакоў не будзе мець выездаў (магістральная вул. Астроўскага і пешаходныя вул. 17 верасня і Рэйманта), таму трэба арганізаваць заезд з вул. Ватуціна, які б забяспечваў пад’езд да кожнага дома (асабнякі не п付ратвораныя ў камунальнае жытло, прадугледжваюць між іншым і прыватны двор). Заезд паралельны вул. Астроўскага і 17 верасня ў якасці паркінгавых месцаў будзе выкарыстоўваць пад’езды да двух новых ліній забудовы квартала і кавалак вул. Славацкага, які ўваходзіць у яго склад. З паўночнага боку квартал павінен аздобіць вул. Астроўскага лініяй шматкватэрных двух-трох павярховых дамоў арыгінальнай архітэктуры.

*Квартал вул. Астроўскага – Пушкіна – Рэйманта*

**Тэрыторыя паліклінікі з пад’ездам і рэкрэацыйнай зонай.**

У цэнтры трохкутнага квартала знаходзіцца будынак паліклінікі, які дысануе з дамамі суседніх кварталаў. Выправіць гэтую сітуацыю цяжка, хіба што «патапіць» гэты аб’ект у зеляніне. Ландшафтны дызайнер тут можа зрабіць цуд.

Асновай зоны для шпацыраў будзе пешаходная вул. Пушкіна з уздымам рэльефу ў бок паліклінікі. Трэба прыбраць буду з камунікацыямі і два дома: адзін па вул. Астроўскага, другі па вул. 17 верасня. Дом па вул. Пушкіна № 10 трэба перадаць установе, каб гаспадарчы двор не псаваў зялёнай зоны. Мажліва пашырэнне паліклінікі з будаўніцтвам корпуса не вышэй двух паверхаў паралельна вул. Пушкіна. Службовы паркінг можна пакінуць каля паўднёвага фасада ўстановы, а гасцявую стаянку размясціць па вул. Астроўскага.

*Квартал вул. Астроўскага – Дзяржынскага – 17 верасня – Пушкіна*

**Квартал старога раёна асабнякоў з мадэрнізаванымі вулічнымі фасадамі і змененай сістэмай пад’ездаў.**

Інтэнсіўны рух транспарту па вул. Астроўскага і Дзяржынскага, а таксама жаданне, каб кавалак вул. Пушкіна ў межах квар-

тала з прыгожай ясеневай алеяй і шчыльнай старой забудовай стаў пешаходным, вымушаючы, каб выезд транспарту з квартала ажыццяўляўся толькі ў бок вул. 17 верасня. Гэтую ўмову можа забяспечыць пракладка пад'езду з арганізацыяй паркавачных месцаў па цэнтру квартала над ручаём, узятым у калектар. Такое рашэнне таксама дазволіць пазбавіцца ад гаспадарчых функцый вулічных фасадаў дамоў, прыбраць загародкі, пашырыць тратуары і зрабіць гэтыя фасады, сапраўды, парадным і.

Мажліва, хтосьці з архітэктараў хацеў бы замяніць у гэтым квартале прыватную забудову на новую трохпавярховую (вышэй забараняе закон), але, думаецца, гэта не мэтазгодна. У квартале аховы заслугоўваюць толькі прыродныя аб'екты: ясеневая алея па вул. Пушкіна (9 ясеняў з аднаго бока, 13 ясеняў і ліпа – з другога), дуб каля дома па вул. Дзяржынскага, і ліпа з грушай у двары Дома саюза палякаў.

*Квартал вул. Рэйманта – Астроўскага – Славацкага – Піянерская*

**Квартал старога раёна асабнякоў з кропкавым ушчыльненнем.**

У першую чаргу квартал патрабуе яркага фасаднага акцэнта па вул. Астроўскага, сугучнага па аб'ёму з дамамі № 4а, № 6. Квартал вузкі, да таго ж яшчэ мае забудову на папярэчнай вул. Люксембург таму забудову тут не магчыма ўшчыльніць, нават калі пазбавіць тутэйшых гаспадароў прыватных двароў, кампенсаваўшы ім гэта рацыянальнай паркоўкай, цэнтралізаваным ацяпленнем і г.д. Атрымаецца збудаваць толькі 3–4 дамы агулам на 16–20 кватэр.

Таму раўназначна з вышэйапісаным развіццём падзей, выступаюць яшчэ два варыянты. Першы – апроч фасадаў па вул. Астроўскага пакінуць усё як ёсць. Другі – знесці цікавыя, але ж усё ж малакаштоўныя дамы па вул. Рэйманта 14–30, і пабудаваць на іх месцы шматкватэрныя трохпавярховыя будынкі, сугучныя і суразмерныя пабудовам няцотнага боку гэтага кавалка вул. Рэйманта. Праект рэарганізуе транспартны заезд у квартал, што дазволіць зрабіць вул. Рэйманта і Славацкага пешаходнымі. Таксама знойдзецца

дуцца сродкі прыватных інвестараў на рэстаўрацыю і захавання ансамбля будынкаў №№ 19, 21, 23, 14, 16 па вул. Славацкага. Пытанне, які з трох варыянтаў выбраць застаецца адкрытым.

***Квартал вул. Даватара – мяжа дзіцячай бальніцы – вул. Рэйманта***

**Квартал старой малапавярховай жылой забудовы, мадэрнізаванай шляхам надбудовы і арзанізацыі жылой мансарды у квартал павышанай камфортнасці.**

Квартал быў комплексна забудаваны ў другой палове 1950-х ансамблем двухпавярховых дамоў з элементамі сталінскага ампіру. Будынкі ўжо даўно патрабуюць капітальнага рамонту. Рамонт можна правесці за кошт продажу кватэр у надбудаваных паверхах. Сумарная плошча памяшканняў можа павялічыцца на 50–70 %, хаця колькасць жыхароў не больш чым на 50 %. Прывабіць інвестараў-навасёлаў можна толькі якаснай зменай камфортнасці квартала. Таму рэканструкцыя павінна праводзіцца адразу для ўсіх пабудоў шляхам поўнага высялення з далейшай частковай заменай жыхароў на больш плацежаздольных. Натуральна, адбудзецца перапланіроўка памяшканняў на кватэры большыя па плошчы. Будынкі будуць атынкаваныя, і двор будзе падзелены на рэкрэацыйную і транспартную частку.

***Квартал вул. Даватара – Піянерская – Славацкага – Астроўскага – Горкага***

**Адміністрацыйна гандлёвы цэнтр з інфраструктурай (супермаркет, ярусная стаянка, дамы спецыялістаў).**

Першапачатковая задума міжваеннага перыяду была зменена ў савецкі час. На вул. Горкага сфарміраваўся функцыяналістычны ансамбль, які варта захаваць і «удасканаліць».

Менавіта грамадскія будынкі па вул. Горкага № 49а, 49, 51 злучаныя пераходамі і новымі карпусамі з тылу ідэальна падыходзяць да пераносу з гістарычнага цэнтра органаў дзяржаўнага кіравання. Гэта спрыяюць транспартныя пад’езды, наяўнасць будынкаў, якія лёгка можна прыстасаваць пад адпаведныя мэты, наяўнасць

інфраструктуры і прасторы для яе развіцця. Архітэктурная выразнасць квартала далёкая ад дасканаласці, таму новая роля – адміністрацыйнага цэнтра вобласці – дазволіць разбудаваць раён для патрэб развіцця спецыфічнай інфраструктуры.

У першую чаргу, як звычайна, для рэалізацыі задумы не хапае парковак. Для вырашэння гэтай задачы ідэальна падыходзіць тэрыторыя сучаснага Грандзіцкага рынка. Вялікая тэрыторыя і перапад рэльефу дазваляе размясціць на двух ярусах (з боку вул. Горкага падземных) шмат машын, эканомячы на эстакадных заездах (для заезду выкарыстоўваецца вул. Даватара). На будаўніцтве паркоўкі можна эканоміць бюджэтныя сродкі, калі наземныя ярусы аддаць інвестарам пад арганізацыю гандлёвага цэнтра. Пад дамы спецыялістаў і офісныя патрэбы таксама лёгка прыстасаваць дамы па вул. Рэйманта № 42, 44, 46, Горкага № 47, а таксама тэрыторыю і пабудовы дзіцячага садзіка па вул. Астроўскага № 2.

Пры ўсіх мадэрнізацыях квартала неабходна захаваць як мастацка каштоўныя дамы па вул. Горкага № 47а і Астроўскага № 4а для падтрымання ансамбля вул. Славацкага дамы № 14, 16, а таксама прыродныя аб'екты. Маюцца на ўвазе даваенныя ліпавыя прысады па вул. Горкага-Астроўскага (22 ліпы), лістоўніцу ў двары дома па вул. Астроўскага № 4, а таксама тры дубы, якія растуць у гэтым квартале.

## Прапановы па ўнясенні частак Новага свету і асобных будынкаў у ім у спіс архітэктурнай спадчыны

Дамы з дрэва ў абывательскай свядомасці лічацца вясковым нетрывалым сегментам для беднаты, забудовай, якая не мае ні мастацкай ні прагматычнай каштоўнасці і з цягам часу пакіне горад як чужы элемент. Такія уяўленні не адпавядаюць рэчаіснасці. Драўляная забудова ва ўсе часы ў беларускіх гарадах была асновай жылых кварталаў, у тым ліку і магнацкіх рэзідэнцый. У апартаментах з дрэва цёпла, утульна і экалагічна. Адзіная істотная хіба, якая прымушае людзей звяртацца да каменя альбо цэглы, небяспека пажараў. Кожная неахайнасць магла знішчыць амаль увесь горад.

Але пры сучасных тэхналогіях супрацьпажарнай прафілактыкі і аператыўнага тушэння пажараў, практычна, няма розніцы паміж каменнымі і драўлянымі будынкамі.

Менавіта па прычыне пажару 1885 г. Гродна на пачатку XX ст. стаў самым цагляным горадам Беларусі, але і ў ім 60 % дамоў былі драўлянымі, і каля 30 % былі накрытыя гонтай альбо дранкай. І менавіта па прычыне гэта пажару ўся захаваная драўляная забудова Гродна паходзіць толькі з канца XIX ст. – першай паловы XX ст. (выключэнне – Брыгіцкі лямус, дарэчы, самы стары драўляны будынак Беларусі).

Новы свет, Пярэселка, Звярынец, Агароды, Сабачая горка, Пагулянка, Палестына – мікрараёны Гродна, якія паўсталі якраз у гэты перыяд.

У гродзенскай спадчыне драўлянай архітэктуры ёсць не толькі драўляныя хаткі, разбудаваныя ў сучасныя катэджы, але і мноства стылёвых мастацкіх прыкладаў унікальных для сусветнай архітэктуры, у тым добра захаваныя кварталы прадстаўнікоў сярэдняга класа першай трэці XX ст.

**Рускі мадэрн.** У Беларусі пакінулі адбітак адразу некалькі накірункаў гэтага стылю. У Расійскай імперыі першым найбольш пашыраным і раскручаным, натуральна, становіцца рускі стыль. У архітэктуры спачатку гэта быў механічны паўтор узораў сярэднявечнай маскоўскай архітэктуры, пазней – візантыйскія узоры. Але на рубяжы стагоддзяў гурток мастакоў у Абрамцава, які складаўся з такіх вядомых імёнаў як Васняцоў, Урубель, Малюцін прапануе сваю новую (мадэрную) інтэрпрэтацыю рускай тэмы ў архітэктуры, заснаваную на арнаментах нацыянальнага строю, фактурах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, матывах казак, операмі, карцінамі створанымі раней славянафільскім рухам.

Базавай формай для такога накірунку пошукаў у архітэктуры, натуральна становіцца рускае народнае дойлідства і дрэва, як асноўны будаўнічы, народны матэрыял. «Рускі мадэрн» у Беларусі (натуральна, са сваімі мясцовымі асаблівасцямі) атрымаў досыць вялікі распаўсюд не толькі ў будаўніцтве за дзяржаўны кошт, але і сярод простых гарадскіх і местачковых домаўладальнікаў, мажліва

па прычыне дэкарацыйнай насычанасці або звычкі запрашаць прафесійных архітэктараў. Разныя ліштвы, філянговыя дзверы і вуглы, шалёўка, падзеленая цягамі на розныя віды, нават аздобленая накладным паясом з прапілаванымі канцамі, прапілаваны падзор, фігурысты вільчык і франтон са шматлікімі паясамі і фактурай шалёўкі. Бадай, што ўвесь дэкаратыўны арсенал, які можа сабе дазволіць дрэва як матэрыял…

**Канструктывізм.** Толькі перад Другой сусветнай вайной на нашы землі прыходзіць новы сацыялістычна-дэмакратычны павеў. Гэтую з'яву называюць «функцыяналізмам», падкрэсліваючы перавагу функцыянальнага метаду ў праектаванні, або «міжнародным стылем», звяртаючы ўвагу на універсальнасць стылістычных прыёмаў, распаўсюджаных у краінах Еўропы і ЗША, у процівагу разнастайнасці эклектычнай архітэктуры. У савецкай архітэктурнай навуцы прымяняўся тэрмін «канструктывізм», у еўрапейскай – «кубізм».

У грамадскай свядомасці формы новай архітэктуры звязваліся з новымі ўяўленнямі аб вартасным побыце, з развіццём тэхнікі, якая забяспечвала зручнасць і незвычайны камфорт жыцця. Да будынкаў сталі прымяняцца патрабаванні не толькі з пазіцый функцыянальнага заніравання, але і мастацкай выразнасці, якую архітэктары імкнуліся дасягнуць шляхам камбінавання разнастайных авангардных форм і матываў, а таксама выкарыстаннем нязвыклых апрацоўчых матэрыялаў. У гэты час неверагодна ўзраслі патрабаванні да якасці будаўніцтва, сталі паўсюдна ўкараняцца яшчэ даволі рэдкія ў той час інжынерныя сістэмы, а менавіта цэнтральнае ацяпленне, водаправод і каналізацыя.

У Польшчы 1930-х гг. авангард стаў незвычайна папулярны сярод верхніх слаёў грамадства, інтэлігенцыі, таму гэты напрамак шырока прадстаўлены менавіта ў гарадской жылой архітэктуры, дзе найбольш распаўсюджаным тыпам былі асабнякі.

Прыклады канструктывізму савецкай Беларусі прапісаныя ва ўсіх зборніках архітэктуры (нягледзячы на тое, што яны маюць адзін істотны заган – сіметрычнасць. Архітэктура 1930-х гг. Заходняй Беларусі мала дзе апісана, але мае адметныя цікавыя рысы.

У Гродне, як ні дзе больш у Беларусі канструктывізм задамавіўся такой вялікай колькасцю ўзораў. Рэспектабельныя банкаўскія рэзідэнцыі на вул. Ажэшкі і Карбышава, выдатны ўзор грамадзянскай архітэктуры будынак афіцэрскага клуба (дома афіцэраў) на вул. Ажэшкі, мураваныя катэджы на вул. Батанічнай і Леніна. Толькі ў Гродне на вул. Чкалава, Асіпенкі, Славацкага можна ўбачыць цэлыя ансамблі драўляных катэджаў у стылі канструктывізму.

Мастацкая выразнасць будынкаў у стылі канструктывізму дасягаецца не праз штучнае ўпрыгожванне, а праз прыродную прыгажосць матэрыялу і асіметрыю, праз прыгажосць рацыянальнага будаўніцтва памяшканняў пад спецыфічную функцыю. Адным з базавых прыёмаў ёсць камбінаванне розных аб'ёмаў будынка. Дыяды, трыяды модуляў памяшканняў featuring рознага прызначэння гарманічна складзены ў адзін будынак, падкрэслены матывам рознага памеру вокнаў (вітрыны першага паверху і парадных памяшканняў, суразмерныя патрэбам аканіцы жылых ці рабочых памяшканняў, малыя «форткі» бытавых і гаспадарчых зон, часта лесвіца падкрэсліваецца вертыкальнай паласой шклення). Каб падкрэсліць прамакутны характар памяшканняў, дах альбо схаваны за атыкам, які проста з'яўляецца працягам сцяны, альбо мае крытычна нізкі ўхіл з бляшаным пакрыццём, які не бачна з вуліцы на блізкіх подступах да будынка. Ствараецца ўражанне плоскага даха ў маналітнага прамакутнага модуля.

Асаблівую ролю мае прырода матэрыялу. Архітэктары адкрыта захапляюцца іх прыродным колерам і фактурай. Калі базавым матэрыялам з'яўляецца цэментная тынкоўка, то яна будзе абавязкова падкрэслена шэрым з гладкімі і «матавымі» формамі, што дазваляе стварыць вартасны фон іншым дробным элементам. Калі гэта цагляная устаўка, то яна насычана цаглянага колеру, калі гэта каменны цокаль, то фактура каменя будзе уражваць «рваным» бокам, калі гэта жалезныя краты, то яны непафарбаваныя і маюць цёмную паверхню акісленай сталі высокай якасці, калі гэта шыбы вокнаў то гэта ці ярка жоўты, ці насычана зялёны, ці карычневы, а не банальна бясколерны белы.

Функцыяналізм патрабуе акуратнасці і дагледжанасці. Калі сце-

ны неатынкаваныя, то вы нідзе не ўбачыце такой ахайнай працы як кладка сцен канца 30-х гадоў ХХ ст. Драўляныя будынкі таксама ашаляваны вельмі якаснай дошкай, а драўляны асабняк на вул. Цаглянай № 10 атынкаваны. Тынкоўка, зробленая з дадаткам слюды, цудоўна захавалася да сённяшняга дня.

Выдатныя традыцыі гродзенскай архітэктуры не паспелі развіцца. Вайна і палітычныя змены надоўга адарвалі нас ад авангарду сусветнай архітэктуры.

Узоры гродзенскай драўлянай і сядзібнай архітэктуры пачатку ХХ ст. усяго вышэйапісанага стылёвага спектра (рускі мадэрн, эклектыка, неабарока (польская сэцэсія), канструктывізм) прадстаўлены максімальна толькі ў раёне Новага свету.

Ужо зараз неабходна:

**Надаць статус помнікаў архітэктуры шэрагу будынкаў у Новым свеце.**

**Унесці у ахоўную зону гістарычнага цэнтра Гродна вул. Міцкевіча, Бялінскага, 17 верасня, Рэйманта (ад вул. 17 верасня да Астроўскага), Горкага (ад вул. 17 верасня да Міцкевіча).**

## Замест помніка супермаркет?

У сярэдзіне красавіка 2011 г. больш дваццаці гарадзенскіх гісторыкаў звярнуліся да старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта С. Б. Шапіры з просьбай прыняць асабісты ўдзел у захаванні старой казармы на вул. Перамогі. Разам са зваротам да старшыні аблвыканкама гісторыкі звярнуліся ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з заяўкай на ўнясенне гэтага будынка ў спіс нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей.

У чым сутнасць праблемы? Казарма, размешчаная на тэрыторыі былога вайсковага комплексу, была ўпершыню вывучана гісторыкамі толькі два гады таму. Яе будынак быў узведзены на «гаспадарчай» тэрыторыі Гродзенскай крэпасці напярэдадні Першай сусветнай вайны. Магчыма, каля 1914 г. Якраз гэтая дата захавалася на сценках бетонных раўчукоў для стоку вады навакол будынка.

Будынак з'яўляўся галоўным аб'ектам гэтай забудаванай складамі і іншымі гаспадарчымі пабудовамі тэрыторыі. У ім размяшчалася адміністрацыя вайсковай часткі і казарма для салдат, якія абслугоўвалі склады. Гэты будынак не змяняў сваёй функцыі аж да высялення з яго вайскоўцаў на пачатку ХХІ стагоддзя.

На сценах будынка захаваліся шматлікія надпісы (выдрапаныя або нанесеныя хімічным алоўкам), пакінутыя польскімі і рускімі салдатамі яшчэ на пачатку ХХ ст. Падчас акупацыі Гродна нямецкімі войскамі ў 1915–1919 гг. у будынку ўтрымліваліся ваеннапалонныя салдаты царскай арміі. Адзін з іх нават пакінуў на сцяне надпіс «*ДА ЗДРАВСТВУЕТЪ РЕВОЛЮЦИЯ 24.XI.1917*». Гэты надпіс – адзінае ў сваім родзе ўнікальнае сведчанне аб адгалосках кастрычніцкіх падзеяў у Петраградзе.

Будынак казармы адна-, двухпавярховы з жоўтай неатынкаванай цаглянай кладкі. Ён пабудаваны ў адпаведнасці з традыцыямі вайсковага будаўніцтва Расійскай імперыі канца ХІХ – пачатку ХХ ст., для якога найбольш характэрным было выкарыстанне так званага «цаглянага стылю». Будынак казармы мае нерэгулярную сістэму планіроўкі і асіметрычную аб'ёмна-прасторавую кампа-

зіцыю. Сцены будынка ўмацаваны плоскімі лапаткамі, па вуглах і цэнтрах шчытоў – невялікія зубчастыя вежы. Пінаклі маюць матыў, тыповы для прамысловай архітэктуры мяжы XIX–XX ст. Пластыку фасадаў узбагачаюць лучковыя вокны з замкамі і зубчастымі падваконнымі ліштвамі. Магутны прафіляваны карніз таксама ўзбагачаны сухарыкамі. Нягледзячы на доўгую эксплуатацыю вайскоўцамі і запусценне апошніх гадоў, комплекс добра захаваўся. Шыфернае пакрыццё даху савецкага часу добра гідраізалюе будынкі, але затопленыя падмуркі пускаюць вільгаць уверх па сценам.



Будынак казармы пачатку XX ст.

Добрая ступень захаванасці, дэкарацыйная насычанасць аздобы, рэдкасць падобных прыкладаў у рэгіёне патрабуе для дадзенага комплексу статуса нерухомай гісторыка-культурнай каштоўнасці (найлепш II катэгорыі).

Для захавання комплексу новым гаспадарам неабходна правесці гідраізаляцыю фундаментаў, замяніць сталярку на аналагічную, аднавіць пакрыццё вежачак і карнізаў, адрамантаваць водаадводы і водастокі. Варта замяніць пакрыццё даха на бляшанае, больш адпаведнае перыяду пабудовы комплексу. Дэфекты муроў не трэба выпраўляць, але можна аднавіць замураваныя і ператвораныя ў праезды вокны. Мажлівая перапланіроўка ўнутраных памяшканняў. Будынак, безумоўна, можа быць выключна важнай дэкаратыўнай часткай гэтай тэрыторыі. У ім можа размясціцца адміністрацыя будаўнічага супермаркета, які плануецца тут збудаваць, або крама па продажы элітных будаўнічых матэрыялаў.

Аднак найбольш мэтазгодным было б выкарыстанне будынка ў якасці аб’екта культуры. Паколькі ў занёманскай частцы Гродна, практычна, адсутнічаюць установы музейнага тыпу, тут можна размясціць галоўную частку Музея вайсковай гісторыі. Гэта можа быць экспазіцыя гісторыі Гродзенскай крэпасці, пачынаючы з 1912 г. (будынак казармы – аднагодак крэпасці), экспазіцыя музея воінаў-інтэрнацыяналістаў і інш. Гэта асабліва зручна рабіць у такім будынку, бо ёсць мажлівасць на прылеглай тэрыторыі размясціць для экспанавання цяжкую ваенную тэхніку.

Разам з музеяфікацыяй аднаго з фартоў Гродзенскай крэпасці (Занёманская частка горада і бліжэйшыя ваколіцы) горад можа атрымаць унікальны экскурсійны маршрут, прысвечаны вайсковай гісторыі. Непадалёк ад будынка казармы знаходзяцца таксама Уладзімірская царква, каталіцкія і праваслаўныя могілкі, месца былога палаца Радзівілаў (сучасная вул. Гая).

Музеяфікацыя гэтага аб’екта магла б даць гораду новы цэнтр культуры.

Трэба таксама адзначыць, што на тэрыторыі комплексу ўсе транспартныя заезды былі абсаджаныя дрэвамі розных парод і фактуры. Ліпавая, таполевая, кляновая, грабавая, акацыявая алеі стваралі свайго роду сістэму адрасоў, па якіх можна было добра арыентавацца. Добра захаваліся ліпавыя і кляновыя прысады. На тэрыторыі комплексу знаходзяцца 73 ліпы, 13 клёнаў, 11 дубоў, 32 акацыі, 2 вязы, і каля палутара дзясятка таполяў. Частку дрэваў

таксама можна захаваць і стварыць на гэтай тэрыторыі рэкрэацыйную зону.

Як высветлілася, у хуткім часе на месцы казармы плануецца пабудаваць шматпрофільны супермаркет «Карона» (інвестар «Табак-Інвест»). Інвестары ўжо распрацавалі праект. Гэта стандартная



Схема з прапановамі па захаванню будынка казармы.

шчытавая канструкцыя памерам 120 на 160 метраў. У іх планы не ўваходзіць нават частковае захаванне будынка.

Між тым дастаткова толькі добрай волі, каб не руйнаваць такі цікавы помнік гісторыі.

Аналіз схемы тэрыторыі былых армейскіх складоў дазваляе прапанаваць пэўны варыянт размяшчэння супермаркета і захавання будынку казармы.

Жоўтым на схеме пазначаны каштоўныя архітэктурныя аб’екты – казарма і захаваныя маставыя. Зялёным – каштоўныя насаджэнні з колькасцю дрэваў і іх відавым складам. Чырвоным – мяркуемае месца пабудовы супермаркета (два варыянты). Сінім – прапановы па больш рацыянальнай схеме будаўніцтва. Контураў тут таксама два. Адзін варыянт прадугледжвае злучэнне супермаркета з архітэктурным аб’ектам, другі – вольную прастору мінімум у 15 метраў.

Чым насамрэч сінія варыянты лепшыя за чырвоныя?

1. Супермаркет лепш праглядаецца з вул. Гая і праспекта Янкі Купалы, што прыцягне больш пакупнікоў.

2. Замест аўтастаянкі навокал, якая патрабуе даездаў, што перашкаджаюць беспасрэднаму доступу пакупінкоў да супермаркета, фармуюцца дзве кампактныя аўтастаянкі з мінімальнымі маршамі і з аўтаномнай пешаходнай рэкрэацыйнай зонай, што дадаткова прыцягне пакупнікоў.

3. Каля супермаркета будзе знаходзіцца эфектны архітэктурны аб’ект, дадатковыя гандлёвыя плошчы і кафэ, а таксама ліпавая алея.

4. Інвестар набудзе аўтарытэт захавальніка гісторыка-культурнай спадчыны.

У заключэнне дазволім сабе выказаць некалькі заўвагаў.

Не будзем спыняцца на пытанні, ці наогул у гэтым месцы патрэбны супермаркет… Хоць можна заўважыць, што раён горада не вельмі густанаселены, а не так далёка плануецца будаўніцтва яшчэ аднаго супермаркета. Не будзем таксама спыняцца на факце, што не было ніякага грамадскага абмеркавання праекта супермаркета, а таксама на тым, што ніхто не чуў пра тэндэр на забудову тэрыторыі былога армейскага комплекса. Адзначым самае важнае.

У нашым горадзе ёсць некалькі спецыялістаў абласнога і гарадскога ўзроўню, адказных за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. Гэтыя спецыялісты павінны не толькі захоўваць тое, што ўжо ўнесена ў спісы, але і вывучаць горад і пастаянна папаўняць спісы спадчыны. Гродна – гэта не Прага з яе 30 тысячамі гістарычных будынкаў і не Вільня з 10 тысячамі. У гістарычным цэнтры горада ў шырокім сэнсе гэтага паняцця (а не так, як яго трактуе Міністэрства культуры) усяго 1200–1400 цікавых з пункта гледжання гісторыі і архітэктуры будынкаў. Страта кожнага з іх – незалечная рана для горада. Але звароты гісторыкаў аб папаўненні спіса гісторыка-культурнай спадчыны пастаянна ігнаруюцца. Так было з крамай на вул. Горкага № 29 («гарачы хлеб») у 2006 г., так было з праектам пашырэння ахоўнай зоны на раён «Новы Свет» у 2009 г. Цалкам мажліва, што так будзе і сёння.

Нагадаем, што паводле існуючага заканадаўству Міністэрства культуры наогул павінна забараніць праводзіць любыя працы, якія пагражаюць таму ці іншаму будынку, пакуль не будзе прынята рашэнне аб унясенні (або неўнясенні) яго ў спіс культурных каштоўнасцей. Будынкі ж вайсковага прызначэння, узведзеныя на пачатку ХХ ст.у нашым горадзе, сёння маюць статус нерухомай гісторыка-культурнай каштоўнасці (напрыклад, казармы 4-га сапёрнага батальёна па вул. Дзяржынскага 15, 17). Чаму б не ўнесці ў спіс спадчыны занёманскую казарму? Гэты будынак не менш цікавы па архітэктурным аздабленні і дадаткова мае незвычайную для тагачасных казармаў нерэгулярную планіроўку, што яшчэ больш павышае яго вартасць як помніка.

Законнага матыву адмовіць у тым, каб зрабіць казарму помнікам і патрабаваць ад інвестара яе захавання, няма. Але, на жаль, лёс казармы, фактычна, ужо вырашаны. А хто дасць гарантыю, што праз нейкі час такой жа самай «нечаканасцю» для чыноўнікаў, адказных за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, не стане канстатацыя каштоўнасці казармаў па вул. Шчорса або Чырвонаармейскай, захаванне якіх не будзе ўваходзіць у планы чарговага інвестара-забудоўшчыка?

*harodnia.com*

# Зялёны свет Гродна

## Маніторынг стану дрэваў каштоўных гатункаў

*Ігар Лапеха (Гродна)*

Прайшло ўжо два гады з апісання сітуацыі з гродзенскімі дрэвамі каштоўных гатункаў (ліпы, дубы, клёны, каштаны, грабы, лістоўніцы і г.п.), старэйшымі за 70 год. Вынікі гэтай працы былі апублікаваны ў папярэднім нумары «Горада Святога Губерта»*. На 1 мая 2008 г. на нашым уліку знаходзілася 822 ліпы, 42 дубы, 189 клёнаў востралістных, 8 клёнаў серабрыстых, 14 клёнаў псеўдаплатанавых, 238 ясеняў, 124 грабы, 33 каштаны, 4 вязы, 4 грушы, 4 лістоўніцы, 4 туі, 3 елкі.

Як выглядае сітуацыя з захаваннем дрэваў на 1 мая 2010 г.?

За два гады было высечана з дазволу гарадскіх уладаў 43 ліпы, 10 клёнаў вотралістных, 1 клён серабрысты, 49 ясеняў, 3 грабы, 1 дуб. Калі тэмпы знішчэння застануцца нязменнымі, то дрэвы каштоўных гатункаў у Гродне знікнуць праз 30 год.

Давайце прааналізуем працэс вырубкі больш дэталёва.

**Вырубкі, не абгрунтаваныя ніякай рацыянальнай прычынай:**

Тэлеграфны завулак – 5 ліпаў, 3 грабы.

«Юрыздыка» (даліна паміж вул. 17 верасня і школай № 10) – 4 ліпы.

Раён школы № 1 – 6 ліпаў, 3 клёны, ясень.

Раён Архірэйскага падворка – 2 клёны, ясень, дуб.

Раён бальніцы № 1– 4 ліпы.

Фабрыка марожанага (вул. Гарнавых) – 1 ліпа.

Станіслававова – 2 клёны, 2 ліпы.

**Вырубкі, абумоўленыя нежыццяздольнасцю дрэваў**

Вул. Савецкіх пагранічнікаў, № 33 – ліпа, якая засохла ад пракладкі цеплатрасы,

---

* Лапеха Ігар. Як спыніць чыноўніка з сякерай // Горад Святога Губерта. Гродна, 2008. № 4. С. 105–114.

Каложскі парк (на тэрасе каля Каложы) – самы стары у горадзе клён, які быў пашкоджаны ветрам. Замест таго, каб абрэзаць і захаваць унікальны для горада «зялёны аб'ект», клён быў спілаваны.

Сквер на месцы Фары Вітаўта – ліпа, якая нахілілася у бок тратуара.

Стары парк і даліна Гараднічанкі – 4 клёны, 44 ясені, ліпа. Ясені і ліпа засохлі пасля знішчэння паверхневай каранёвай сістэмы падчас будаўнічых работ, а клёны былі зламаныя ветрам пасля змен паветраных плыняў у выніку спілоўвання ясеняў.



Стары каштан на вул. Рэпіна.



«Юрыздыка» да «ўпарадкавання».



«Юрыздыка» пасля «ўпарадкавання».



Вырубка парка ў Станіславова.

**Вырубкі, абумоўленыя будаўнічымі працамі**

Вул. Астроўскага, № 2-4 – 5 ліпаў.

Вул. Рэйманта (алеі на тэрыторыі бальніцы) – 10 ліпаў.

Вул. Брыкеля – ліпа пры будаўніцтве новага дома (На Дзевятоўцы наогул засталіся толькі 3 старыя дрэвы, якіх «ахоўваюць» могілкі).

За мінулыя два гады наш горад тэрытарыяльна павялічыўся у 3 разы. На новых тэрыторыях таксама растуць дрэвы, якія таксама павінны быць унесены ў наш спіс. У прыватнасці, горад узбагаціўся вялікай колькасцю дубоў, вялікай колькасцю ліпаў, грабаў ды інш. Асаблівасць далучаных да горада тэрыторый у тым, што на іх амаль адсутнічаюць пасадкі дэкаратыўных дрэваў савецкага часу. «Зялёныя аб'екты» маюць тры крыніцы паходжання: прысады былых вясковых вуліц (досыць малая колькасць), пасадкі на могілках (таксама малая колькасць) і паркавыя прысады былых фальваркаў (базавая колькасць). Нагадаю, што ў інвентар запісваюцца толькі

стойкія віды дрэваў, якія доўга растуць (200-600 год), акрамя хваёвых пралескаў. Інвентар не падлічваў колькасць даваенных таполяў, бяроз, вярбы, вольхі, пладовых дрэваў, клёна ясенялістнага з-за іх хуткага старэння ў гарадскіх умовах (80 год для гэтых дрэваў – глыбокая старасць).

Такім чынам, пры падліках агулам у нас атрымалася 545 ліпаў, 167 дубоў, 55 грабаў, 87 клёнаў, 27 ясеняў, 5 каштанаў, 2 лістоўніцы. Для зручнасці аналізу новыя тэрыторыі падзелены на пяць рэгіёнаў.

**Панямунь – 50 грабаў, 32 дубы, 192 ліпы, 59 клёнаў, 6 ясеняў.**

Найбольш каштоўным прыродным паркавым комплексам Гродна без ваганняў трэба лічыць не Румлёва, а пакінуты без гаспадара і забыты колішні каралеўскі маёнтак Панямунь. Калі б не мэта перапісаць усе старыя дрэвы ў горадзе, то і я, напэўна, ніколі б не ацаніў бы ўсёй грандыёзнасці, унікальнасці задумы старажытных ландшафтных дойлідаў, не даведаўся б пра высокую ступень захаванасці старога парка, не пераканаўся б у мажлівасці рэанавацыі гэтага прыроднага комплексу.

Канешне, сітуацыя жахлівая… Панямунь цяпер – гэта дэградаваная прамысловая зона з невялікім прыгарадным пасёлкам, якая аддадзена на водкуп адміністратарам розных кантор і фірм, якія там функцыянуюць. Па суседству знаходзяцца магістраль, гаражы і лецішчы. Іх гаспадары засмецілі свае ўнутраныя тэрыторыі і засвойваюць новыя абшары.

«Зялёныя аб’екты»:

Дарога ад магістралі да канторы РСТ – 48 грабаў, 2 дубы, 15 ліпаў, 4 клёны.

Тэрыторыя тэхнічнага двара РСТ (каля капліцы) – 3 ліпы, 2 дубы, на схілах дубовы, грабавы і вязавы самасей.

Тэрыторыя канторы РСТ – 14 ліпаў, 1 ясень.

Плато сядзібы – 97 ліпаў, 17 клёнаў, 2 грабы, дуб, 5 ясеняў. На ўсходзе – яр, парослы ліпавым, грабавым і ясеневым самасеям.

Усходні яр – 26 дубоў, 2 ліпы, 18 клёнаў. Таксама дубовая альтанка, кляновая алея, грабава-ліпавы падростак.

Сярэдні яр – 2 ліпы, дуб, 16 клёнаў.

Заходні яр вышэй насыпу – 23 ліпы.

Заходні яр ніжэй перакопу – 36 ліпаў, 4 клёны.

**Поўнач – 69 дубоў, 96 ліпаў, 4 грабы, 7 ясеняў, 11 клёнаў, 2 каштаны**

Перад Лапенкамі (вул. Асфальтавая, № 4) – 10 дубоў, 9 ліпаў (альтанкай), 4 грабы.

Лапенкі – 6 ліпаў.

Дубрава (хутар) – 7 дубоў, 3 ліпы.

Дубрава – 44 дубоў, 8 ліпаў.

Аўтобусны прыпынак «Зарыца» – 7 дубоў, 5 ліпаў.

Зарыца – дуб, 16 ліпаў.

Грандзічы – 23 ліпы, 5 ясеняў, клён.

Грандзічы (фальварак) – 13 ліпаў, 10 клёнаў, 2 каштаны, 2 ясеня.

Грандзічы (касцёл) – ліпавая алея з 17 дрэваў.

**Усход – 111 ліпаў, 11 клёнаў, 4 ясеня, 37 дубоў**

Падкрыжакі – 2 ліпы, клён.

Астравок – 6 ліпаў, 2 ясені (захаваліся стайні і барак пачатку XX ст.)

Кульбакі – дуб, 3 ліпы, 2 клёны, на могілках 2 дубы і трохстволы дуб.

Забалаць – гай і прысады на 30 дубоў, алея з 17 ліпаў, 7 клёнаў, дуб, шпалера з 24 ліпаў і прысады з 17.

Чашчаўляны – 6 ліпаў, 2 ясені, дуб.

Малышчына – 3 ліпы, дуб.

Русота – прысады 33 ліпы.

**Захад – 14 дубоў, 70 ліпаў, лістоўніца, 10 ясеняў**

Ласосна – дуб (каля помніка), 4 ліпы, 3 дубы (каля школы), дуб (у прамысловай зоне).

Дзмітрыеўка – 13 ліпаў, 2 дубы, лістоўніца.

Новікі – ліпа каля ракі.

Баранавічы – па старой дарозе на Сапоцкін – 44 ліпы; фальварак

(паміж Баранавічамі і Адамавічамі) – 5 дубоў, 2 ліпы; фальварак (у Баранавічах) – 2 дубы, 10 ясеняў, 6 ліпаў.

**Поўдзень – 76 ліпаў, граб, 6 клёнаў, 15 дубоў, 3 каштаны, лістоўніца**

Калбасіна (прысады былога фальварка) – 29 ліпаў, граб, акацыі.

Калбасіна (прамысловая зона) – шпалера з 15 ліпаў.

Скамарошкі (пры дарозе) – вербы, брук, бутавая гаспадарчая пабудова, 5 клёнаў.

Фабрычны – дуб.

Малахавічы – 6 ліпаў.

Вішнявец – 5 ліпаў, 3 каштаны, лістоўніца, клён, дуб.

Солы – 10 дубоў, 9 ліпаў, яшчэ 3 дубы ў полі (Межы былой вёскі Солы і лесапарку Румлёва умоўны. Больш рацыянальна Солы і грабовец за вёскай далучыць да лесапарку).

Сітуацыя з помнікамі прыроды ў Гродне ў нечым унікальная. У нас прыродны помнік толькі адзін (і тое мясцовага значэння) – гэта Румлёва. І мы добра ведаем, як па-дзікунску абыходзяцца з ім апошнім часам улады і будаўнікі?!

Калі ж звярнуцца да еўрапейскіх нормаў захавання помнікаў прыроды або да досведу іншых беларускіх гарадоў, то разумееш, што ў Гродне пытаннем надання статуса помнікаў прыродным аб’ектам ніхто не займаецца. Між тым дрэваў вартых аховы ў нас больш, чым у іншых гарадах Беларусі.

Хацелася б прапанаваць свой праект спісу помнікаў прыроды ў Гродне.

Калі разважаць аб крытэрыях гэтага спісу, акрамя, натуральна, старажытнасці аб’екта, першым з маркёраў хацелася б адзначыць ансамбль. Маю на ўвазе ландшафтныя пасадкі – паркі, прысады, якія добра захаваліся, і да нашага часу выконваюць сваю дэкарацыйную і рэкрэацыйную функцыі. Гэта манастырскія сады (амаль не захаваліся), дрэвы ў парадных дварах магнацкіх рэзідэнцый (цяпер адзінкавыя дрэвы), паркі і ўязныя алеі прыгарадных фальваркаў.

З гэтага шэрага аб'ектаў найбольш ацалелымі і вартымі статуса помніка **рэспубліканскага** (**тлустым шрыфтам**) і *мясцовага (курсівам)* значэння з'яўляюцца :

– **Румлёва**

– **Панямунь** (50 грабаў, 32 дубы, 192 ліпы, 59 клёнаў, 6 ясеняў)

**– Станіслававова** (захавалася толькі 130 даваенных дрэваў)

**– Дубрава** (44 дубы, 8 ліпаў)

– **Дубрава хутар** (7 дубоў, 3 ліпы)

– Вакол Архірэйскага падворку па вул. Горкага – 12 клёнаў, 27 ліпаў, 9 ясеняў, 2 каштаны, **5 дубоў.**

– Аўгустовак (22 ліпы, дуб, 6 клёнаў, 3 каштаны, 6 грабаў), **3 каштаны з апрацаванай кронай**

*– Шынамантаж – ліпа (каля высакавольтнай апоры) і 2 грабавыя кусты былой шпалеры.*

*– Паміж Белкардам, вул. Гая і Купалы – 82 ліпы, 34 клёны, 21 граб, 32 акацыі, 2 вязы.*

*– Каля асабнякоў па вул. Парыжскай Камуны – 69 грабаў (шпалерамі).*

*– Тэлеграфны завулак – 27 грабаў (шпалерай), каштан.*

Акрамя прыродных ансамбляў у Гродне ёсць адзінкавыя дрэвы, якія сваім узростам, мемарыяльнасцю паходжання, рэдкасцю гатунку таксама павінны трапіць у спіс.

Да пашырэння горада у Гродне расло 42 даваенныя дубы. У спіс павінны трапіць найбольш адметныя:

– імянныя дубы: **Францысканскі дуб** каля Францысканскага кляштара (самае старое дрэва горада), **2 Каралеўскія дубы** (на Новым замку), **2 Бернардынскія дубы** і *адзін Баніфрацкі (на вуліцы Парыжскай Камуны), Брыгіцкі дуб.*

*– раскідзістыя дубы старэйшыя за 200 год: вул. Траецкая, № 37 – 1 дуб, ТЭЦ № 1 – 1 дуб, вул. Сацыялістычная, № 28а – 2 дубы, за будынкам Гарадскога выканаўчага камітэту – 2 дубы, праспю Касманаўтаў, № 6б – 1 дуб, вул. Астроўскага, № 4 – 1 дуб, бальніца № 1 – 1 дуб, Вішнявец – 1 дуб, могілкі на 2-м завулку Дзяржынскага – 3 дубы, Кульбакі (на могілках) – 2 дубы.*

– дубы з унікальна сфарміраванай кронай: **трохстволы дуб на Кульбакаўскіх могілках, і дуб каля Дома культуры.**

У Кіеве каштан стаўся сімвалам горада. Але ў сталіцы Украіны засталося толькі два даваенных каштаны. У Гродне іх 38. Прынамсі 14 з іх павінны трапіць у спіс помнікаў прыроды:

– **3 каштаны з апрацаванай кронай па вул. Рэпіна.**

**– каштан пасаджаны Элізай Ажэшкай** (адзінае, што засталося ад яе аўтэнтычнага дома).

– *6 Сафіеўскіх каштанаў (сквер на месцы Фары Вітаўта)*

– *3 магутныя каштаны ў горадзе (Юрыздыка, схіл за домам па вул. Дзяржынскага, № 14,*

*раскідзісты каштан па Тэлеграфнаму завулку).*

Таксама ў спіс трэба ўключыць:

– *2 клёны серабрыстыя (вул. Рэйманта, № 15-39).*

**– 12 клёнаў платаналістных (вул. 17 верасня).**

– *туевы куст з елкай (вул. Міцкевіча, № 13а).*

Спіс каштоўных дрэваў Гродна адкрыты для абмеркавання. Мажліва хтосьці з чытачоў прапануе вядомыя яму аб’екты зялёнага свету, вартыя ўнясення ў спіс помнікаў прыроды.

Увогуле гэты матэрыял пісаўся дзеля таго, каб наш горад заставаўся камфортным, зялёным і прыдатным для жыцця нашчадкаў. Спадзяемся, што нашыя напрацоўкі зацікавяць гэзв ««адказных асобаў» і абудзяць да дзеянняў грамадскасць. Каб нам лёгка дыхалася, прыемна глядзелася і радасна жылося...

# СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

## Спроба лакалізацыі пабудоваў Гарадніцы і Кунстава пры дапамозе планаў XVIII – першай паловы XX ст.

*Ігар Лапеха (Гродна)*

На працягу 2010 года ў афіцыйных сродках масавай інфармацыі некалькі разоў з'яўляліся паведамленні аб планах гарадскіх уладаў у сферы пераўтварэння даліны рэчкі Ласасянкі (Ласосны) і Румлёўскага парка ў паўнавартасныя рэкрэацыйныя зоны. Наколькі ўдалым акажацца гэты намер сёння меркаваць цяжка, але не выклікае сумненняў, што распрацоўшчыкі планаў «облагораживания» выключна важных абшараў нашага горада не стануць папярэдне вывучаць гістарычныя дакументы, і ў сваёй дзейнасці будуць кіравацца выключна ўтылітарнымі патрэбамі сённяшняга дня. Дарма, бо наяўныя гістарычныя сведчанні (найперш планы і дакументы), дазваляюць нам выдатна ўявіць, як выглядалі гэтыя мясціны 200 гадоў таму.

Аўтару гэтага тэкста раней ўжо прыходзілася ўздымаць праблему падыхода гісторыкаў да праблемы прывязкі гістарычных аб'ектаў да канкрэтнага месца[1]. Пры вывучэнні і апісанні страчаных будынкаў, гісторыкі зрэдку аналізуюць графічныя крыніцы (найперш планы) з тапаграфічнай дакладнасцю ці наладжваюць экспедыцыі на вывучаемую мясцовасць, дзе часам можна знайсці выключныя сведчанні мінулага.

Захаваўся цэлы шэраг графічных крыніц па гісторыі нашага горада, якія могуць дапамагчы ў археалагічных пошуках старажыт-

---

[1] Лапеха І. Лакалізацыя архітэктурных дамінант Гродна XVI ст. паводле малюнкаў Ганса Адэльгаўзера і Томаша Макоўскага // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі. Зборнік навуковых артыкулаў. Гродна: ГрДУ, 2009. С. 195-201.

ных аб’ектаў, а таксама ў даследаваннях горадабудаўнічай гісторыі Гродна. Напрыклад, гродзенскім краязнаўцам добра вядомы план Кунстава (або Кунштата[2]). Мэтаю гэтай апошняй грандыёзнай задумы Антонія Тызэнгаўза была пабудова прамыслова-жылога раёна Ласосна-Фолюш. Найбольш поўным падсумаваннем дасле-



План Кунстава.

[2] У перакладзе з нямецкай мовы – дзівосны горад.

даванняў па вывучэнню гэтага плана, з'яўляецца работа гісторыка архітэктуры Ігара Трусава «Дзейнасць Антонія Тызэнгаўза ў Ласосне»[3]. Даследчык даказаў, што Кунстава, гэта праект, які не застаўся на паперы, а быў часткова рэалізаваны. Прынамсі 15 аб'ектаў былі пабудаваныя і дзейнічалі. На жаль, Ігар Трусаў не падаў дакладнага размяшчэння гэтых пабудоў і не паспрабаваў накласці план Кунстава на тэрыторыю Ласосна-Фолюш.

Між тым гэта цалкам магчыма зрабіць. Існуюць такія «кропкі-маркёры», як суток Нёмана і Ласасянкі і чатыры млыны, рэшткі якіх захаваліся. Пры іх спалучэнні надзіва дакладна супадае рэльеф на старадаўнім плане і на сучаснай карце, а гэта дазваляе паспрабаваць лакалізаваць усе 15 пабудаваных за часы А. Тызэнгаўза аб'ектаў. Напрыклад, на схеме 1807 г., якую ў сваёй працы таксама прыводзіць Ігар Трусаў, прагглядаюцца мануфактуры з палацам адміністратара[4]. Яны лакалізуюцца на ніжнім плато Ласасянкі, якое пазней займала вёска Дзімітраўка. На гэтай тэрыторыі былі пабудаваныя пераправы праз раку і сілавыя механізмы млынарскага тыпу, якія абслугоўвалі прамысловы працэс. Некаторыя з іх супадаюць з пераправамі праз Ласасянку і пабудовамі на узбярэжжы (напрыклад, спуск з вул. Лізы Чайкінай паміж гаражамі да шматсекцыйнай пераправы, пераправа на спуску уздоўж мяжы былой вайсковай часткі, побач з якой зараз пракладзены водаправод, падмуркі свінарніка вайсковай часткі).

Работнікі мануфактур павінны былі дзесьці жыць і апрача прамысловай зоны была часткова пабудаваная жылая зона. Хутчэй за ўсё, гэта месца, на якім захавалася старая трасіроўка вуліц-дарог, ніжняе правабярэжнае плато Ласасянкі, якое раней займаў шпіталёва-памывачны комплекс вайсковай часткі. Звяртае на сябе ўвагу дакладнае супадзенне трасіроўкі вул. Запруднай і Ласосна з канфігурацыяй аднаго з двароў на плане часоў А. Тызэнгаўза. Цікава, што восевая перспектыва, закладзеная праектантамі яшчэ ў XVIII ст.(ад Палаца адміністратара да храма) праглядаецца і цяпер

[3] Trusow I. Działalność Tyzenhauza w Łosośnej // Rocznik Grodzieński. 2008, № 2. S. 77-82.

[4] Тамсама. S. 81.

(на самай высокай кропцы рэльефу, якую павінен быў займаць храм, з савецкага часу стаіць водацяжная вежа).

Цяпер тэрыторыя вайсковай часткі адышла да горада і новы жылы мікраараён патрабуе абсталяванай зоны адпачынку. Чаму б не аднавіць старыя запруды з маляўнічымі ставамі? Чаму б не пабудаваць новыя паркавыя павільёны, рэстараны, крамы ў канфігурацыі Кунстава (Кунштата)?

Дзеля лакалізацыі аб'ектаў можна выкарыстоўваць не толькі такія дакладныя схемы, як план Кунштата, але і больш раннія графічныя прыклады, дзе прапорцыі часцяком парушаныя, дзе на схему часам увогуле накладзены пазамаштабныя малюнкі. Затое на падобных схемах заўсёды будуць дакладнымі колькасць і чарговасць (што за чым ідзе) аб'ектаў. Так, дзякуючы колькасці яроў на левым беразе Нёмана можна досыць моцна звузіць тэрыторыю лакалізацыі занёманскага гродзенскага «замка» Радзівілаў. Нам вядома толькі, што гэта быў двухпавярховы мураваны будынак з двума флігелямі. Аналіз рэльефу на сучасных картах, прывязка кропкі да знаных маркёраў (аб'екты на супрацьлеглым беразе Нёмана, край яра) дазваляе сцвярджаць, што комплекс знаходзіўся на ўсход ад усходняй мяжы тэрыторыі прадпрыемства «Белкард», на поўдзень ад цепла- і водацяжнай трасы, якая ідзе па верхняй тэрасе паралельна Нёману, на захад ад шматпавярховых дамоў, і ў 50 метрах на поўнач ад будынкаў Кастрычніцкага РАУС.

Тэма забудовы Гродна часоў Тызенгаўза не будзе поўнай, без лакалізацыі пабудоў Гарадніцы. За аснову была ўзятая дакладная тапаграфічная схема горада 1931–1932 г. землямера Аўгустынка, на якую былі нанесеныя чырвоным колерам контуры пабудоў пасляваеннага часу. На «базу» была накладзена схема Гарадніцы часоў А. Тызэнгаўза, якая фігуруе ў працах Ігара Трусава. Атрымалася рознакаляровая схема, на якой

**Чорным** – паказаныя ўсе лініі і рысы (контуры будынкаў, межы вуліц і уладанняў, рэльеф), якія фігуруюць на схеме 1932 г.,

**Чырвоным** – паказаныя контуры пабудоў пасляваеннага часу,

**Салатавым** – пазначаныя будынкі, якія былі ўзведзеныя да 1885 г. і захаваліся,




pawet.net

**Сінім** – пазначаныя будынкі перыяду 1885–1939 гг., якія захаваліся,

**Аквамарынавым** – пазначаныя будынкі перыяду 1885–1939 гг., якія не захаваліся,

**Жоўтым** – пазначаныя будынкі, якія фігуруюць на схеме А. Тызэнгаўза, і былі знішчаныя пасля 1932 г.,

**Ружовым** – пазначаныя будынкі, загародкі, накірункі, якія фігуруюць на схеме Тызэнгаўза, і былі знішчаны да 1932 года,

**Блакітным** – пазначаны канал, які фігуруе на схеме А. Тызэнгаўза.

Схема дазваляе не толькі разгледзець дакладнае месца страчаных аб'ектаў часоў Тызэнгаўза, але таксама дапамагае адказаць на цэлы шэраг важных пытанняў. Напрыклад, якія пабудовы Гарадніцы XVIII ст.былі знішчаныя ўжо ў савецкі час? На схеме яны пазначаныя жоўтым колерам. Гэта не толькі добра вывучаныя і апісаныя будынкі корчмаў і праўленне мануфактур, але таксама карэтная фальварка, дом садоўніка, адна з двух фабрычных афіцын, дзве кузні. З 30 басняцкіх дамоў у савецкі час былі знішчаныя не толькі 9 на вул. Ажэшка, але і цэлы шэраг (каля 8) на вул. Сацыялістычнай (адзін з іх праглядаецца на ніжняй мяжы схемы).

У верхнім левым куце жоўтым колерам заштрыхаваны будынак, які фігуруе на схемах ужо з пачатку XIX ст.Ён напэўна знаходзіўся ў сістэме пабудоў Гарадніцы, але ягонае прызначэнне неведомае. Гэты дом наводзіць на разважанні, што не ўсе пабудовы таго часу дакладна адпавядалі плану Тызэнгаўза. Некаторыя аб'екты (пазначаныя ружовым колерам), магчыма, увогуле не былі пабудаваныя.

Затое дакладна можна сцвярджаць, што была зробленая водная сістэма, якая самацёкам забяспечвала батанічны сад вадой. Аснову сістэмы складаў канал шырынёй каля 2 метраў, берагі якога, хутчэй за ўсё, былі выкладзены цэглай. Канал быў пабудаваны гарызантальна на вышыні 120–121 метр ад узроўню мора, а з Гараднічанкай вектар канала злучаўся каля «Старога млына», там дзе рэчка перасякала сучасную вул. Ціміразева. Зігзаг канала, які бачны на карце 1932 г.

(сцёкавы адвод у Гараднічанку) сфарміраваўся, калі канал ужо эксплуатаваўся як каналізацыя.

Узровень люстэрка вады ў сажалках заапарка цяпер складае 118 метраў, а гэта сведчыць, што млын, які быў разбураны некалькі гадоў таму, існаваў яшчэ пры Тызэнгаўзе (зразумела, што гэта быў не той будынак, які разбурылі ў 2008 г.). Запруда ўздымала узровень вады на 2–2,5 метры, што дазваляла не толькі напаўняць канал вадой, але і ўтварыць у балоцістай даліне Гараднічанкі цэлы шэраг сажалак для гадоўлі рыбы, які цягнуўся ажно да самага Станіслава. Хтосці можа запярэчыць, што сучаснае пакрыццё вуліцы Ціміразева не дацягвае да такой вышыні. Справа ў тым, што драўляная гаць-плаціна (рэшткі яе аўтар бачыў падчас будаўнічых працаў на рагу вул. Ціміразева і 17 верасня) пасля таго, як сістэма перастала функцыянаваць, паступова развалілася. Між тым гэтая сістэма дазваляла не толькі забяспечваць вадою расліны ў батанічным садзе і жывёлу ў фальварку, але ўтрымліваць на Гарадніцы фантаны вышынёй да 2-х метраў.

Спадзяюся, што прапанаваная схема зацікавяць даследчыкаў даўніны, археолагаў і архітэктараў і дапаможа адным зрабіць шмат адкрыццяў ужо пад зямлёю, а другім яшчэ раз задумацца над выкарыстаннем гістарычных звестак ва ўласнай працы.

# От «Пушкина» до «Зарницы». Неманское судоходство в послевоенные годы

*Виктор Саяпин (Гродно)*

После освобождения Гродно от немецкой оккупации. одной из важных задач в жизни города стало восстановление речного флота на Немане[1]. Для этих целей в сентябре 1944 г. в Неманском военно-восстановительном управлении Народного комиссариата речного флота СССР, которое находилось в Каунасе, были созданы комплексные отряды. Границы деятельности Гродненского отряда были определены по реке Неман от верховьев и до местечка Друскеники, включая Огинскую систему и Августовский канал. Исполняющим обязанности начальника отряда был назначен Яков Ангелуц[2].

Работы у отряда был непочатый край. Как писал в газете «Свободная Белоруссия» 28 сентября 1944 г. главный инженер отряда А. Пельмяков, «много пришлось поработать коллективу нашего восстановительного отряда, пока Гродненский речной порт был приведен в порядок. За годы немецкой оккупации хозяйство здесь было почти полностью разрушено, суда затоплены, оборудование их испорчено, инструменты расхищены».

Главной задачей отряда являлось поднятие затопленных судов. К концу сентября было поднято пять барж и теплоход «Боец». Подготовлены к эксплуатации 6 барж, полностью отремонтированы пароходы «Пушкин», «8-е марта», «Техник».

Отдельная группа рабочих была занята углублением и очисткой дна Немана от частей взорванных оккупантами мостов. В результате уже в конце сентября было открыто грузовое движение на участке реки Неман от Гродно до устья Августовского канала,

---

[1] Автор выражает благодарность Сергею Астаповичу и Алексею Гайдуку в подборе материалов для данной публикации. Использованы фотографии из коллекций С. Астаповича, Ф. Ворошильского, В. Выдерко, А. Гайдука, В. Саяпина, Л. Щеглова, а также интернет-ресурса old.grodno.net.

[2] Государственный архив Гродненской области (ГАГО). Ф. 883, оп. 2, д. 1, л. 1-2.

а с середины октября на участке от Гродно до устья Щары и от устья Августовского канала до Друскеник[3].

В связи с реорганизацией органов речного флота в Неманском бассейне произошла передача всего хозяйства во вновь организованное Управление Неманского речного пароходства. Приказом его начальника от 31 марта 1945 г. в Гродно были организованы: а) Гродненская пристань Неманского речного пароходства с границами ее деятельности по реке Неман от истока до Меркине, река Щара, Огинская шлюзовая система, Августовский канал до госграницы со всеми притоками; б) Гродненские механические мастерские с подчинением их в административном отношении Гродненской пристани; в) Гродненский технический участок с границами водных путей и хозяйством практически как и у Неманского речного пароходства. Кстати, в состав Неманского речного пароходства входили: порты Каунас, Калининград, речная пристань Клайпеда, пристани Гродно, Вильнюса, Советска и некоторые другие.

До окончания войны на сотрудников пристани распространялись жесткие законы военного времени. Например, в мае 1945 г. три сотрудника пристани за нарушение трудовой дисциплины (самовольные отлучки и невыходы на работу) были приговорены Военным трибуналом Белостокской железной дороги к 10, 5 и 3 годам исправительных лагерей[4].

Приведем статистические сведения из «Объяснительной записки к годовому отчету за 1945 г. по пристани Гродно Неманского речного пароходства»:

«Немецкие оккупанты нанесли большой ущерб пристани Гродно и ее приписному флоту, поэтому к началу 1945 г. восстановление хозяйства закончено не было. С момента изгнания немцев с нашей территории, т. е. с июля 1944 г. по 1 января действующий Военно-восстановительный отряд смог выполнить план по восстановлению всего от 4 до 60 %. Зимний судоремонт 1944–45 гг. прошел весьма неудовлетворительно, план по судоремонту был выполнен

---

[3] Свободная Белоруссия от 28.09.1944 г.

[4] ГАГО. Ф. 883, оп. 1, д. 1, л. 1, 3, 6.

всего на 50–60 %. Несмотря на это флот был пущен в эксплуатацию и, как правило, в силу плохого ремонта, не мог работать».

В это время рейсы по Неману совершали пароходы «Пушкин», «Летувайте», «8 марта», теплоходы «Краснофлотец» и «Техник» и один газоход. Всего за навигацию они совершили 204 рейса.

Зимой 1945–1946 г. пароходы были отремонтированы. В марте началась комплектование экипажей. Команду парохода «Летувайте» (всего 12 чел.) возглавил капитан Бривач П. А., «Карла Либкнехта» (10 чел.) – капитан Сидорович И. И., «Краснофлотца» (4 чел.) – капитан Андрушкевич А. О., «Пушкина» (13 чел.) – капитан Бобрик В. Л. Были укомплектованы также экипажи барж: баржи «Пасалтонис» (3 чел.) – шкипер Копытский М. М, «Гунда» (3 чел.) – шкипер Гапон Н. С. «Армена» – шкипер Патонич С. К. «Мариамполь» (3 чел.) – шкипер Семенчук И. П., баржа-парома № 166 в Гродно (5 чел.) – капитан Пилец И. М.[5]

Целый ряд судов носят литовские названия. После того, как Литва оказалась в составе СССР эти суда, вероятно, стали приписным флотом созданного Неманского речного пароходства и перед самой войной могли находиться в Гродно. Согласно С. Астаповичу, в 1938 г. владельцем баржи «Pasaltuonis» был Довыдас Панеминскис из Юрбарка, «Armena» была во владении Меерса Пранкай из Вилькии, баржей «Marijampole» владел Абелис Мекленбургас из Гелгаудишке. Баржа «Гунда», вероятно также бывшая литовская. Историю парохода «Летувайте» узнаем ниже.

Приказом начальника Неманского речного пароходства были установлены пассажирские линии Гродно-Свентоянск и Гродно-Лунно, которые обслуживались пароходами «Летувайте», «Боец» и «Карл Либкнехт». Пароход «Пушкин» обслуживал линию Гродно-Мосты. 18 апреля в связи со сдачей в эксплуатацию парохода «Зоя Космодемьянская» был укомплектован его экипаж, капитаном которого назначен Сушко С. П. Также укомплектован был и экипаж парохода «8 Марта» в составе 9 чел. (капитан Янушайтис И. О.)[6].

[5] Там же. Д. 7, л. 27-29.
[6] Там же. Л. 39, 41.

10 июля 1946 г. в докладной на имя заместителя начальника Неманского речного пароходства начальник пристани Гродно Рудаков В. Н. подробно излагал состояние дел пристани:

«I. Итоги зимнего судоремонта. К началу навигации был готов к эксплуатации из буксирного флота: пароход «Пушкин» – 45 сил, из пассажирского флота пароход «Летувайте» – 35 сил и пароход «Карл Либкнехт» – 20 сил. 17 апреля в распоряжение пристани Гродно из Каунаса прибыл п. х. «Зоя Космодемьянская». П. х. прибыл в неисправном техническом состоянии, к эксплуатации по существу непригодным, был поставлен на ремонт. Затратив 995 ч/часов и 3901 р. выпустили в эксплуатацию.

II. Условия плавания в Гродненском участке реки Неман. Гродненский участок реки, протяженностью 230 км от ст.Неман до Друскеник. Участок находится в запущенном состоянии, выправительные работы на реке не производились свыше 6 лет, кроме того на участке имеются шесть взорванных высоководных железнодорожных и шоссейных мостов, которые перегородили реку в двух местах, где проход судов невозможен, а остальных 4-х мостах кое-как проходить возможно. В городе Гродно еще до сих пор существует низководная переправа – деревянный мост без разводной части, принадлежащий воинским частям. Этот мост перегородил Гродненский участок на две части и в связи с этим пристань лишена возможности [совершать] быстрые маневры флота при появлении груза на том или ином участке…

С начала навигации, т. е. с 5 апреля 1946 г. пристань должна была открыть две пассажирские линии: Гродно-Свентоянск-Гродно и Гродно-Лунно-Гродно. Поскольку на участке Гродно-Свентоянск препятствий нет, пассажирская линия была открыта 28 марта 1946 г., где был поставлен пароход «Карл Либкнехт». Вторая линия должна была быть открыта Гродно-Лунно, но в силу действующего препятствия в железнодорожном мосту и больших скоростей течения, при создавшемся искусственном водопаде пороге в Гродненском мосту высотою 62 см, как пароход «Пушкин», так и «Летувайте» сами себя не вытащили. И только с понижением горизонта, а следовательно, с уменьшением скорости течения, удалось 19 апреля протащить под Гродненские мосты пароход «Пушкин», который был немедленно использован под пассажироперевозки на линии Гродно-Лунно. К кон-

цу апреля месяца скорости течения уменьшились. Река вошла в берега и при помощи завозней, ручных лебедок и парохода «Пушкин» с 28 апреля по 2-е мая протащили и пароход «Летувайте», баржи 72, 93, 64 и карчекран 4. После чего пароход «Летувайте» согласно приказу № 5 от января месяца 1946 г. по Пароходству был поставлен на пассажирскую линию Гродно-Лунно, а «Пушкин» с 3-мя баржами отправлен вверх за Мосты Фабричные к складам грузов Гродненской сплавной конторы. Пароход «Зоя Космодемьянская» из 45 рейсов выполнил 12 и то с пассажирами. Пароход «Пушкин» из 112 не выполнил 3 из-за мелководья. Пароход «Летувайте» из 92 рейсов не выполнил 2 из-за мелководья. Пароход «Карл Либкнехт» из 140 рейсов не выполнил 3 из-за нападения и ограбления п. х. бандитами».

В этой докладной впервые появились некоторые сведения о истории судоходства в Гродно:

«Гродненский речной участок после воссоединения Западной Белоруссии с БССР входил в состав в то время организованного Пинского речного пароходства и только перед началом войны 1941–45 гг. был присоединен к Неманскому речному пароходству. Довоенные планы перевозок по участку складывались из работы Огинской системы каналов и Августовского канала. В данное время Огинская система не работает, а Августовский канал отошел в большей своей части (90 км) к Польше. Поэтому в связи с акваториальными изменениями и трудно определить довоенный уровень перевозок. До войны существовали на участке пристани: пристань Гродно с планооборотом отправлению на 1941 г. – 40 тыс. т. и 30 тыс. пассажиров, пристань Лунно – 5 тыс. т., 10 тыс. пассажиров, пристань Мосты – 30 тыс. т. и 10 тыс. пассажиров»[7].

В связи с приведенными выше сведениями попытаемся дать краткую характеристику судоходству 1920–30-х гг. В первой половине 20-х гг., по информации С. Астаповича, в Гродно числились пароходы «Jadwiga» (1913 г. Постройки) и винтовой «Emilia Pllater», который курсировал по Августовскому каналу и был приписан к Гродно. К середине 30-х гг. в Гродно были пароходы «Jagiełło»,

[7] Там же. Д. 9, л. 7, 9-11, 22-25.

который брал на борт до 300 пассажиров, уже известная нам «Jadwiga», вместимостью до 200 человек, «Dewajtys», курсировавший по маршруту Гродно-Друскеники, «Michał Ogiński», а также прогулочный пароход «Śmigły».



Прогулочный пароход «Śmigły». 1930-е гг.



Пароход «Michał Ogiński». 1930-е гг.

В черте города на Немане были две пароходные пристани. Одна, т. н. «пристань Шиманского» находилась возле автодорожного моста им. Пилсудского на левом берегу Немана. Отсюда отправлялись суда до Лунно и Мостов в 16 часов ежедневно, кроме субботы. Вторая – возле пристани Военного гребного клуба. Отсюда отправлялись прогулочные суда в выходные и праздничные дни в Пышки и Меловые горы через каждые два часа после полудня.

После вхождения Гродно в состав БССР в сентябре 1939 г. суда были переименованы. «Jagiełło» стал называться «Пушкин», пароход «Jadwiga», вероятнее всего получил имя «8 Марта», а «Śmigły», опять же предположительно, мог получить название «Боец».

На начало 1948 г. гродненское речное хозяйство состояло из 5 единиц самоходного речного флота и 8 единиц не самоходного флота (баржи и др.), грузовой площадки с деревянным навесом, пассажирского павильона и склада. Судоремонтные мастерские и затон с сухим доком ещё только восстанавливались.

В 1950 г. в Гродно появляются пароход «Мария Мельникайте», теплоходы «Олег Кошевой», «Толбухин», «Земнухов» и «Грейфенбергерис», а корпус парохода «Летувайте» было решено «установить как дебаркадер в Мостах, организовав в нем плавлавку»[8].

Особый интерес представляет историческая судьба парохода «Летувайте». Согласно С. Астаповичу, его первое название было «Русалка». Торгово-пассажирский колесный пароход был построен в Пинске в 1895 г. на заводе О’Бриен-де-Ласси. В 1897 г. на Немане он трижды в неделю совершал рейсы на линии Гродно-Мосты, владельцем был Ю. П. О’Бриен-де-Ласси. В 1903-1904 гг. на этой же линии Гродно-Мосты он совершал ежедневные рейсы кроме субботы с остановками в Песках, Свислочи, Лунно, Дубно и Зельвяны. В 1906-08 гг. пароход находился во владении у наследников А. В. Ашкенази (г. Гродно) работал на линии Гродно – Мосты. В 1913 г. на родном заводе в Пинске пароход прошел капитальный ремонт. Был изготовлен новый корпус с установкой старой паровой машины и котла. К началу Первой Мировой войны парохо-

---

[8] Там же. Д. 47, л.32 об., 96, 107; Там же. Оп. 2, д. 2, л. 33.

дом «Русалка» совместно владели О. О. Ашкенази, Г. А. Ашкенази, Е. А. Ашкенази и Ш. Н. Чернявский, у которых Военное ведомство мобилизовало судно для нужд Гродненской крепости.

В 1920 г. торгово-пассажирский буксирный пароход с новым именем «Lietuvaite» находится под флагом Литвы во владении А. Чижаса. В навигацию 1923 г. район плавания судна: Каунас-Вилькия-Бабтай-Алитус, порт приписки – Каунас. Накануне Второй Мировой войны пароход «Lietuvaite» принадлежал Ю. Микалаускасу из Юрбаркаса. И вот, к началу 50-х годов из парохода сделали плавлавку.



Пароход «Летувайте». 1930-е гг.

В 1953 г. пассажирский флот состоял из пароходов «Пушкин» и «Мельникайте», а буксирный из пяти теплоходов. 4 ноября 1954 г. было образовано Управление речного транспорта при Гродненском горисполкоме. В том же году пристани Гродно был выделен пассажирский теплоход «Минск» мощностью 150 л. с., рассчитанный на перевозку 145 пассажиров[9].

[9] Там же. Д. 25, л. 2.

Из отчета начальника пристани Гродно за 1955 г.: «Навигация началась 5 апреля, окончилась 26 ноября 1955 г. Флот расставлен в 2-х затонах: Гродно и Яблоново. Пристань в начале навигации 1955 г. была обеспечена двумя пассажирскими теплоходами общей пассажировместимостью 290 чел., мощностью 300 л. с. Благодаря замене парохода «Пушкин» (поставлен на консервацию из-за нерентабельности) теплоходом «Баку» пассажирский флот в навигацию 1955 г. сработал рентабельно. Для культурного обслуживания пассажиров необходимо в 1956 г. установить паровое отопление



Теплоход на воздушной подушке «Зарница». 1970-е гг.

на теплоходах «Минск» и «Баку», т. к. отсутствие такового весной и осенью резко сокращает пассажиропотоки»[10].

В 1957 г. были введены новые наименования и номера судов. Например, теплоходы «Баку» и «Минск» получили названия ПТ-0170 и ПТ-0171, старое название сохранил только «Пушкин».

В 1961 г. из 104,5 тыс. перевезенных за навигацию пассажиров на линию Гродно-Щербовичи приходится 65,5 тыс., остальные

[10] Там же. Д. 38, л.1, 3, 6.

38,9 тыс. перевезены на линии Гродно-Друскеники. В межрейсовые дни теплоходы выполняли прогулочные рейсы по заявкам школ и пионерских лагерей. Кроме того, в праздничные и выходные дни эти теплоходы перевозили отдыхающих из Гродно в Пышки и обратно. Практиковались экскурсионные рейсы на Каунасское море.

В 1962 г. получены теплоход-такси на подводных крыльях «Венера» и БТ-324[11]. За навигацию 1963 г. теплоход-такси «Венера» перевез 1985 пассажиров, работал в районе города на прогулочной линии Гродно-Пышки.

Сокращение пассажирских перевозок вынудило 3 сентября 1964 г. начальника Неманского эксплуатационного участка П. Рудакова написать вышестоящему руководству письмо в котором содержалась просьба о закрытии на осенне-зимний период пассажирской линии Гродно-Друскеники. Объяснялось это отсутствием рентабельности, в связи с развитием автобусного пассажирского транспорта.

5 апреля 1966 г. вышло Постановление исполкома Гродненского городского Совета депутатов трудящихся и бюро Гродненского горкома КПБ «О присвоении пассажирским судам имен Виктора Усова и Ольги Соломовой». Теплоход ПТ-0170 (бывший «Баку») получил имя «Виктора Усова» а ПТ-0171 (бывший «Минск») стал «Ольгой Соломовой»[12].

С августа 1974 г. из Гродно в Мосты стал курсировать новый быстроходный теплоход на воздушной подушке «Зарница» капитана П. Каленика[13]. С апреля 1976 г. теплоход на воздушной подушке «Зарница-5» капитана Ивана Щигринского обслуживал пассажиров маршрута Гродно-Друскеники, а «Зарница-4» капитана П. Каленика работал на линии Гродно-Мосты[14].

После распада СССР пассажирский флот ждала незавидная участь. «Зарница» превратилась в ресторан на водной глади пру-

---

[11] Там же. Д. 147, л. 22.

[12] Там же. Ф. 484, оп. 1, д. 366, л. 127.

[13] Гродненская правда. 17 августа 1974 г.

[14] Там же. 15 апреля 1976 г.

да по ул. Репина, где спустя некоторое время в результате пожара сгорела. Пассажирский теплоход «Виктор Усов» был продан в Литовскую Республику, и после капремонта на нем совершают прогулочные рейсы по Неману жители и гости литовского курортного города Друскининкай. Теплоходу дали другое имя.

Почему самый дешевый вид транспорта остался практически невостребованным? Главной причиной снижения грузовых перевозок по всему течению Немана стало сооружение Каунасского гидроузла, т.к. там не был построен судоходный шлюз. В начале 1990-х к этому добавилось установление границ между вновь образованными государствами. Есть еще одна причина местного значения. Город Мосты – центр деревообрабатывающей промышленности республики долгое время работал на местном сырье, и Неман был главным путем, по которому осуществлялась доставка древесины.



Теплоход «Ольга Соломова». 2009 г.

Но уже к середине 70-х годов запасы древесины практически исчерпались, ее пришлось завозить издалека. В последующие десятилетия жесткая конкуренция в деревообработке привела к сокращению объемов производства на Мостовском фандоке. А основным предметом грузоперевозок по Неману был как раз лес.

Если говорить о пассажирском сообщении, то однозначно, водный транспорт был вытеснен автомобильным с его скоростями и доступностью. Следующее – неразвитость туристической инфраструктуры, а точнее – ее отсутствие. По берегам Немана находится много исторических и архитектурных памятников, могущих быть объектами туристических посещений. То же самое можно сказать и об Августовском канале. Развитие туризма в регионе и создание соответствующей инфраструктуры может дать второе дыхание возрождению пассажирского водного транспорта в регионе.




Теплоход «Неман». 2009 г.

Сегодня ведется строительство Гродненской гидроэлектростанции выше Гродно и проектируется Немновская ГЭС, что рядом с Августовским каналом. Со строительством этих электростанций плотины могут перекрыть водный путь. Если на Немновской ГЭС предполагается строительство судоходного шлюза, то в проекте Гродненской станции его нет. Это представляет реальную угрозу судоходству на Немане и повлечёт полный упадок Гродненской речной пристани. Ведь и так сегодня большинство судов нуждаются в ремонте и ржавеют в затоне пристани. Проблематичным видится и водный туризм. При отсутствии судоходного шлюза на Немновской ГЭС на прогулочных теплоходах «Ольга Соломова» и «Неман» попасть в Августовский канал по Неману из Гродно будет невозможно.

Над этой грустной перспективой стоит подумать…

pawet.net

# Змест

А. Смалянчук. Прадмова ... 3

ХРАМ І ЛЮДЗІ ... 5

Першыя грамадскія слуханні
«Рэканструкцыя Каложы: за ці супраць?» ... 5
Дадатак ... 23

В. Глiннiк, М. Цэйтлiна. Загадкi гарадзенскiх фрэсак ... 37

Судьба Борисоглебской (Коложской) церкви в описаниях Михаила Кояловича и Епископа Иосифа (вторая половина XIX в.) ... 46

«РЭКАНСТРУКЦЫЯ» СУПРАЦЬ ГІСТОРЫІ ... 59

А. Вашкевіч. Страчаная Горадня,
або хроніка «рэканструкцыі» 2008-2011 гг. ... 59

А. Вашкевіч. І. Лапеха. Гродзенскі «Новы свет»:
перспектывы рэнавацыі і выкарыстання ... 65

Замест помніка супермаркет? ... 81

І. Лапеха. Зялёны свет Гродна ... 87

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ ... 96

І. Лапеха. Спроба лакалізацыі пабудоваў Гарадніцы і Кунстава
пры дапамозе планаў XVIII – першай паловы XX ст. ... 96

В. Саяпин. От «Пушкина» до «Зарницы». Неманское судоходство
в послевоенные годы ... 103

pawet.net

*Навуковае выданне*

# **Горад святога Губерта**

Краязнаўчы альманах

Выпуск V

Адказны за выпуск *Зміцер Колас*

Падпісана да друку 28.03.2011.
Фармат 60x84 1/16. Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 6,86. Ул.-выд. арк. 5,49.
Наклад 200 асобнікаў. Заказ б/н.

Выдавец і паліграфічнае выкананне
індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас
ЛИ № 02330/0552654 ад 14.01.2010.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220023, Мінск.

Пераплёт выраблены
ў ТАА «Інпрэдо»
Вул. Сямашка, 15-29/1, 220116, Мінск

pawet.net

pawet.net